# ГІСТОРЫЯ
# СТАРАЖЫТНАГА СВЕТУ

Вучэбны дапаможнік для 5 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

Пад рэдакцыяй доктара гістарычных навук,
прафесара *У. С. Кошалева*

У 2 частках

**Частка 1**

2-е выданне, перапрацаванае

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

Мінск «Народная асвета» 2014

Правообладатель Народная асвета

УДК 94(3)(075.3=161.3)
ББК 63.3(0)3я721
Г90

А ў т а р ы:
**У. С. Кошалеў** («Ад аўтараў», § 1—7, 9—14, 20, 22, 23, 28, 29, «Слоўнік гістарычных тэрмінаў і паняццяў», «Храналагічная табліца»);
**А. В. Перзашкевіч** (§ 8, 15, 16, 19, 21, 24, 25);
**А. А. Прохараў** (§ 17, 18, 26, 27);
**Н. В. Байдакова** (метадычныя матэрыялы)

Пераклад з рускай мовы *В. К. Раманцэвіч*

Р э ц э н з е н т ы:

кафедра ўсеагульнай гісторыі ўстановы адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна» (кандыдат гістарычных навук, дацэнт *Я. С. Разенблат*; кандыдат гістарычных навук, дацэнт *Л. В. Харычкава*); настаўнік гісторыі вышэйшай катэгорыі ўстановы адукацыі «Мінскі дзяржаўны абласны ліцэй» *П. М. Гламбоцкі*; настаўнік гісторыі і грамадазнаўства першай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Бараўлянская гімназія» *І. А. Азарынская*

Г90 **Гісторыя Старажытнага свету** : вучэб. дапаможнік для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання. У 2 ч. Ч. 1 / У. С. Кошалеў [і інш.] ; пад рэд. У. С. Кошалева ; пер. з рускай мовы В. К. Раманцэвіч. — Мінск : Народная асвета, 2014. — 127 с. : іл.
ISBN 978-985-03-2213-5.
Першае выданне выйшла ў 2009 годзе.

**УДК 94(3)(075.3=161.3)**
**ББК 63.3(0)3я721**

**ISBN 978-985-03-2213-5 (ч. 1)**
**ISBN 978-985-03-2212-8**

© Раманцэвіч В. К., пераклад на беларускую мову, 2014
© Афармленне. УП «Народная асвета», 2014

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

# АД АЎТАРАЎ

## Дарагія сябры!

Перад вамі вучэбны дапаможнік па гісторыі Старажытнага свету. Першая частка кнігі прысвечана гісторыі першабытнага грамадства, Старажытных Усходу і Амерыкі. Другая частка — гісторыі Старажытнай Грэцыі і Старажытнага Рыма.

Гэты вучэбны дапаможнік прызначаны для тых, хто толькі што ўступіў у хвалюючы, захапляючы свет гісторыі. Вам, юныя чытачы, неабходна будзе пазнаёміцца з гэтым светам, сустрэцца з дзіўнымі і незвычайнымі тварэннямі старажытных людзей. Прачытайце ўважліва змест гэтай кнігі. Ён пазнаёміць вас з назвамі раздзелаў і параграфаў.

Асноўная частка параграфа — гэта вучэбны тэкст. У ім утрымліваецца самая важная інфармацыя аб падзеях і фактах, якія вам трэба будзе вывучыць. Пытанні і заданні перад параграфам і пасля яго дапамогуць у вывучэнні цікавай і займальнай навукі гісторыі. Карты і ілюстрацыі даюць наглядна ўяўленне аб гістарычных падзеях. У вучэбным дапаможніку ёсць таксама слоўнік гістарычных тэрмінаў і паняццяў, храналагічная табліца і рэкамендуемы спіс літаратуры «Што чытаць». Аб тым, як працаваць над кнігай, вам раскажа «Памятка».

Пытанні, пазначаныя зорачкай (*), з’яўляюцца больш складанымі і разлічаны на тых, хто асабліва цікавіцца гісторыяй. Звяртайце ўвагу на шрыфтавыя вылучэнні.

Далучайцеся да працы гісторыка і ведайце, што стаць удзельнікам вывучаемых падзей вам лягчэй за ўсё разам з настаўнікам. Аўтарам далёка не абыякава, як вы будзеце гэта рабіць. Нам хочацца, каб вы з захапленнем абмяркоўвалі прачытанае. Выконваючы заданні і адказваючы на пытанні, выказвайце сваё меркаванне, а не проста завучвайце і запамінайце тэкст.

У добры шлях! Поспехаў вам, творчасці, узаемаразумення і беражлівых адносін да кнігі!



Правообладатель Народная асвета

# УВОДЗІНЫ

## § 1. Свет старажытнай гісторыі

**Успомніце.** Вядомыя вам навукі і як яны называюцца.

**1. Словы, якія заўсёды з намі.** «Гэтая падзея стане дасягненнем гісторыі», — кажуць людзі, калі адбылося нешта асабліва важнае.

«Ён абавязкова ўвойдзе ў гісторыю», — можна пачуць пра вядомага чалавека.

«Мы павінны атрымаць урокі з гісторыі», — кажа прамоўца на мітынгу.

«Калі вы хочаце зразумець, адкуль усё гэта ўзнікла, вам неабходна звярнуцца да гісторыі», — кажа настаўнік сваім вучням.

Слова *гісторыя* ў гэтых выказваннях мае розныя значэнні. Падумайце якія.

**2. Што такое гісторыя?** Слова «гісторыя» грэчаскага паходжання. Яно азначае «расказ аб падзеях», «даследаванне», «паведамленне аб мінулым». Думаць, што гісторыя — проста навука аб мінулым, не зусім правільна. Дакладней трэба сказаць: ***гісторыя*** — навука пра жыццё людзей у мінулым.

У наш час неабходна ведаць не толькі гісторыю сваёй Радзімы, але і гісторыю іншых краін і народаў свету, г. зн. ***сусветную гісторыю***.

**3. «Сляды жыцця», або Як мы даведваемся аб тым, што адбывалася ў старажытнасці.** Пачатковы этап гісторыі чалавецтва вучоныя назвалі ***Старажытным светам*** або ***старажытнасцю***.

Гісторыя Старажытнага свету дзеліцца на два вялікія перыяды. Першы, самы старажытны, перыяд расцягнуўся на многія тысячы і тысячы гадоў — ад з'яўлення продкаў чалавека да ўзнікнення гарадоў, дзяржаў і пісьменнасці. Гісторыкі назвалі гэты перыяд ***першабытным*** або ***першабытнасцю***.



Правообладатель Народная асвета

Другі перыяд ахоплівае больш чым чатыры тысячы гадоў — ад узнікнення першых дзяржаў да V стагоддзя нашай эры. З гісторыі гэтага перыяду мы даведаемся аб тым, як жылі і чым займаліся людзі, якім яны бачылі навакольны свет, як адбываліся тыя ці іншыя падзеі ў далёкім мінулым.



Археолагі на раскопках

Веды аб мінулым мы атрымліваем з ***гістарычных крыніц***. Людзі, якія жылі тады, працавалі на зямлі, будавалі гарады і крэпасці, узводзілі храмы. Падчас войнаў змагаліся з ворагамі. І, вядома ж, пасля сябе пакідалі «сляды жыцця». Гэта астанкі іх саміх і жывёл, якіх яны прыручылі. Гэта прылады працы, чарапкі посуду, зброя, месцы, дзе некалі гарэлі вогнішчы. Гэта рэшткі жылля, засыпаныя зямлёй і пяском, і многае іншае. Для вучоных такія «сляды» з'яўляюцца важнай крыніцай ведаў аб жыцці людзей у мінулым, асабліва да вынаходніцтва пісьменнасці.

Знайсці прадметы, якія захаваліся са старажытнейшых часоў да нашых дзён, вельмі цяжка. Іх пошукамі займаюцца *вучоныя-археолагі*. Яны робяць раскопкі, знаходзяць і вывучаюць знойдзеныя рэчы і прадметы, якія могуць многае расказаць аб далёкім мінулым. Навука, якая вывучае жыццё людзей па *рэчавых крыніцах*, называецца ***археало́гіяй***.



Правообладатель Народная асвета



Піктаграма

Акрамя рэчаў, захаваліся таксама старажытныя надпісы. Іх вучоныя называюць ***піктагра́мамі***. Гэта звязаныя паміж сабой малюнкі — своеасаблівыя «паведамленні ў малюнках». Яны былі зроблены на гліняных таблічках, камянях, апрацаванай шкуры і іншым матэрыяле. Старажытныя запісы цяжка расшыфраваць. Але там, дзе гэта ўдалося, можна знайсці цікавейшыя звесткі аб падзеях, правіцелях і паўсядзённым жыцці людзей. Вучоныя назвалі такія запісы *пісьмовымі крыніцамі*.

Важнай крыніцай ведаў аб далёкім мінулым з'яўляюцца ***мі́фы*** — паданні, паведамленні аб падзеях, якія некалі адбываліся. Міфы перадаваліся вусна з пакалення ў пакаленне. У іх адлюстраваліся ўяўленні старажытных людзей аб прыродзе і грамадстве, аб паходжанні чалавека і Сусвету (Космасу), пра багоў і герояў.

Да гэтага часу на Зямлі сустракаюцца першабытныя плямёны. Існуюць і народы, якія захавалі звычаі і традыцыі сваіх продкаў. Іх вывучэннем займаецца навука ***этнагра́фія***. Яна дапамагае нам лепш уявіць, як жылі людзі ў старажытнасці.

Яшчэ адна навука аб чалавеку — ***антрапало́гія*** — вывучае і аднаўляе фізічнае аблічча людзей. Дзякуючы людскім астанкам, якія захаваліся, а таксама іх старажытным выявам мы даведваемся, як выглядалі нашы продкі.

**1.** Як называецца навука, якая вывучае жыццё людзей у мінулым?
**2.** Як вы разумееце, што такое крыніца? Назавіце асноўныя гістарычныя крыніцы.
**3.** Раскажыце аб навуках, якія дапамагаюць вывучаць гісторыю. Растлумачце, як знаходкі археолагаў аказаліся пад зямлёй.
**4.** Як вы лічыце, ці трэба сучаснаму чалавеку вывучаць гісторыю Старажытнага свету?



Правообладатель Народная асвета

## § 2. Лічэнне гадоў у гісторыі

**Успомніце.** Чаму ў паўсядзённым жыцці мы вядзём лічэнне дзён, тыдняў, месяцаў, гадоў па календары?

**1. Узнікненне летазлічэння.** Яшчэ ў глыбокай старажытнасці людзі заўважылі, што на змену дажджліваму сезону прыходзіць сухі, затым зноў пачынаюць ліць дажджы і ўсё паўтараецца. Чалавеку вельмі важна было ведаць працягласць кожнага сезону. Бо ад гэтага ў многім залежала яго жыццё.

З узнікненнем земляробства праз роўныя прамежкі часу трэба было ўбіраць ураджай. Земляробы паступова навучыліся лічыць час ад аднаго збору ўраджаю да другога, ад аднаго лета да другога. Так узнікла лічэнне па гадах. З цягам часу з'явіліся пэўныя спосабы лічэння дзён у годзе, або першыя ***календары***.

**2. Календары.** Стварэнне першых календароў звязана са з'яўленнем першых дзяржаў. Усе календары былі заснаваны на назіраннях за прыродай і нябеснымі свяцiламі — Сонцам і Месяцам. Але лічэнне часу вялі, як правіла, ад якой-небудзь памятнай падзеі. У кожнай краіне былі свае падзеі, а значыць, і сваё лічэнне. У Егіпце лічылі гады ад пачатку праўлення новага фараона (правіцеля). Рымляне лічылі першым годам свайго летазлічэння легендарнае заснаванне горада Рыма — 753-і год да нашай эры. Пад уплывам хрысціянскай царквы ў Еўропе пачалі весці лічэнне часу ад мяркуемай даты нараджэння Ісуса Хрыста. І народы многіх краін свету прынялі менавіта гэта, звыклае для нас летазлічэнне. Час з першага года ад нараджэння Хрыста і да нашых дзён прынята называць ***нашай эрай*** (скарочана — н. э.).

Вы ведаеце, што 100 гадоў — гэта век, стагоддзе. Тысячагоддзе складаецца з дзесяці вякоў. Значыць, ад пачатку нашай эры прайшло крыху больш чым два тысячагоддзі. Як жа быць з падзеямі, якія адбыліся нашмат раней? Адказ просты: усе яны былі ***да нашай эры*** (скарочана — да н. э.).



Правообладатель Народная асвета

Гістарычныя падзеі заўсёды выстройваюцца ў пэўнай часавай паслядоўнасці. Лічэнне гадоў у гісторыі вядзецца па гадах, дзесяцігоддзях, вяках, тысячагоддзях, эрах. Паслядоўнасць гістарычных падзей утварае ***храналогію***. Слова «храналогія» ў перакладзе са старагрэчаскага азначае «навука пра час».




Стужка часу

**3. Стужка часу.** Для разумення лічэння часу ў гісторыі важна правільна карыстацца стужкай часу. Вертыкальная раздзяляльная рыса дзеліць яе на дзве часткі. Злева размешчаны гады да нашай эры, справа — гады нашай эры. У абодвух выпадках (і ўлева, і ўправа) час лічыцца па ўзрастаючай. Чым большы лік года злева ад раздзяляльнай рысы (да нашай эры), тым раней адбылася падзея. Чым большы лік года ад раздзяляльнай рысы (наша эра), тым пазней адбылася падзея. Значыць, I век да н. э. пачаўся ў 100 годзе да н. э. і закончыўся ў 1 годзе да н. э. І, наадварот, I век н. э. пачаўся ў 1 годзе н. э. і закончыўся ў 100 годзе н. э.

*Такім чынам, увесь час у гісторыі дзеліцца на дзве эры: час, які працякаў да нашай эры, і час нашай эры, які доўжыцца па сённяшні дзень. Год нараджэння Ісуса Хрыста лічыцца канцом старой і пачаткам новай эры ў гісторыі.*

1. Растлумачце, для чаго патрэбна лічэнне часу.
2. Колькі гадоў складае адзін век? Колькі гадоў складае адно тысячагоддзе?
3. Як вялі лічэнне першабытныя людзі?



Правообладатель Народная асвета

4. Чаму ў старажытных царствах людзі сталі займацца складаннем календара? Чым сонечны каляндар адрозніваецца ад месячнага календара?
5. Якое лічэнне часу існуе ў нашы дні?
6. Які пункт адліку выбраны для пачатку нашай эры?
7. Як называецца абазначэнне часу якой-небудзь падзеі?

## Практычная работа

**1.** Разгледзьце стужку часу ў вучэбным дапаможніку і намалюйце яе ў сшытку. Абазначце на стужцы часу вертыкальнай раздзяляльнай рысай пункт адліку (нараджэнне Ісуса Хрыста).

**2.** Адлажыце на стужцы часу па правы бок ад раздзяляльнай вертыкальнай рысы (наша эра) 20 невялікіх адрэзкаў, кожны з якіх роўны аднаму веку.

**3.** Адзначце на стужцы часу год заснавання роднага горада, год свайго нараджэння. Якая падзея адбылася раней? Наколькі раней?

**4.** Адлажыце на стужцы часу па левы бок ад раздзяляльнай вертыкальнай рысы (да н. э.) два або некалькі адрэзкаў, кожны з якіх роўны аднаму веку, і адкажыце на пытанні:

а) Які год быў перад 100 годам да н. э., да якога веку ён адносіцца?

б) Які год ішоў перад 50 годам да н. э., які год быў наступным пасля яго?

в) Які год пачынаўся пасля 10 года да н. э., да якога веку ён адносіцца?

**5.** Начарціце стужку часу, адлажыце на ёй 2 тысячагоддзі н. э. і 10 тысячагоддзяў да н. э. Рашыце задачы на летазлічэнне:

а) палічыце, у якім тысячагоддзі да н. э. узніклі земляробства і жывёлагадоўля, калі вядома, што пачатак гэтых заняткаў налічвае каля 10—12 тысяч гадоў;

б) палічыце, колькі тысячагоддзяў назад узніклі першыя гарады-дзяржавы ў Пярэдняй Азіі, калі вядома, што яны ўзніклі ў чацвёртым тысячагоддзі да н. э.

**6.** Прыдумайце і рашыце свае задачы, звязаныя з вядомымі вам падзеямі з мінулага і сучаснага.

Правообладатель Народная асвета

## § 3. Старажытныя людзі

**Успомніце.** 1. Значэнне слова «гісторыя». 2. Назву ўсіх мацерыкоў.

Не проста адказаць на пытанні, дзе і калі з'явіліся першыя людзі. Вучоныя спрачаюцца аб гэтым да нашага часу. Большасць лічыць, што першыя людзі з'явіліся ў Афрыцы. Менавіта там знойдзены астанкі магчымых продкаў чалавека. Ім больш чым 3 мільёны гадоў. Але хто ведае, магчыма, будуць і іншыя адкрыцці, якія зменяць нашы ўяўленні аб з'яўленні першых людзей.

**1. Паходжанне чалавека.** Да гэтага часу няма адзінага меркавання аб паходжанні чалавека на Зямлі. Рэлігія і навука даюць на гэтае пытанне розныя адказы. Рэлігія вучыць, што Бог стварыў Зямлю, засяліўшы яе рыбамі, птушкамі і жывёламі. А затым па сваім падабенстве стварыў чалавека. Вучоныя прытрымліваюцца другога пункту погляду. Яны лічаць, што самым далёкім продкам сучаснага чалавека з'ўляецца *чалавекападобная малпа*, якая жыла больш чым 3 мільёны гадоў назад. Цяжка ўявіць, як даўно гэта было. Больш чым 2 мільёны гадоў назад на змену ёй прыйшоў *«чалавек умелы»*. Мозг гэтай істоты быў крыху большы, чым мозг чалавекападобнай малпы. «Чалавек умелы» думаў не толькі аб неадкладным здабыванні ежы, але і аб тым, як падрыхтаваць для гэтага неабходныя інструменты. Побач з касцьмі «чалавека ўмелага» вучоныя знаходзяць абколатыя камяні — першыя ***прылáды прáцы***.


Старажытнейшыя прылады працы

Яшчэ большым быў мозг у *«чалавека прамаходзячага»*, які паходзіў ад «чалавека ўмелага» каля 1,5 млн гадоў назад. Пе-



Правообладатель Народная асвета

рамяшчэнне на дзвюх нагах садзейнічала таму, што рукі станавіліся больш умелымі, а кісці і пальцы — рухомымі і гібкімі. Такі чалавек ужо мог рабіць розныя каменныя прылады працы. Праца аб'ядноўвала людзей. Зносіны і сумесная праца садзейнічалі развіццю мыслення і мовы чалавека. Верагодна, гэтыя «старажытныя людзі» маглі перадаваць голасам страх, задавальненне, сігнал небяспекі і нават больш складаныя паведамленні.



Здабыча старажытных людзей

**2. Першыя прылады працы і заняткі старажытных людзей.** Першабытны чалавек здабываў сабе ежу, займаўся збіральніцтвам і паляваннем. Ён карыстаўся толькі тым, што давала прырода: выкопваў прыдатныя для ежы карані і клубні раслін, збіраў лічынкі насякомых, плады з дрэў, шукаў яйкі птушак і чарапах, паляваў на жывёл. Па-іншаму гэта называецца *прысвойваючая гаспадарка*.

Першымі прыладамі, якія навучыўся рабіць чалавек, былі дубіна, завостраны камень, палка-капалка. Уменне вырабляць прылады працы адрознівала старажытных людзей ад жывёл.

Старажытныя людзі жылі невялікімі групамі. Каб выжыць, яны сумесна здабывалі ежу і абараняліся ад звяроў. Такія першапачатковыя калектывы людзей вучоныя назвалі *першабытным чалавечым статкам*. Першабытны статак не мог быць вялікім. Ён налічваў, як правіла, да 20 чалавек. Узначальваў статак важак, які вылучыўся дзякуючы сваім асабістым якасцям.

**3. Неандэртальцы.** Каля **300 тысяч гадоў назад** з'явіўся новы від істот, які стаў хутка рассяляцца па Зямлі. Вучоныя назвалі іх *неандэртальцамі*, паколькі косці гэтых людзей упершыню былі выяўлены ў даліне Неандэрталь (Германія). Сляды іх стаянак знойдзены таксама на берагах Дняпра.



Правообладатель Народная асвета


Неандэрталец. *Рэканструкцыя*

Неандэртальцы былі цалкам прамаходзячымі, жылі ў пячорах і паўзямлянках. У іх жыллі ўжо меліся ачагі для распальвання вогнішча і прыгатавання ежы. Неандэртальцы рабілі прылады працы не толькі з каменю, але і з касцей. Акрамя ручнога рубіла, яны выкарыстоўвалі каменныя скрабкі і нажы, з дапамогай якіх разбіралі тушы жывёл. Шкуры звяроў служылі зручным і цёплым адзеннем.

Неандэртальцы хавалі памерлых у ямах-магілах. Разам з выкапнёвымі астанкамі гэтых людзей археолагі знаходзяць косці жывёл і прылады працы. Гэта гаворыць аб тым, што неандэртальцы спраўлялі пахавальныя абрады і ў іх упершыню з'явіліся ўяўленні аб замагільным жыцці.

*Такім чынам, у гісторыі старажытных людзей важным этапам было станаўленне прамой паходкі і развіццё чалавечага мозга. Узнікненне маўлення і мыслення, уменне вырабляць прылады працы сталі важнейшымі адрозненнямі самага старажытнага чалавека ад жывёл.*

1. Якія істоты лічацца самымі далёкімі продкамі сучаснага чалавека? У чым было іх галоўнае адрозненне ад жывёл?
2. Раскажыце аб старажытнейшых спосабах здабывання ежы.
3. Растлумачце, чаму самыя старажытныя людзі жылі невялікімі групамі. Як такія калектывы людзей назвалі вучоныя?
4. Пакажыце на карце свету або знайдзіце на глобусе Еўропу, Азію, Афрыку. Абазначце на контурнай карце мацярык, на якім, па меркаванні большасці вучоных, з'явіліся першыя людзі.
5. Калі з'явіліся неандэртальцы?
6. Як вы думаеце, што дазволіла неандэртальцам хутка рассяліцца па нашай планеце?
7*. Ці згодны вы са сцвярджэннем, што першабытным людзям было цяжка выжыць на Зямлі? Сваё меркаванне растлумачце.



Правообладатель Народная асвета

### Для дапытлівых

Еўрапейскія падарожнікі XVIII—XX стагоддзяў апісалі лад жыцця плямён, з якімі ім прыходзілася сустракацца. Іх побыт і норавы былі вельмі падобныя на жыццё першабытных людзей.

**Нямецкі вучоны XX стагоддзя аб жыцці народа кубу (востраў Суматра)**

Часцей за ўсё кубу жывуць вандроўным жыццём і бесперастанна вандруюць па сваіх мясцінах у пошуках спелых лясных пладоў. Там, дзе застае іх вечар, яны сплятаюць з галінак дрэва просты парасон, які ахоўвае іх ад непагадзі.

Увесь свой час і сілы яны трацяць на пошукі ежы. Харчуюцца фруктамі, ягадамі, карэннем і клубнямі, якія выкопваюць вострымі палкамі. З задавальненнем ядуць яшчарак, жаб, вусеняў і лічынак жукоў...

Здараецца ім разбураць птушыныя гнёзды з кволымі птушанятамі, лавіць у ручаях рыбу, ракаў, крабаў, знаходзіць тлустых смаўжоў і ракавіны. Паляванне і рыбная лоўля іграюць у побыце кубу невялікую ролю, паколькі ў іх няма неабходных прылад.

Кубу яшчэ не прыйшлі да думкі, што можна пакідаць у запас некалькі штук бананаў або клубняў. Яны збіралі роўна столькі, каб наталіць голад, і з'ядалі без астатку тое, што збіралі.

**Пытанні да дакумента.** Які лад жыцця вёў народ кубу? Дзякуючы якому занятку гэты народ існаваў?

## § 4. Людзі каменнага веку

**Успомніце.** Якім спосабам старажытнейшыя людзі здабывалі сабе ежу?

**1. Вынаходніцтвы і адкрыцці.** Пачатак працоўнай дзейнасці чалавецтва быў пакладзены вельмі даўно. Дагістарычным людзям спатрэбіліся мільёны гадоў, каб удасканаліць прылады працы і зброю для палявання. Спачатку старажытныя людзі навучыліся выраб-



Правообладатель Народная асвета

ляць *палкі-капалкі, дубіны*, затым завостраныя камяні — *ручныя рубілы*.

Асабліва аблягчала жыццё першабытнага чалавека рубіла, якое ўяўляла сабой камень акруглай формы, апрацаваны сколамі з двух бакоў. У аснове, там, дзе ручка, ён патоўшчаны і закруглены, а ўдарны канец — завостраны. Рубіла можна было трымаць у руцэ або прывязваць да ручкі. З дапамогай рубіла можна было раздрабляць расліную ежу, ачышчаць кару, раздрабляць арэхі, узрыляць зямлю ў пошуках карняплодаў, забіваць дробных жывёл, а таксама разбіраць тушу, разрэзваць шкуру, раздзяляць мяса на кавалкі. Ручное рубіла было першым вялікім вынаходніцтвам старажытнага чалавека.

З цягам часу людзі авалодалі (акрамя каменю і дрэва) новымі матэрыяламі для вырабу прылад працы — косцю і рогам. Гэта дазволіла ўдасканаліць і спрасціць выраб ужо існуючых прылад працы і вынайсці новыя — *гарпуны, іголкі* і інш. З іх дапамогай людзі лавілі рыбу, апрацоўвалі шкуры забітых жывёл, з якіх выраблялі адзенне.

Каб уберагчыся ад непагадзі і зубоў драпежніка, першабытныя людзі павінны былі пастаянна клапаціцца аб даху над галавой. Іх жыллём станавіліся пячоры. Але яны былі не ўсюды, і тады людзі будавалі зямлянкі або шалашы з жэрдак, касцей і шкур жывёл.



Касцяныя гарпуны

Першабытныя людзі павінны былі неяк мець зносіны адзін з другім. Яны карысталіся толькі гукамі голасу, а таксама знакамі, жэстамі. На першых парах гукі і жэсты былі яшчэ амаль зусім малпавымі. Тады яшчэ гукавая мова была самай простай. Толькі праз сотні тысячагоддзяў яна змагла ператварыцца ў членараздзельнае маўленне.



Правообладатель Народная асвета



Заняткі людзей каменнага веку

**2. Утаймаванне агню.** Звычайна ў жыллі гарэла вогнішча. Яно саргравала халоднай ноччу і ахоўвала ад драпежнікаў, на ім гатавалі ежу. Мяса, спечанае на вуголлі, было смачнейшым і карыснейшым, чым сырое. Выкарыстанне мясной ежы стала важным этапам у развіцці чалавека. Яго арганізм цяпер атрымліваў больш энергіі. Умацоўваўся шкілет чалавека, павялічвалася яго фізічная сіла, развіваўся і ўдасканальваўся мозг.

Доўгі час людзі не ўмелі самастойна здабываць агонь. Каб раскласці вогнішча, прыходзілася збіраць тлеючае вуголле з лясных пажарышчаў. Таму днём і ноччу яны стараліся падтрымліваць вогнішчы на сваіх стаянках. Страшнае бедства спасцігала людзей, калі гэтая крыніца святла і цяпла згасала.

Прайшлі многія тысячы гадоў, і першабытны чалавек сам навучыўся здабываць агонь. Для гэтага ён высякаў іскры з крэменю і падпальваў імі сухую траву. Пакарыўшы агонь, людзі рэгулярна выкарыстоўвалі яго для сваіх патрэб.

Такім чынам, працоўная дзейнасць развівала чалавека, а авалоданне агнём садзейнічала яго выдзяленню са свету жывёл. Усё гэта



Правообладатель Народная асвета


Загоннае паляванне

адбывалася ў ***каме́нным ве́ку***, які назвалі так таму, што галоўныя прылады працы ў гэты час выраблялiся з каменю. Доўжыўся каменны век больш чым 2 мільёны гадоў.

**3. Пахаладанне.** Каля 100 тысяч гадоў назад на Зямлі наступіла рэзкае пахаладанне. Зімы сталі працяглымі і марознымі. Паўночная частка Еўропы, Азіі і Амерыкі пакрылася ледавіком — вялікай, шматмятровай тоўшчай лёду. Цеплалюбівыя жывёлы загінулі або сышлі далёка на поўдзень. Але чалавек выжыў, паколькі да гэтага часу ён авалодаў агнём, навучыўся шыць адзенне і будаваць жыллё.

У халодным і суровым клімаце важнейшым заняткам для людзей стала *паляванне на дзікіх жывёл*. Паляванне згуртоўвала людзей, давала ім мясную ежу і цёплае адзенне. Людзі палявалі на дзікіх коней, аленяў і бізонаў, пячорных мядзведзяў. Асабліва жаданай здабычай быў мамант — вялікі слон, пакрыты поўсцю, з моцна выгнутымі біўнямі. Першабытныя паляўнічыя прыдумалі загоннае паляванне. З дапамогай агню яны заганялі буйных і цяжкіх жывёл у ямы-пасткі або ў балота, яр, любое другое месца, адкуль ім было цяжка выбрацца. Асноўнай паляўнічай зброяй было драўлянае кап’ё. З цягам часу яго ўдасканальвалі, прывязаўшы да дрэўка востры каменны наканечнік. Часта ў сутычках са звярамі людзі гінулі самі або паміралі ад голаду ў доўгіх і бескарысных пошуках здабычы.

*Такім чынам, каб выжыць, уратавацца і пакінуць пасля сябе патомства, першабытны чалавек пераадолеў вялікія цяжкасці. Верагодна, яго ўратавала тое, што ён не проста прыстасаваўся да сваёй навакольнай прыроды, а, насупраць, узяўся яе актыўна асвойваць.*



Правообладатель Народная асвета

1. Як з цягам часу змяніліся вынаходніцтвы і адкрыцці старажытных людзей? (Намалюйце, захоўваючы паслядоўнасць узнікнення, прылады працы людзей каменнага веку.)
2. Колькі часу доўжыўся каменны век? Чаму яго так назвалі?
3. Якое значэнне ў жыцці першабытнага чалавека мела авалоданне маўленнем і ўтаймаванне агню?
4. Калі на Зямлі наступіла рэзкае пахаладанне?
5. Чаму чалавеку ўдалося выжыць у халодным і суровым клімаце?
6*. Складзіце паведамленне паводле плану: а) халодная зіма; б) пачатак голаду; в) высочванне звера; г) вялікая і моцная жывёла; д) агонь дапамог людзям; е) звер загнаны ў яму-пастку; ж) свята паляўнічых.
7*. Як вы думаеце, чаму старажытныя людзі адносіліся да агню, як да жывой істоты?

## Для дапытлівых

**Рускі вучоны-падарожнік XIX стагоддзя М. М. Міклуха-Маклай пра жыццё і побыт папуасаў Новай Гвінеі**

Абрусам служыла нам бананавае лісце, посудам, г. зн. талеркамі і кубкамі, — шкарлупіны какосавых арэхаў, відэльцамі — абточаныя бамбукавыя палачкі і завостраныя косці, а многія пускалі ў ход свае грабяні (на папуаскай мове відэлец і грэбень — сінонімы); лыжкамі служылі яўры (ракавіны).

**Пытанні да дакумента.** Якую ролю ў жыцці папуасаў Новай Гвінеі іграла навакольная прырода? Чаму?

# § 5. Першыя крокі чалавека сучаснага віду

**Успомніце.** Што садзейнічала развіццю мыслення і маўлення ў старажытных людзей?

Больш чым 40 тысяч гадоў назад з'явіўся від людзей, названы ***«чалавекам разумным»***. Вучоныя называюць яго таксама *краманьёнскім чалавекам*, па назве пячоры Кра-Маньён у Францыі, у якой упершыню былі знойдзены астанкі гэтага чалавека. Усе сучасныя жыхары нашай планеты з'яўляюцца патомкамі краманьёнцаў.



Правообладатель Народная асвета

**1. З'яўленне «чалавека разумнага».** Паводле знешняга выгляду «чалавек разумны» быў вельмі падобным на сваіх патомкаў — сучасных нам людзей. Аб'ём мозга ў «чалавека разумнага» быў у два разы большы, чым у «чалавека ўмелага». Ростам ён быў вышэйшы. У яго была прамая постаць. «Людзі разумныя» валодалі звязным маўленнем.

Радзімай «чалавека разумнага» лічыцца Афрыка. Удалося вызначыць, што жыллё гэтых людзей — пячоры, шалашы і паўзямлянкі — мелі ачагі і ямы-сховішчы.

Са з'ўленнем «чалавека разумнага» хутчэй, чым раней, удасканальваліся прылады працы. Людзі навучыліся іх рабіць не толькі з каменю, але і з косці. З яе выраблялі шылы, іголкі, якія забяспечвалі выраб адзення, выточвалі рыбалоўныя кручкі і гарпуны.

Людзі каменнага веку ахвотней сяліліся на роўнай або слаба перасечанай мясцовасці бліжэй да вады. У той час жыллё было адкрытага тыпу, чалавек заходзіў у пячоры толькі ў перыяды рэзкага пахаладання. Клімат у значнай ступені ўплываў на лад жыцця і тып жылля старажытнага чалавека. На адкрытай мясцовасці без прыродных скальных навесаў людзі будавалі паўзямлянкі або зямлянкі, г. зн. жыллё з цвёрдым, часта купалападобным каркасам, заглыбленае ў зямлю. У цёплую пару года найбольш частым жыллём быў шалаш. Лёгкія прыстанішчы і шалашы старажытныя людзі будавалі таксама ў пячорах. Яны звычайна не карысталіся ўсёй пячорай, а з дапамогай перагародак стваралі сабе асабістае жыллё.



Выраб каменных прылад працы

Знойдзены пахаванні «чалавека разумнага». У іх разам са шкілетамі людзей захаваліся каменныя рубілы і нажы для завострывання дрэва і рэзкі мяса, касцяныя кручкі для лоўлі рыбы і некаторыя іншыя прылады.

Чалавек разумны» аказаўся найбольш прыстасаваным да навакольнай



Правообладатель Народная асвета

прыроды. Ён навучыўся не толькі выжываць у ёй, але і выкарыстоўваць у сваіх мэтах. З цягам часу «чалавек разумны» змог адусюль выціснуць сваіх папярэднікаў і рассяліцца па планеце.

**2. Родавая абшчына.** Краманьёнцы жылі ***родавымі абшчынамі***. У адрозненне ад першабытнага статку родавая абшчына — больш устойлівы калектыў. Усе людзі, якія яе састаўлялі, былі блізкімі і дальнімі родзічамі — *сваякамі*. Яны лічылі, што паходзяць ад аднаго продка — чалавека, жывёлы або расліны. Таму род насіў імя свайго першапродка — арла, мядзведзя, маманта і г. д.

Мужчыны разам палявалі, лавілі рыбу, выраблялі зброю і прылады працы. Вучоныя-археолагі налічылі звыш ста відаў каменных прылад у краманьёнцаў.

«Жанчыны займаліся збіральніцтвам, шылі адзенне са шкур, гатавалі ежу, гадавалі дзяцей. Жанчына-маці карысталася вялікай



Паўсядзённае жыццё родавай абшчыны. *Сучасны малюнак*



Правообладатель Народная асвета

павагай. Старажытныя людзі лічылі жанчыну прамаці і захавальніцай дамашняга ачагу.

У кожным родзе налічвалася па некалькі дзясяткаў чалавек. У іх былі агульнымі жыллё, запасы ежы і дамашні ачаг. Абшчынай кіраваў адзін з членаў роду — *важак (кіраўнік, старэйшына)*. Гэта быў самы вопытны і паважаны суродзіч, які добра ведаў звычкі жывёл, уласцівасці раслін і правілы паводзін, якія дапамагалі выжыць у тых умовах. Старэйшына сачыў за справядлівым размеркаваннем прадуктаў, адзення і месцаў у жыллі.

Выхаванне дзяцей у родавай абшчыне было суровым. Дзеці павінны былі ведаць звычаі роду і дапамагаць дарослым. Калі хлопчыкі падрасталі, яны праходзілі праз спецыяльныя выпрабаванні. Пасля гэтага яны лічыліся дарослымі мужчынамі-паляўнічымі. Самым складаным і цяжкім было маўчаць пад градам удараў або правесці самому некалькі дзён і начэй у глухім лесе. І толькі той, хто вытрымліваў гэтыя выпрабаванні, станавіўся раўнапраўным, дарослым мужчынам роду.

Дзяўчынкі таксама праходзілі праз выпрабаванні, праўда, не такія суровыя. Вопытныя жанчыны навучалі тых, хто падлягае выпрабаванням, вядзенню дамашняй гаспадаркі і правілам паводзін у калектыве.

*Такім чынам, род або родавая абшчына, — гэта група сваякоў, якія паходзілі ад агульнага продка, насілі агульнае родавае імя і супольна карысталіся вынікамі сваёй працы. Толькі разам і дзякуючы сумеснай працы людзі маглі выжыць ва ўмовах халоднага і суровага клімату.*

**1.** Калі і дзе з'явіўся «чалавек разумны»? Начарціце ў сшытку лінію часу і адзначце на ёй час з'яўлення «чалавека разумнага». Пакажыце на гістарычнай карце месцазнаходжанне астанкаў гэтага чалавека.
**2.** Каго называюць краманьёнцам?
**3.** Што такое родавая абшчына? Чым яна адрознівалася ад першабытнага статку?
**4.** Растлумачце, хто такія суродзічы.
**5.** Падумайце, на чым у абшчыне была заснавана ўлада старэйшыны.
**6.** Якія абавязкі выконвалі суродзічы? Адкажыце, паставіўшы крыжык у адпаведных графах табліцы (табліцу начарціце ў сшытку).



Правообладатель Народная асвета

| Абавязкі | Мужчыны | Жанчыны | Дзеці |
|---|---|---|---|
| Палююць на дзікіх звяроў | | | |
| Збіраюць фрукты, карэнне | | | |
| Клапоцяцца аб ачагу | | | |
| Робяць пасткі, ямы-пасткі | | | |
| Гатуюць ежу | | | |
| Вырабляюць зброю і прылады працы | | | |
| Шыюць адзенне | | | |

Чые абавязкі, на ваш погляд, істотна не змяніліся?

**7*.** Як вы лічыце, якое пакаранне за здзейснены ўчынак у родавай абшчыне было самым страшным?

## § 6. Узнікненне мастацтва і рэлігіі

**Успомніце.** Якое жыллё першабытнага чалавека было найбольш трывалым і надзейным?

**1. Узнікненне мастацтва.** Самыя старажытныя тварэнні *выяўленчага мастацтва* датуюцца саракавым тысячагоддзем да нашай эры. Першабытныя мастакі выяўлялі перш за ўсё жывёл, на якіх палявалі. На скалах і сценах пячор захаваліся малюнкі, якія выконваліся драўняным вугалем або фарбамі, зробленымі з прыродных рэчываў. У адной з пячор на тэрыторыі сучаснай Францыі была знойдзена цэлая «карцінная галерэя» — 40 дзікіх коней, 23 маманты, 17 аленяў. Малюнкі зроблены *вохрай* (фарба жоўтага або чырвонага колеру) і іншымі фарбамі. Сакрэт не раскрыты да гэтага часу.

Людзі каменнага веку выкарыстоўвалі тры асноўныя колеры фарбы: белы, чорны і чырвоны. Два апошнія прымяняліся асабліва



Правообладатель Народная асвета



Наскальны малюнак у пячоры

часта. Малюнкі першабытных людзей былі першым праяўленнем творчых здольнасцей чалавека. Так узнік *жывапіс* — стварэнне мастацкіх вобразаў фарбамі.

У гэты ж час зараджалася і *скульптура*. Старажытныя майстры вырэзвалі фігуры людзей і жывёл з дрэва, касцей аленя або біўняў маманта. Шырокае распаўсюджанне атрымалі маленькія скульптурныя фігуркі, або статуэткі, жанчыны. Гэта звязана, відаць, з пакланеннем — ***ку́льтам*** багіні-маці. Падобныя статуэткі знойдзены археолагамі ў многіх краінах свету.

Асобным відам першабытнага мастацтва з'яўляўся *арнамент, узор*, якім пакрываліся вырабы з косці, а таксама каменны і гліняны посуд.

Такім чынам, першабытныя мастакі былі заснавальнікамі амаль усіх відаў выяўленчага мастацтва: *графікі* (мастацтва выяўлення прадметаў лініямі і штрыхамі, без фарбаў), жывапісу, скульптуры, дэкаратыўнага мастацтва.

**2. З'яўленне рэлігіі.** «Чалавек разумны» быў бездапаможны перад таямнічымі і грознымі з'явамі прыроды. Усход і заход сонца, маланку і гром, раптоўна наляцеўшы ўраган або паводку ён не мог растлумачыць вядомымі для нас прычынамі. Людзі лічылі, што нейкія звышнатуральныя істоты прыводзяць у рух навакольны свет. Гэтыя



Правообладатель Народная асвета

істоты, або сілы, былі названы *духамі*, а самыя магутныя з іх — *багамі*. Іх уяўлялі ў выглядзе жывёл або людзей. Фігуркі багоў вырэзваліся з косці, дрэва або каменю. Людзі пакланяліся гэтым фігуркам — ***ідалам***, звярталіся да іх з просьбай — *малітвай* — аб здароўі, удачным паляванні або добрым ураджаі.



Каменныя ідалы

Такія з'явы, як сон і смерць, таксама тлумачыліся звышнатуральнай сілай — рухам *душы*, якая падчас сну або смерці пакідае чалавека. Старажытны чалавек баяўся хвароб і не ведаў, як іх лячыць. Ён жа сутыкаўся з праблемамі і няўдачамі ў побыце, на паляванні, у асабістым жыцці. Людзі лічылі, што душы памерлых праяўляюць клопат аб іх або, наадварот, гневаюцца на іх. Таму душы чалавека пакланяліся, у яе прасілі літасці і абароны. Аб'ектам пакланення маглі быць неадушаўлёныя прадметы, якім прыпісваліся незвычайныя ўласцівасці і здольнасці ўплываць на дзеянні і ўчынкі людзей.

*Такім чынам, першабытныя людзі ўважліва вывучалі прыроду і назапашвалі веды. Паступова зараджалася мастацтва — творчае адлюстраванне навакольнага свету ў мастацкіх вобразах. Узніклі рэлігійныя ўяўленні — вера ў звышнатуральныя сілы і ў жыццё пасля смерці. Рэлігію, заснаваную на пакланенні многім багам, называюць мнагабожжам, а ў хрысціянскай традыцыі — язычніцтвам.*

1. Колькі гадоў самым старажытным тварэнням выяўленчага мастацтва?
2. Пералічыце віды выяўленчага мастацтва, якія з'явіліся ў першабытным грамадстве.
3. Як вы думаеце, чаму вучоныя доўгі час не верылі, што малюнкі на скалах і сценах пячор належаць першабытным мастакам?



Правообладатель Народная асвета

**4.** З чым звязана зараджэнне рэлігійных вераванняў? Растлумачце, што такое язычніцтва.

**5.** Паразважайце, ці мог у членаў родавай абшчыны існаваць найбольш паважаны аб’ект пакланення (культ).

**6*.** Ці можна пагадзіцца з меркаваннем аб тым, што прычыны зараджэння рэлігійных вераванняў і з’яўленне мастацтва паміж сабой цесна звязаны? Сваё меркаванне патлумачце.

## § 7. З’яўленне земляробства і жывёлагадоўлі

**Успомніце.** Як выкарыстоўваліся прылады працы, вынайдзеныя першабытным чалавекам?

**1. Пацяпленне. Новыя вынаходніцтвы людзей.** Каля **12 тысяч гадоў назад** ледавік пачаў павольна таяць і адступаць на поўнач. На вызваленай ад лёду зямлі выраслі лясы і хмызнякі. Да гэтага часу маманты амаль вымерлі. Хутканогіх і дробных жывёл было нашмат цяжэй заганяць у прыгатаваныя ямы-пасткі. Паляваць з кап’ём на іх было таксама няпроста. Гэта заставіла людзей удасканальваць прылады працы і зброю. Менавіта ў гэты час былі вынайдзены лук і стрэлы. З’явіліся плыты і лодкі.



Паляванне. *Старажытны пячорны малюнак*

**2. Першыя земляробы і жывёлаводы.** Тады ж людзі заўважылі, што калі насенне дзікарослых злакаў трапляла ў зямлю, то з іх выраслі расліны, якія давалі новы ўраджай зерня. Непадалёку ад стаянкі жанчыны ўскопвалі завостранай палкай-капалкай невялікі ўчастак зямлі, які засявалі. Калі ўраджай выспяваў, каласы зрэзвалі каменнымі сярпамі. З зёрнаў, перацёртых з дапамогай двух плоскіх камянёў, атрымлівалі муку. З мукі, разбаўленай вадою, — цеста. З цеста, выпечанага на распаленых камянях, — праснакі. Хлеб на доўгі час стаў асноўнай ежай чалавека.



Правообладатель Народная асвета

З цягам часу палка-капалка былаператворана ў *матыку*. Людзі паступова сталі пераходзіць ад збіральніцтва да земляробства, пачалі весці аселы лад жыцця. А для таго, каб пастаянна вырошчваць ураджай, трэба было жыць на адным месцы. Земляробы будавалі больш дасканалае жыллё, чым зямлянкі ці шалашы.

Мужчыны-паляўнічыя часта прыносілі дамоў дзіцянят забітых звяроў. Маленькія жывёлы настолькі прывыкалі да чалавека, што станавіліся свойскімі. Першым быў прыручаны сабака. Затым людзі прыручылі коз, авечак, свіней і іншых жывёл. Свойскія жывёлы надзейна служылі чалавеку. Сабакі ахоўвалі жыллё, высочвалі звера і гналі яго. Мяса жывёл ішло ў ежу, а са шкур выраблялі адзенне. Каровы і іншыя рагатыя жывёлы давалі малако. Быкі служылі рабочай сілай пры апрацоўцы палёў і перавозцы грузаў. Нядзіўна, што людзі сталі разводзіць свойскіх жывёл цэлымі статкамі.

Пачаткі земляробства і жывёлагадоўлі выяўлены археолагамі ў Пярэдняй Азіі і налічваюць **10—12 тысяч гадоў**.

**3. Узнікненне рамяства.** Прыкладна ў гэты ж час чалавек заўважыў важную ўласцівасць гліны зацвердзяваць на агні. У выніку ён навучыўся рабіць з гліны трывалы посуд. Хутка пасля гэтага людзі вынайшлі ткацтва. Валокны воўны і лёну сталі скручваць з дапамогай прымітыўнай прасніцы ў доўгія ніткі. Роўнымі радамі ніткі нацягваліся на драўляную раму спачатку вертыкальна, а затым пра-



Гліняны посуд першых земляробаў



Правообладатель Народная асвета

пускаліся папярочна. З атрыманай тканіны шылі зручнае адзенне, якое прыйшло на змену адзенню са шкур або лісця.

Так з’явіліся першыя ***рамёствы*** — выраб посуду, прылад працы, тканіны або іншых вырабаў ручным спосабам. Рамеснікі абменьвалі свае вырабы на прадукты земляробаў-жывёлаводаў.

**4. Род і племя.** Паступовa родавыя абшчыны паляўнічых ператварыліся ў родавыя абшчыны земляробаў і жывёлаводаў. Родавыя старэйшыны сачылі за тым, каб усе суродзічы выконвалі агульныя работы на палях і пароўну дзялілі сабраны ўраджай і прадукты жывёлагадоўлі. Абшчыны разрасталіся да некалькіх сотняў чалавек, а потым дзяліліся. Зямля не магла пракарміць усіх, і трэба было шукаць новае ўрадлівае месца.

Частка суродзічаў адыходзіла на суседнія палі і ўзгоркі і стварала там свае паселішчы. Некалькі брацкіх абшчын, якія жылі ў адной мясцовасці, складалі адзіны саюз — *племя*. На чале племені стаяў ***саве́т ста́рэйшын***. Старэйшыны разбіралі спрэчкі паміж людзьмі і вызначалі пакаранне. Найбольш важныя справы, напрыклад перасяленне на новыя землі, вырашаліся на сумесным сходзе дарослых мужчын.

*Такім чынам, са збіральніцтва і палявання ўзніклі земляробства і жывёлагадоўля. Людзі пераходзілі да аселага ладу жыцця. Родавыя абшчыны разрасталіся, дзяліліся, і ўтвараліся плямёны.*

1. Як змяніўся клімат каля 12 тысяч гадоў назад?
2. Што ў гэты час заставіла чалавека ўдасканальваць прылады працы і зброю?
3. Калі і дзе, па дадзеных археолагаў, з’явілася земляробства і жывёлагадоўля?
4. Што павінен быў ведаць і ўмець старажытны чалавек, каб стварыць посуд з гліны і зручнае адзенне з тканіны? Як называецца выраб розных прадметаў ручным спосабам?
5. Раскажыце, як утвараліся і як кіраваліся плямёны.



Правообладатель Народная асвета

**6*.** Абмяркуйце, у чым складаецца перавага збіральніцтва і палявання перад земляробствам і жывёлагадоўляй і ў чым — земляробства і жывёлагадоўлі перад збіральніцтвам і паляваннем. Чаму збіральнікі і паляўнічыя аддавалі перавагу цяжкай і знясільваючай працы земляроба і жывёлавода?

## § 8. Пераход ад родавай абшчыны да суседскай

**Успомніце.** Як змянілася жыццё людзей у сувязі з пераходам да земляробства і жывёлагадоўлі?

**1. Пачатак выкарыстання металаў.** Першым металам, які чалавек навучыўся апрацоўваць і плавіць, стала *медзь*. Медзь сустракаецца ў прыродзе і ў самародках, і ў саставе руды. Расплавіць яе можна ў звычайным вогнішчы. Людзі заўважылі гэта і паступова сталі выкарыстоўваць медзь для вырабу сякер, наканечнікаў матык, кап'яў і стрэл. Медны наканечнік матыкі, сякеры або кап'я быў больш трывалым і даўгавечным за касцяны і рогавы. Акрамя таго, медныя часткі можна было завастрыць або пераплавіць занава.



Бронзавыя прылады працы

Акрамя медзі, у звычайным вогнішчы можна было выплавіць волава і свінец. Але волава і свінец больш мяккія, чым медзь. Таму чалавек у старажытнасці ведаў пра іх, але выкарыстоўваў нашмат радзей за медзь. У выніку сплаву медзі і волава атрымалася *бронза*. Бронзавыя вырабы былі больш трывалыя за медныя.

Золата і серабро сустракаліся ў самародках.



Правообладатель Народная асвета

**2. Узнікненне абмену і гандлю.** Выкарыстанне матыкі з металічным наканечнікам дазволіла чалавеку павялічыць ураджай на палях. Гліняныя гаршкі далі магчымасць лепш захоўваць прадукты земляробства і жывёлагадоўлі. Ткацтва забяспечыла чалавека добрым адзеннем. Але металы ўмелі выплаўляць не ўсюды. Добры посуд і тканіну маглі вырабляць толькі навучаныя рамеснікі. Так узнікла неабходнасць абмену паміж земляробамі, жывёлаводамі і рамеснікамі.

Спачатку зерне, малако і мяса проста мянялі на гаршкі, адзенне і вырабы з металу. З цягам часу за кожны выраб сталі даваць пэўную колькасць прадуктаў. Такі абмен называюць *гандлем*. У якасці грошай першапачаткова выступалі марскія ракавіны, шкуры жывёл, зёрны пшаніцы і іншых злакаў.

**3. Утварэнне саюзаў плямён.** Як вы ўжо ведаеце, у выніку развіцця земляробства і жывёлагадоўлі ўтварыліся плямёны. Кожнае племя складалася з некалькіх родаў. Сваякі часта вялі агульную гаспадарку. Яны жылі па-суседску, апрацоўвалі агульныя землі, пасвілі агульны статак. Такая абшчына называецца *суседскай*.

У час вайны або стыхійнага бедства на чале племені станавіліся адважныя і ўмелыя воіны — правадыры. Іх выбіралі на сходах усіх дарослых мужчын.



Месца сходу саюза плямён



Правообладатель Народная асвета

Старэйшыны і правадыры карысталіся асобнай пашанай і павагай. Ім аддавалі самае лепшае адзенне, лепшых жывёл, лепшыя землі. Яны павінны былі кіраваць племенем, распараджаліся запасамі ежы, мелі права судзіць супляменнікаў. Усе гэтыя асаблівыя правы звычайна называюць словам «улада». Правадыры і старэйшыны складалі родавую *знаць*, якая пачала перадаваць сваю маёмасць, а затым і пасады па спадчыне. Знатныя людзі станавіліся багацейшымі за іншых супляменнікаў. Так узнікла няроўнасць.

З цягам часу некаторыя плямёны сталі настолькі шматлікімі, што падзяліліся. Але яны па-ранейшаму ведалі пра сваё радство. Так з'явіліся *племянныя саюзы*. Кожны такі саюз меў свае палі і пашы. Людзі, якія ўваходзілі ў племянны саюз, называліся «свае». Тыя, хто не ўваходзіў у саюз, называліся «чужыя». Калі розныя племянныя саюзы сварыліся, пачыналася вайна. У час такой вайны кожны чалавек павінен быў абараняць «сваіх» і змагацца супраць «чужых».

З'яўленне няроўнасці і неабходнасці абараняць землі свайго племені прывялі да ўзнікнення дзяржавы як сістэмы ўлады на пэўнай тэрыторыі.

*Такім чынам, важнейшымі падзеямі ў гісторыі чалавецтва былі: адкрыццё металаў, з'яўленне суседскіх абшчын, утварэнне плямён і племянных саюзаў, узнікненне няроўнасці і з'яўленне дзяржавы.*

1. Назавіце метал, які чалавек навучыўся апрацоўваць і плавіць раней за іншыя металы.
2. Якімі перавагамі валодалі медныя і бронзавыя прылады працы?
3. Чаму ўзнікла неабходнасць у абмене прадуктамі працы паміж земляробамі, жывёлаводамі і рамеснікамі? Які абмен называюць гандлем?
4. Якімі калектывамі жылі сваякі і як сярод абшчыннікаў выдзелілася знаць?
5. З чым звязана з'яўленне племянных саюзаў і ўзнікненне паміж імі войнаў?



Правообладатель Народная асвета

6. Што садзейнічала ўзнікненню няроўнасці ў старажытным грамадстве? Назавіце прычыны ўзнікнення няроўнасці.

7*. Як вы думаеце, хто быў асабліва зацікаўлены ў развязванні войнаў паміж плямёнамі? Сваё меркаванне абгрунтуйце.

## Для дапытлівых

Задоўга да медзі чалавек навучыўся выкарыстоўваць метэарытнае жалеза. Упрыгожанні і амулеты з яго выраблялі яшчэ каля 12 тысяч гадоў назад. Вядома, метэарыты чалавек не апрацоўваў і не плавіў. Але ад іншых камянёў метэарыты адрозніваліся тым, што падалі з неба і доўга былі гарачымі. Таму ў старажытнасці людзі часта называлі метэарыты «нябеснымі камянямі» і лічылі неба вельмі цвёрдым і вельмі гарачым. З цягам часу «нябеснымі камянямі» сталі называць руды і самародкі ўсіх металаў.

**Пытанні да дакумента.** Якім чынам людзі маглі пазнаёміцца з першым металам? Чаму яны лічылі неба вельмі цвёрдым і гарачым?

### Абагульненне да раздзела «Ад першабытнасці да цывілізацыі»

Цяжка ўявіць, што сотні тысяч гадоў калектывы першабытных людзей вандравалі па зямлі, мяняючы месцы паляўнічых стаянак у залежнасці ад пораў года і змяненняў клімату. Узброеныя дубінамі і камянямі, яны ішлі ўслед за дзічынай, асвойвалі ўсё новыя землі ў пошуках прыдатных да ежы раслін, а таксама дрэва і матэрыялаў, неабходных для вырабу прылад працы і палявання. Першыя людзі былі бездапаможныя перад прыродай, іх жыццю пастаянна пагражала небяспека ад нападзення драпежных звяроў, ад голаду, ад паводак, лясных пажараў і вывяржэнняў вулканаў. Але праходзілі тысячагоддзі. Чалавек паляпшаў умовы свайго жыцця. Ён навучыўся выкарыстоўваць, а затым здабываць агонь. Навучыўся апрацоўваць камень — спачатку груба, а затым усё больш дасканала.

Паляванне першабытных людзей пайшло больш паспяхова, калі ў іх з'явіўся лук, паколькі стралой з лука можна было забіваць звера або птушку на значнай адлегласці.



Правообладатель Народная асвета

Паколькі людзі працавалі разам, то здабытыя і вырашчаныя прадукты выкарыстоўваліся імі супольна. Сумесная праца людзей выклікала неабходнасць перадаваць адзін другому свае думкі. Так удасканальвалася чалавечае маўленне як сродак зносін людзей паміж сабой.

Не разумеючы многіх з'яў прыроды, баючыся і ў той жа час шануючы іх, чалавек думаў, што яны выклікаюцца вышэйшымі, звышнатуральнымі сіламі — багамі. Гэта было пачаткам зараджэння рэлігіі.

Пастугова назапасіўшы ў галіне збіральніцтва і палявання шмат карысных звестак, людзі перайшлі да земляробства і жывёлагадоўлі.

Узнікненне земляробства і жывёлагадоўлі ўнесла ў жыццё людзей вялікія змены. Цяпер чалавек значна менш залежаў ад выпадковасцей. Людзі сталі радзей пераходзіць з месца на месца, яны навучыліся будаваць пастаяннае жыллё, а лішкі прадуктаў адкладвалі ў запас. Жыццё першабытных людзей палепшылася.

На змену родавай абшчыне прыйшла суседская абшчына. З'явіліся багатыя і бедныя, узнікла няроўнасць. Для падтрымання парадку і для абароны ад знешняй пагрозы ў земляробчых абшчынах была створана дзяржава. На гэтым закончылася гісторыя першабытнасці і пачалася эпоха цывілізацый.

***Цывілiза́цыя*** характарызуецца больш высокім узроўнем развіцця ў параўнанні з першабытным перыядам, наяўнасцю аселага ладу жыцця, пісьменнасці, гарадоў і дзяржавы, развітых рамёслаў і культуры.

*Вынікам працяглага развіцця земляробчых абшчын стала з'яўленне дзяржавы.* ***Дзяржава*** *— гэта сістэма ўлады, якая ажыццяўляе кіраванне грамадствам на пэўнай тэрыторыі, забяспечвае ў ім парадак і стабільнасць. Першыя дзяржавы ўзніклі ў далінах вялікіх рэк Пярэдняй Азіі і Старажытнага Егіпта.*



Правообладатель Народная асвета

1. Як гісторыкі назвалі пачатковы этап гісторыі чалавецтва?
2. На якія перыяды дзеліцца гісторыя Старажытнага свету і якія падзеі ахоплівае кожны з іх?
3. Запоўніце прабелы ў календары гістарычных падзей гэтага перыяду. (Табліцу начарціце ў сшытку.)

| Калі? | Што адбылося? |
|---|---|
| | Вылучэнне чалавека з жывёльнага свету і з'яўленне першых каменных прылад працы |
| 1,5 млн гадоў назад | |
| | З'яўленне неандэртальца |
| Больш за 40 тысяч гадоў назад | |
| | Адступленне ледавіка |
| 10 000 — 8000 гадоў да н. э. | |

4. Як вы зразумелі, што такое дзяржава і што прывяло да яе з'яўлення?
5. Якімі вынаходніцтвамі і адкрыццямі старажытных людзей карыстаюцца сучасныя жыхары нашай планеты?

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

# Глава 1. СТАРАЖЫТНЫ ЕГІПЕТ

## § 9. Прырода і насельніцтва Старажытнага Егіпта

**Успомніце.** Калі і дзе адбыўся пераход да земляробства?

**1. Прырода Старажытнага Егіпта.** Цывілізацыя Старажытнага Егіпта зарадзілася на берагах шчодрага *Ніла*, у паўночнай частцы Афрыканскага кантынента.




Карта Старажытнага Егіпта



Правообладатель Народная асвета



Рака Ніл. *Сучасны выгляд*

Ніл — адна з самых вялікіх рэк свету. Яна пачынае свой доўгі шлях у Цэнтральнай Афрыцы і ўпадае ў Міжземнае мора. Перад упадзеннем у мора Ніл разгаліноўваецца на водныя рукавы і ўтварае шырокую *дэльту* — ўрадлівую даліну, якая нагадвае па сваёй форме трохвугольнік.

У старажытнасці берагі Ніла зарасталі густым высокім трыснягом — ***папі́русам***, духмянымі гаямі акацый, фінікавых пальмаў, вінаградам. У зарасніках папірусу вадзіліся незлічоныя чароды птушак. Рака была багатай на рыбу. У вадзе жылі кракадзілы і бегемоты. У Старажытным Егіпце вадзіліся таксама антылопы, кабаны, пантэры і львы.

Да даліны Ніла прылягалі чырвоныя землі пустыні і невысокія горы, багатыя на розныя пароды каменю і гліны. На ўсход ад дэльты знаходзіліся залежы меднай руды. А на поўдні Старажытнага Егіпта — золата. Прыродныя багацці выкарыстоўваліся ў будаўніцтве і для вырабу прылад працы. З папірусу вязалі плыты і будавалі лодкі, атрымлівалі спецыяльны матэрыял для пісьма.

**2. Разлівы Ніла.** У Егіпце дажджы выпадаюць рэдка, затое часта бываюць засушлівыя вятры-сухавеі. У красавіку — маі яны



Правообладатель Народная асвета

дуюць з Лівійскай пустыні на працягу 50 дзён. Расліны вянуць, сухая зямля трэскаецца.

Выратавальная прахалода прыходзіць з поўначы. У гэты ж час у месцах, адкуль цячэ Ніл, пачынаецца сезон дажджоў. Узровень вады ў Ніле рэзка падымаецца. Рака выходзіць з берагоў — разліваецца, затапляючы прыбярэжныя землі і амаль усю дэльту. Паводка трымаецца тры месяцы — з ліпеня да верасня. Затым вада спадае, пакідаючы пасля сябе *глей* — мяккі і клейкі асадак з часцінак напаўгнілых раслін і горных парод. Таўшчыня ўрадлівага слоя ў асобных месцах дасягала больш чым дзесяць метраў. Таму старажытныя егіпцяне называлі сваю краіну *«Чорнай зямлёй»*.

**3. Старажытныя земляробы ў даліне Ніла.** Людзі здаўна засялялі даліну Ніла. Асноўным заняткам насельніцтва было земляробства. Сельскагаспадарчыя работы цалкам залежалі ад разліваў Ніла, да якіх земляробы рыхтаваліся асабліва старанна. Будавалі каналы і вялікія вадасховішчы. З гліны і чароту рабілі спецыяльныя насыпы, або *дамбы*. У дамбах рабілі маленькія вароты. У час разліву іх адчынялі і прапускалі ваду, а затым зачынялі, і такім чынам надоўга захоўвалі ў вадасховішчы частку вады, якая заставалася. З цягам часу егіпцяне навучыліся будаваць спецыяльныя пад'ёмныя прыстасаванні — *шадуфы*. З дапамогай гэтых «калодзежных жураўлёў» ваду падавалі на ўзвышшы і арашалі палі падчас засухі. Земляныя работы выконвалі супольна ўсёй земляробчай абшчынай. Так у Старажытным Егіпце ўзнікла ***арашáемае землярóбства***.



Арашэнне з дапамогай шадуфа

У сярэдзіне лістапада пачынаўся сезон ворыва і сяўбы. Зямлю рыхлілі ўручную, матыкай. Затым з'явіліся саха і драўляны плуг. У плуг запрагалі валоў. Пасля ўзворвання поле засявалі пшаніцай і ячменем.



Правообладатель Народная асвета



Сельскагаспадарчыя работы.
*Старажытнаегіпецкая фрэска*

У лютым — сакавіку егіпцяне збіралі ўраджай. Пшаніцу і ячмень жалі меднымі сярпамі. Падчас жніва зрэзвалі толькі каласкі. Іх малацілі на таку, кідаючы пад ногі свойскай жывёле. У гэты ж час на агародах збіралі розную агародніну — бабы, гарох, агуркі, цыбулю, часнок.

Старажытныя егіпцяне былі добрымі садаводамі. Вырошчвалі фінікі, інжыр, гранаты і розныя сарты вінаграду. Яны разводзілі таксама свойскую жыўнасць — кароў, авечак, коз, аслоў, гусей і качак. Рыбу лавілі сеткамі або спецыяльнымі прыстасаваннямі.

**4. Егіпцяне-рамеснікі.** У Старажытным Егіпце было шырока развіта рамяство. Рамеснікі навучыліся выплаўляць медзь, а ў сярэдзіне другога тысячагоддзя да н. э. — бронзу. Развівалася гарбарная справа. З апрацаваных шкур жывёл выраблялі сандалі і рамяні. Шкурамі абцягвалі баявыя шчыты і калясніцы.

Егіпцяне славіліся вытворчасцю тканіны і ювелірных вырабаў. Тканіна была розная. Тонкая, як павуцінне, для багатых, і грубая, больш танная, для беднякоў. Асабліва цанілася тканіна з лёну, які ўпершыню навучыліся вырошчваць і апрацоўваць у Старажытным Егіпце. Егіпцяне таксама ўмелі выплаўляць шкло з пяску



Правообладатель Народная асвета

і соды, а з дапамогай розных прымесяў атрымліваць каляровае шкло. У краіне быў добра развіты менавы гандаль.

*Такім чынам, выгадныя прыродныя ўмовы дазволілі егіпцянам быць не толькі адмысловымі земляробамі, але і ўмелымі раменікамі. Арашаемае земляробства, якое патрабавала вялікіх калектыўных намаганняў, стала важнай перадумовай стварэння дзяржавы ў Старажытным Егіпце.*

1. Пакажыце Старажытны Егіпет на карце. Апішыце яго месцазнаходжанне, выкарыстоўваючы словы: Афрыка, Ніл, дэльта, Міжземнае мора.
2. Якія прыродныя ўмовы Старажытнага Егіпта спрыялі земляробству і якія — не?
3. Прывядзіце прыклады старannай падрыхтоўкі егіпецкіх земляробаў да сезону разліву Ніла. Што ім дапамагала збіраць добрыя ўраджаі збожжа, агародніны, фруктаў?
4. Пералічыце рамёствы, якія былі развіты ў егіпцян.
5. Падумайце, як земляроб мог набыць выраб рамесніка ў Старажытным Егіпце, калі вядома, што грошай яшчэ не было. Які з гэтага можна зрабіць вывад?

6*. «Дар Ніла» — так называлі сваю краіну егіпцяне. Ці згодны вы з гэтым сцвярджэннем?

## Для дапытлівых

### Старажытнагрэчаскі гісторык Дыядор Сіцылійскі аб Старажытным Егіпце

Тым, хто бачыць паводку Ніла, яна здаецца дзівоснай... Бо ў той час, як усе іншыя рэкі пачынаюць убываць у час летняга сонцастаяння, а ў наступныя месяцы лета яшчэ больш мялеюць, толькі ён адзін тады, пачынаючы ўздымацца, дзень за днём павялічваецца настолькі, што пад канец затапляе амаль увесь Егіпет. Такім жа самым чынам ён вяртаецца да ранейшага становішча, паніжаючыся за роўны прамежак часу да тых пор, пакуль не вернецца да ранейшага становішча... Мноства сухапутных жывёл, захопленых ракой, гіне, некато-



Правообладатель Народная асвета

рыя ж, выбегшы на больш высокія месцы, ратуюцца; свойскія жывёлы ў час разліву кормяцца ў паселішчах і вёсках раней прыгатаваным для іх кормам. Для прадухілення магчымых у час паводак бедстваў у сталіцы Старажытнага Егіпта Мемфісе ўведзена царамі назіранне за Нілам; асобы, якім гэта даручаецца, дакладна замерваюць пад'ём вады ў ім і накіроўваюць у гарады паведамленні, дакладна тлумачачы, на колькі локцяў або пальцаў паднялася рака і калі пачала спадаць.

**Пытанні да дакумента.** Аб чым сведчаць створаныя царамі Егіпта назіранні за Нілам? Што ўваходзіла ў абавязкі назіральнікаў?

## § 10. Дзяржава фараонаў

**Успомніце.** Якую ролю ў жыцці старажытных егіпцян адыгрывала рака Ніл?

**1. Аб'яднанне Старажытнага Егіпта ў адну дзяржаву.** У канцы чацвёртага тысячагоддзя да н. э. у даліне Ніла ўтварыліся два вялікія царствы. Адно ў дэльце Ніла — *Ніжні Егіпет*, другое на поўдні краіны — *Верхні Егіпет*. Цар Ніжняга Егіпта насіў чырвоную карону, а цар Верхняга Егіпта — белую карону. Прыкладна ў **3000 годзе да н. э.** правіцель паўднёвага царства цар ***Міна*** атрымаў перамогу над сваім паўночным суседам і аб'яднаў краіну ў адну дзяржаву. Ён стаў насіць двайную карону — белую, устаўленую ў чырвоную. Пераемнікі Міны з гэтага часу называліся царамі Верхняга і Ніжняга Егіпта. Сталіцай адзінай дзяржавы быў горад ***Мемфіс*** («Белыя сцены»), размешчаны недалёка ад сучаснага Каіра.


Старажытнаегіпецкая статуя фараона

**2. Улада фараонаў.** Уся ўлада ў Старажытным Егіпце належала цару. Старажытныя егіпцяне шанавалі яго як бога. Нават самыя знатныя людзі беспярэчна падпарадкоўваліся яму. Людзям забаранялася вымаўляць услых імёны сваіх цароў. Гаворачы пра іх, яны выкарыстоў-



Правообладатель Народная асвета



Піраміды

валі слова «пер-о», якое азначала «вялікі дом». Старажытным грэкам у гэтым слове падалося «фараон». Гэтым тлумачыцца, чаму цара Старажытнага Егіпта мы называем ***фарао́нам***.

Егіпцяне лічылі, што фараон павінен жыць вечна. Пасля смерці — у спецыяльных «дамах вечнасці», ці грабніцах. Паводле загаду фараона дзясяткі тысяч людзей будавалі грабніцы ў форме вялікіх пірамід. *Піраміды* — найвялікшыя збудаванні не толькі старажытнасці, але і сучаснага свету. Яны лічацца першымі з *сямі цудаў свету*.

**3. Арганізацыя старажытнаегіпецкай дзяржавы.** Фараон кіраваў дзяржавай з дапамогай *вяльможаў* — блізкіх і давераных асоб, саветнікаў, военачальнікаў і чыноўнікаў, г. зн. людзей, якія знаходзіліся на службе. Вышэйшым чыноўнікам пры фараоне быў *візір*, якому падпарадкоўваліся ўсе астатнія чыноўнікі. Асобае становішча займаў чыноўнік, які распараджаўся харчовымі запасамі краіны, а таксама настаўнік і выхавацель дзяцей фараона.

Чыноўнікі кіравалі ў сёлах і гарадах, кіравалі будаўнічымі работамі, сачылі за ўсім, што адбывалася ў краіне. Найбольш важным абавязкам чыноўнікаў быў збор падаткаў з земляробаў і рамеснікаў. У Старажытным Егіпце рэгулярна праводзіўся перапіс насельніцтва. Усю гэтую работу выконвалі *пісцы*, якія ажыццяўлялі ўладу фараона на месцах. Дзякуючы чыноўнікам цар ведаў усё аб сваіх падданых.



Правообладатель Народная асвета




Устройства грамадства: «піраміда» ўлады ў Старажытным Егіпце

У фараонаў была добра арганізавана армія. Яна падтрымлівала ўладу фараона ўнутры краіны, служыла для адпору ворагаў і пашырэння тэрыторыі дзяржавы.

Значную частку насельніцтва Старажытнага Егіпта складалі земляробы. Кожны з іх атрымліваў ад фараона невялікі ўчастак зямлі, на якім вёў уласную гаспадарку. За карыстанне гэтай зямлёй земляробы плацілі фараону падатак. Частку ўраджаю і прыплоду ад статку яны аддавалі цару і храмам.

Ніжэйшую ступень займалі рабы. Як правіла, гэта былі палонныя, захопленыя падчас войнаў. Рабы не мелі зямлі і другой маёмасці і павінны былі працаваць на свайго гаспадара.

**4. Улада жрацоў.** Старажытныя егіпцяне глыбока шанавалі сваіх багоў і фараонаў. У іх гонар узводзіліся велічныя храмы. Богаслужэнне і свяшчэнныя абрады ў храмах спраўлялі спецыяльна абучаныя людзі — ***жрацы́*** і ***жры́цы***.

Жрацы лічыліся мудрацамі і захавальнікамі старажытнейшых ведаў. Яны вялі астранамічныя назіранні, многае зрабілі для развіцця матэматыкі і медыцыны. Улада жрацоў над людзьмі была даволі моцнай. Некаторыя з іх сапернічалі з фараонамі і нават станавіліся правіцелямі Старажытнага Егіпта.



Правообладатель Народная асвета

*Такім чынам, Старажытны Егіпет уяўляў сабой добра арганізаваную дзяржаву з неабмежаванай удладай фараона. Апорай царскай улады былі войска і шматлікія чыноўнікі. Іх важнейшым абавязкам з'яўлялася падтрыманне парадку ў краіне і збор падаткаў. Сістэму кіравання дзяржавай, пры якой улада сканцэнтравана ў руках аднаго чалавека, называюць «манархіяй».*

1. Калі і хто аб'яднаў Старажытны Егіпет у адну дзяржаву? Пакажыце на карце яго тэрыторыю і сталіцу.
2. Што азначае слова «фараон»? Як фараоны стараліся ўвекавечыць (праславіць навечна) сваю ўладу і імёны?
3. Хто дапамагаў фараону кіраваць старажытнаегіпецкай дзяржавай? Якую работу выконвалі пісцы?
4. Падрыхтуйце, выкарыстоўваючы дадатковы матэрыял, вуснае паведамленне аб самых знакамітых збудаваннях старажытнасці — егіпецкіх пірамідах. Чаму яны лічацца першымі з сямі цудаў свету?

**5*.** Якія факты сведчаць аб тым, што ў даліне Ніла пры фараонах была створана добра арганізаваная дзяржава?

## Для дапытлівых

### З павучання фараона свайму сыну Мерыкара

Будзь майстрам у прамовах, і ты будзеш моцным; моц цара — у яго мове, словы мацнейшыя за любую зброю. Толькі той, хто навучаны, будзе добрым правіцелем. Не будзь злым, цудоўна добразычлівасць, якая працягвае даўгалецце тваіх здабыткаў людской любоўю да цябе.

Шануй тваіх вяльмож, даруй дабрабыт тваім людзям; умацоўвай тым самым сваю граніцу і людскую прыхільнасць да цябе.

Уцеш таго, хто стогне, не прыцясняй удаву, не праганяй сына ад маёмасці яго бацькі і не здымай вяльмож з іх пасад. Асцерагайся караць неабдумана! Не забівай — няма табе ў гэтым карысці, карай пабоямі і зняволеннем. Не рабі розніцы паміж сынам знатнага дзеяча і простага чалавека; набліжай да сябе чалавека за справы яго рук.

**Пытанні да дакумента.** Якім чынам цар (фараон) раіў сыну ўмацоўваць царскую ўладу? Чые інтарэсы ён абараняў?



Правообладатель Народная асвета

# § 11. Ператварэнне Старажытнага Егіпта ў магутную дзяржаву

**Успомніце.** Хто ў Старажытным Егіпце валодаў неабмежаванай уладай?

**1. Умацаванне Егіпта.** У XVII стагоддзі да н. э. Старажытны Егіпет заваявалі качавыя плямёны *гіксосаў*, якія прыйшлі з Пярэдняй Азіі. Качэўнікі ваявалі на баявых калясніцах, запрэжаных коньмі. Егіпцяне ж прымянялі тактыку пешага бою. Пра існаванне коней яны яшчэ не ведалі.

Гіксосы кіравалі Егіптам звыш 100 гадоў. У сярэдзіне XVI стагоддзя да н. э. яны былі выгнаны. Краіна акрыяла ад разрухі. Егіпцяне навучыліся разводзіць коней, рабіць баявыя калясніцы. Атрады воінаў, якія змагаліся на калясніцах, складалі грозную сілу егіпецкай арміі.

Сталіцай новай адзінай дзяржавы стаў горад ***Фівы***. Заступнік Фіў бог сонца *Амон* ператварыўся ў важнае бажаства для ўсяго Старажытнага Егіпта. З гэтага часу пачынаецца эпоха найбольшай магутнасці старажытнаегіпецкай дзяржавы.



Паднашэнне цару. *Старажытнаегіпецкая фрэска*



Правообладатель Народная асвета

**2. Войны і заваёвы.** Фараоны вялі паспяховыя войны. Яны падпарадкавалі сваёй уладзе многія суседнія краіны.

Вялікім заваёўнікам старажытнасці быў фараон ***Тутмос III*** (XV стагоддзе да н. э.). У час яго праўлення тэрыторыя Егіпта павялічылася ўтрая. Фараону падпарадкаваліся краіны Усходняга Міжземнамор'я — *Палесціна* і *Сірыя*. На поўдні ён заваяваў багатую на золата *Нубію*. Армія фараона рушыла ў Пярэднюю Азію і дайшла да берагоў *Еўфрата*. Усяго за сваё жыццё Тутмос III здзейсніў 17 ваенных паходаў.

Знакамітым палкаводцам быў ***Рамсес II***, які кіраваў прыблізна ў **1279—1213 гадах да н. э.** Фараон вёў войны з магутным царствам *хетаў* у Азіі. Але яму так і не ўдалося пакарыць іх дзяржаву. Каля **1270 года да н. э.** паміж егіпцянамі і хетамі быў падпісаны першы вядомы нам у гісторыі *мірны дагавор*.

Рамсес II праславіўся не толькі як заваёўнік, але і як будаўнік. У яго доўгае царстванне былі пабудаваны новыя храмы, якія ўражвалі сваімі неверагоднымі памерамі.

Фараоны збіралі з пакораных народаў вялікую даніну. У Егіпет паступалі золата, слановая косць, дарагія тканіны, каштоўная драўніна, збожжа, табуны коней і жывёла. Тысячы людзей заганяліся ў рабства. «Жывыя забітыя» — так называлі ў Старажытным Егіпце рабоў. Рабы не мелі ніякіх правоў і працавалі на самых цяжкіх работах. Багатая здабыча дазваляла фараонам адорваць народ падарункамі. З нагоды ваенных перамог у сталіцы ладзіліся пышныя ўрачыстасці.



Фараон Эхнатон

**3. Фараон Эхнатон.** Важнай падзеяй у гісторыі Старажытнага Егіпта былі рэформы цара ***Эхнатона***. Гэты фараон правіў у XIV стагоддзі да н. э. Ён лічыў, што жрацы валодаюць занадта вялікай уладай і трэба гэтаму пакласці канец. Фараон задумаўся



Правообладатель Народная асвета

таксама над тым, чаму егіпцяне пакланяюцца многім багам, і прыйшоў да высновы, што бог адзін.

Эхнатон правёў вялікія змены і перамены, або *рэформы*, у рэлігійным жыцці егіпцян. Ён загадаў маліцца адзінаму богу Атону і перанёс сталіцу ў спецыяльна пабудаваны горад. Аднак устанаўленне культу адзінага бога ў Старажытным Егіпце было нядоўгім. Пасля смерці фараона-рэфарматара жрацы аднавілі мнагабожжа і свой уплыў у егіпецкім грамадстве.

**4. Заняпад улады фараонаў.** Пасля праўлення Рамсеса II старажытнаегіпецкая дзяржава паступова страчвала сваю былую магутнасць. Заваёўнікі разбуралі краіну і аслаблялі ўладу фараонаў. У VI стагоддзі да н. э. Егіпет быў заваяваны *Персіяй* і стаў адной з багацейшых абласцей гэтай магутнай дзяржавы.

У V стагоддзі да н. э. Егіпет наведаў знакаміты старажытнагрэчаскі падарожнік і гісторык *Герадот*. Егіпцяне расказвалі дапытліваму грэку аб вялікіх царах і іх дзеяннях як аб далёкім і легендарным мінулым.

*Такім чынам, у перыяд найвышэйшай магутнасці старажытнаегіпецкая дзяржава распасціралася ад берагоў Ніла да берагоў Еўфрата. Улада фараонаў абапіралася на добра абучаную і арганізаваную армію. Але з цягам часу і Старажытны Егіпет падпарадкаваўся больш магутным заваёўнікам.*

1. Пасля якіх падзей пачалася эпоха найбольшай магутнасці старажытнаегіпецкай дзяржавы?
2. Назавіце імёны вялікіх егіпецкіх заваёўнікаў. Знайдзіце на гістарычнай карце краіны, аб падпарадкаванні якіх Старажытнаму Егіпту гаворыцца ў другім пункце параграфа.
3. З якой дзяржавай у Азіі егіпцяне падпісалі першы ў гісторыі мірны дагавор? Начарціце ў сшытку лінію часу і адзначце на ёй гэтую падзею.
4. Аб чым сведчыць егіпецкі выраз «жывыя забітыя»?
5. Растлумачце сутнасць рэформ Эхнатона.

6*. Як вы думаеце, чаму багаты Егіпет у VI стагоддзі да н. э. не змог адстаяць сваю незалежнасць і быў заваяваны?



Правообладатель Народная асвета

### Для дапытлівых

**Дагавор паміж хецкім царом Хатусілі III і егіпецкім фараонам Рамсесам II**

Дагавор, які запісалі на сярэбранай пласціне вялікі цар краіны хетаў Хатусілі, магутны сын Мурсілі магутнага, вялікага цара краіны хетаў... і Рамсес II магутны, вялікі правіцель Егіпта, сын Сеці I магутнага, вялікага правіцеля Егіпта, унук Рамсеса I магутнага, вялікага правіцеля Егіпта...

Надалей і да канца вечнасці, у адпаведнасці з задумамі вялікага правіцеля Егіпта, роўна як вялікага цара краіны хетаў, бог не дасць дзякуючы дагавору адбыцца варожасці паміж імі...

I навекі не ўступіць вялікі цар краіны хетаў на зямлю егіпецкую, каб захапіць маёмасць яе, і навекі не ўступіць Рамсес II, вялікі правіцель Егіпта, на зямлю хецкую, каб захапіць маёмасць яе.

Калі прыйдзе другі вораг супраць зямлі Рамсеса II, вялікага правіцеля Егіпта, і ён пашле да вялікага цара краіны хетаў, кажучы: «Прыйдзі да мяне і дай сілу супраць яго», — вялікі цар краіны хетаў павінен прыйсці да яго... Калі ж вялікі цар краіны хетаў сам не прыйдзе, ён павінен паслаць свае войскі, свае калясніцы, і ён пераможа яго ворагаў.

**Пытанні да дакумента.** Чаму падобныя дагаворы ў гісторыі дзяржаў атрымалі назву «мірных»?

## § 12. Побыт і паўсядзённае жыццё старажытных егіпцян

**Успомніце.** Якім чынам геаграфічнае становішча і прыродныя багацці Егіпта паўплывалі на заняткі яго жыхароў?

**1. Земляробы і рамеснікі.** Большасць егіпецкага народа складалі земляробы і рамеснікі, якія працавалі на палях, на будаўніцтве, у майстэрнях. Яны павінны былі пракарміць не толькі сябе, але і фараона, яго вяльмож — саветнікаў і военачальнікаў, а таксама



Правообладатель Народная асвета

шматлікіх чыноўнікаў, воінаў і пісцоў. Невыпадкова на старажытнаегіпецкіх выявах можна ўбачыць разнастайныя віды земляробчых і рамесных работ.

Рабочы дзень рамесніка доўжыўся прыкладна 8 гадзін: з 8 раніцы да 12 гадзін і з 16 да 20 гадзін вечара. «Тыднем» лічылася дзесяцідзёнка з выхаднымі днямі. Акрамя таго, егіпцяне адпачывалі ў агульнадзяржаўныя святы. Паводле падлікаў вучоных, такіх нерабочых дзён набіралася да 160 у годзе.

Простыя егіпцяне жылі ў невялікіх глінабітных доміках, у якіх не было амаль ніякай мэблі. На земляной падлозе — трысняговая цыноўка, каля ачага — гліняны посуд. Дах часта выкарыстоўвалі для начлегу.

**2. У доме знатнага егіпцяніна.** У зусім іншых умовах жылі правіцелі Старажытнага Егіпта, вяльможы, жрацы і вышэйшыя чыноўнікі. Знатныя егіпцяне імкнуліся ва ўсім і заўсёды браць прыклад з фараона. Жылі яны ў раскошных палацах, акружаных высокімі глінянымі сценамі. Палацы, як і ўсе дамы ў Старажытным Егіпце, будаваліся з цэглы і мелі плоскі дах. Вечарамі, калі спадала гарачыня, на даху збіралася ўся сям'я для адпачынку. Пакоі ўнутры палаца атынкаваны і пакрыты малюнкамі.



Знатныя егіпцяне. *Старыжтнаегіпецкі малюнак*



Правообладатель Народная асвета

Палац размешчаны ў садзе сярод кветак і фруктовых садоў. Пасярод саду знаходзіцца сажалка. У ёй плаваюць гусі і качкі. Крыху далей — сховішча для зерня, кухня, хлебапякарня, калодзеж, а таксама хаціны для слуг.

...Сёння з раніцы ў палацы пануе незвычайная мітусня. Гэта верная прымета таго, што ў ім рыхтуюцца да прыёму гасцей. Слугі паліваюць кветкі і дрэвы, нешта таўкуць у ступах. Жанчыны-рабыні расціраюць зерне каменнымі зерняцёркамі, рыхтуюць разнастайныя стравы.

Нарэшце слугі засцілаюць падлогу самага вялікага пакоя свежымі трысняговымі цыноўкамі. Вакол развешваюць шматлікія гірлянды кветак лотасу. К гэтаму часу агонь у бронзавай жароўні прагарэў. На вуголле кладуць кавалачкі пахучай смалы, і ўсё навокал напаўняецца салодкім пахам духмяных рэчываў. Чуваць, як музыканты настройваюць свае інструменты. Чакаюць сваёй чаргі акрабаткі і танцоўшчыцы. Пітво і ежа пададзены. Усё гатова для прыёму гасцей.

**3. Адзенне і знешні выгляд.** Гарачы клімат не патрабаваў адмысловага адзення. Егіпцяне апраналіся лёгка і зручна. У багатых жанчын былі белыя льняныя сукенкі, якія нагадвалі сарафан. У мужчын — фартухі, нечым падобныя на спадніцу. Адзенне такога ж фасону насілі і простыя людзі. Толькі рабілася яно з грубага палатна. Дома егіпцяне звычайна хадзілі басанож. Сандалі надзявалі толькі тады, калі выходзілі з двара.



Старажытны егіпцянін са сваёй жонкай

Пра багацце і заможнасць людзей сведчаць ювелірныя ўпрыгожанні і каштоўнасці.

**4. Егіпецкая сям'я.** Сям'я ў Старажытным Егіпце лічылася каштоўнасцю. Жанчыны карысталіся павагай, мелі права валодаць маёмасцю. Егіпцяне вельмі любілі сваіх дзяцей. Амаль да трох гадоў дзіця не расставалася з маці. Дзяўчынкі вучыліся дома. Хлопчыкі ста-



Правообладатель Народная асвета

раліся авалодаць прафесіяй свайго бацькі, наведвалі школу. Адукаваны юнак нават з простай сям'і мог прасунуцца па дзяржаўнай службе. Непаслушэнства асуджалася і ў сям'і, і ў грамадстве. «Любімы богам паслухмяны, непаслухмяны ненавідзімы богам», — гаворыцца ў егіпецкім павучанні.

**5. Харчаванне старажытных егіпцян.** Яда большасці егіпцян была простай. Асноўнымі прадуктамі харчавання з'яўляліся пшанічныя або ячменныя ляпёшкі, кашы, сушаная рыба, агароднiна — агуркі, часнок, цыбуля, салата.

Багатыя харчаваліся нашмат лепш. У іх рацыёне былі таксама мяса, сыр, фрукты, а з напіткаў — малако, піва, віно.

*Такім чынам, жыццё багатых і знатных егіпцян адрознівалася ад жыцця простых працаўнікоў. Але ўсіх аб'ядноўвалі агульныя каштоўнасці: вера ў адных і тых жа багоў і ўважлівыя адносіны да сям'і, жанчын і дзяцей.*

1. У якіх умовах жылі старажытнаегіпецкія земляробы і рамеснікі?
2. Уявіце сабе, што вы пабывалі ў гасцях у знатнага егіпцяніна. Раскажыце аб убачаным у яго двары.
3. Ці справядлівыя, на ваш погляд, адрозненні ва ўмовах жыцця, адзенні і харчаванні паміж знатнымі егіпцянамі і простымі працаўнікамі? Што на гэтае пытанне маглі б адказаць самі жыхары Старажытнага Егіпта?
4. Якія каштоўнасці старажытнаегіпецкай сям'і не страцілі свайго значэння да нашых дзён?
5. Зрабіце вывад аб адносінах паміж людзьмі ў Старажытным Егіпце на аснове складзеных у іх грамадстве выслоўяў: «У несумленнага чалавека няма добрага выхавання», «Чалавек са сквапным сэрцам не дасягае мэты», «У таго, хто глухі да праўды, няма слыху».

## § 13. Рэлігія старажытных егіпцян

**Успомніце.** Калі і як узніклі рэлігійныя ўяўленні людзей у старажытнасці?

**1. Вераванні старажытных егіпцян.** Егіпцяне лічылі, што прыродай і жыццём людзей кіруюць багі. Таму яны пакланяліся вялікай колькасці багоў і багінь. Блакітнае неба для іх было багіняй *Нут*.



Правообладатель Народная асвета



Сям'я фараона ў сваім палацы

Яе ўяўлялі то ў выглядзе жанчыны, то ў выглядзе нябеснай каровы з зоркамі на целе.

Сонца — гэта, вядома ж, бог *Ра* ў залатой лодцы. Сімвалам гэтага бога быў жук скарабей. Бог Ра быў, бадай, самы шануемы ў Старажытным Егіпце. У яго было не адно, а некалькі імёнаў (Амон-Ра, Хнум-Ра і іншыя). Бога Ра можна лічыць агульным для ўсіх егіпцян. І наўрад ці магло быць па-іншаму. Бо ад сонца зыходзяць святло і цяпло. Ра даруе жыццё людзям, жывёлам, раслінам.

Для пакланення багам і памінання фараонаў у Старажытным Егіпце ўзводзіліся ***хра́мы***. Егіпцяне будавалі іх з каменю. Уздоўж дарогі, якая вяла да храмавых варот, часта ўстанаўлівалі статуі



Правообладатель Народная асвета

*сфінксаў* — фантастычных істот з целам ільва і галавой чалавека. Вялікасныя калоны ўпрыгожваліся кветкавым арнаментам і пазалотай. Часцей за ўсё яны нагадвалі звязку сцяблоў папірусу або лотасу.

Важнейшым месцам храма было свяцілішча. Тут знаходзіліся каменныя статуі багоў. Перад імі — столікі для ахвярапрынашэнняў. На іх складвалі падарункі багам: кветкі, агародніну, гусей, цялят. Фараоны даравалі храмам землі, золата, каштоўнасці.

Усё ўнушала свяшчэнны страх і заміранне перад абліччам багоў унутры і вакол храма.

**2. Пакланенне богу Асірысу.** Было нямала прыродных з'яў, якія выклікалі ў егіпцян невытлумачальны жах. Асабліва страшнай і варожай ім здавалася пустыня Сахара. Адтуль дзьмулі абпальваючыя пясчаныя вятры-сухавеі, качавыя плямёны рабілі набегі на мірных земляробаў. Грозную пустыню егіпцяне ўяўлялі ў выглядзе злога бога *Сета*, які забіў свайго роднага брата *Асірыса* — бога прыроды і раслін.

Пасля засушлівых вятроў-сухавеяў прырода зноў адраджалася. Егіпцяне лічылі, што разам з ёй ажывае і забіты Асірыс. Жыхары Старажытнага Егіпта шырока і ўрачыста адзначалі свята адраджэння бога Асірыса — земляробчае свята ўрадлівасці.



Суд бога Асірыса



Правообладатель Народная асвета

**3. Вера ў замагільнае жыццё.** Егіпцяне верылі ў замагільнае жыццё. Верылі ў тое, што душа памерлага трапіць у падземнае царства. Там на троне сядзіць бог Асірыс і вяршыць свой справядлівы суд. Ён правярае, ці быў памерлы пры жыцці добрым і праведным чалавекам, ці тварыў зло. Праведнікі пакідаюцца ў царстве Асірыса, дзе спее збожжа на палях і ўволю чыстай халаднаватай вады. Грэшнікаў пажырае страшная пачвара з целам льва і пасткай кракадзіла.

Каб захаваць бессмяротнасць і шчаслівае знаходжанне ў царстве нябожчыкаў, цела памерлага чалавека бальзаміравалі. Для гэтага існавала даволі складаная працэдура. Цела вытрымлівалі ў спецыяльным растворы. Затым прапітвалі бальзамам, смоламі, пахучымі рэчывамі і абмотвалі льнянымі тканінамі. На твар памерлага клалі маску, якая нагадвала нябожчыка. Так атрымлівалася *мумія* — нятленнае мёртвае цела. Мумію ўкладвалі ў размаляваную труну — саркафаг, зроблены ў выглядзе чалавечага цела. Саркафаг хавалі ў грабніцы. Толькі цяпер, як лічылі егіпцяне, памерлы быў гатовы да вечнага жыцця.

**4. Абагаўленне жывёл.** Старажытныя егіпцяне абагаўлялі свяшчэнных жывёл. Асабліва шанавалі яны багіню-кошку *Бастэт*. І ў гэтым не было нічога дзіўнага. Бо кошка была адной з самых карысных жывёл. Яна знішчала мышэй і ахоўвала гэтым ураджай.

Егіпцяне верылі, што кракадзіл у водах Ніла — гэта бог *Сабек*. Калі неасцярожнага чалавека з'ядаў кракадзіл, то людзі лічылі, што бог аказаў гэтаму няшчаснаму асаблівую ласку.

Многія багі на сценах грабніц і храмаў ствараліся з чалавечым целам і галовамі розных жывёл. Грозную багіню вайны высякалі ў выглядзе жанчыны з галавой ільвіцы. Бога мудрасці і пісьма *Тота* — у выглядзе чалавека з галавой ібіса — птушкі, падобнай да жураўля.



Багіня Бастэт



Правообладатель Народная асвета

**5. Абагаўленне Ніла.** З асаблівай павагай адносіліся старажытныя егіпцяне да ракі Ніл. У перыяд спрыяльных разліваў раку называлі *Хапі* і пакланяліся ёй, як богу. У гонар Хапі складаліся малітвы і гімны. Вось адзін з такіх гімнаў, высечаны на каменнай пліце. Паводле загаду фараона пліта была ўстаноўлена на беразе Ніла.

Слава табе, Хапі!
Ты прыйшоў на гэтую зямлю,
З'явіўся, каб ажывіць Егіпет,
І зямля табе рада!

*Такім чынам, у жыхароў Старажытнага Егіпта існавала складаная рэлігія. Егіпцяне пакланяліся мноству багоў і верылі ў замагільнае жыццё. У гонар багоў узводзіліся велічныя храмы. Некаторыя з іх часткова захаваліся да нашых дзён.*

1. Назавіце найбольш шанаваных багоў Старажытнага Егіпта.
2. Чаму жыхары Старажытнага Егіпта пакланяліся богу Асірысу і богу Хапі з асаблівай стараннасцю?
3. З якімі мэтамі будаваліся егіпецкія храмы? Апішыце словамі знешні і ўнутраны выгляд свяцілішча.
4. Растлумачце, для чаго ў Старажытным Егіпце захоўвалі целы памерлых.
5. Вызначце падабенства паміж вераваннямі старажытных егіпцян і першабытных людзей. З чым звязана разнастайнасць шануемых жывёл у Егіпце?
6*. Паразважайце, ці мог міф аб Асірысе з'явіцца ў першабытны час. Сваё меркаванне растлумачце.

## § 14. Культура старажытных егіпцян

**Успомніце.** Калі ўзнікла першабытнае мастацтва?

**1. Мова і пісьменнасць.** Даўным-даўно ўжо няма мовы, якая гучала на берагах старажытнага Ніла. Жыхары сучаснага Егіпта размаўляюць на арабскай мове. Затое са старажытных часоў да нас дайшлі шматлікія помнікі культуры Старажытнага Егіпта — статуі,



Народная асвета

Правообладатель Народная асвета



Старажытнаегіпецкі іерагліфічны надпіс на камені



Старажытнаегіпецкі малюнак і іерагліфічны надпіс на папірусе

абеліскі, руіны храмаў, грабніцы. На іх захаваліся пісьмовыя знакі на старажытнаегіпецкай мове. Людзей, якія маглі б прачытаць іх, ужо даўно не існуе. І толькі ў XIX стагоддзі французскі вучоны Ж.-Ф. Шампальён змог расшыфраваць гэтыя старажытныя надпісы. Яны і паведамілі нам аб гісторыі і культуры Старажытнага Егіпта.

Старажытныя егіпцяне пісалі завостранымі палачкамі на спецыяльным матэрыяле — ***папірусе***. Вытворчасць папірусу патрабавала вялікіх намаганняў і часу. Расходавалі яго эканомна. Для зручнасці доўгія стужкі папірусу згортвалі ў скруткі. У многіх еўрапейскіх мовах слова «папера» паходзіць ад слова «папірус». Напрыклад, «папера» ў беларускай мове або «paper» у англійскай.

Вынаходніцтва пісьменнасці было важнейшым культурным дасягненнем гэтай дзіўнай краіны.

**2. Як і чаму вучылі дзяцей у школе.** У старажытнаегіпецкіх школах вучыліся, як правіла, хлопчыкі. Але школу маглі наведваць і дзяўчынкі. Дзеці навучаліся пісьму, чытанню і лічэнню.

Пісаць вучыліся на чарапках разбітага посуду і толькі затым — на старым папірусе, папярэдне змыўшы раней напісаныя значкі, або ***іеро́гліфы*** (свяшчэннае пісьмо). Новы папірус давалі толькі тым вучням, хто паспяхова вучыўся. У школе дзеці чыталі павучальныя тэксты, вершы і казкі.



Правообладатель Народная асвета

Навучанне было вельмі цяжкім. Ад вучняў патрабавалася завучыць сотні і нават тысячы значкоў. Нядбайных дзяцей каралі плёткай. Невыпадкова ўзнікла прымаўка: «Вуха хлопчыка — на яго спіне».

Да нашых дзён захаваўся папірус, на якім запісана, як бацька павучае свайго сына. Ён пераконвае хлопчыка не ленавацца і добра вучыцца, каб стаць пісцом. Бо чыноўнікам, як вы ўжо ведаеце, жылося нашмат лепш, чым рамеснікам або земляробам.

**3. Мастацтва Старажытнага Егіпта.** Велічныя егіпецкія храмы, царскія палацы ўражвалі сваімі памерамі. Сцены палацаў былі распісаны яркімі фарбамі. Жывапіс з'яўляецца выдатнай з'явай старажытнаегіпецкага мастацтва. Ён добра захаваўся на сценах грабніц. Унутранае ўбранства храмаў абавязкова дапаўнялі скульптуры, часцей за ўсё вялікія скульптуры фараонаў. Рэльефы, побач з роспісам грабніц, адлюстроўвалі ўсе бакі жыцця старажытных егіпцян.



Разваліны храма на тэрыторыі старажытных Фіў



Правообладатель Народная асвета

**4. Навуковыя веды.** Веды старажытных егіпцян аб навакольным свеце развіваліся на аснове іх практычнай дзейнасці і былі звязаны, у першую чаргу, з земляробствам.

З незапамятных часоў жрацы вялі назіранні за зорным небам. Яны не маглі не заўважыць, што вада ў Ніле прыбывае менавіта ў той перыяд года, калі на небе з'яўляецца зорка Сірыус. Яе з'яўленне лічылася пачаткам новага года. Егіпцянамі быў створаны каляндар. Егіпецкі каляндар складаўся з 365 дзён. З такой жа колькасці дзён складаецца і наш сучасны гадавы каляндар, у аснову якога пакладзены рух Зямлі вакол Сонца.

Такім чынам, земляробства дало штуршок для развіцця *астраноміі* — навукі, якая вывучае зоркі, планеты і іншыя нябесныя свяцілы. Назіраючы за зоркамі, егіпецкія жрацы выкарысталі гадзіннік. Спачатку сонечны, а затым вадзяны. У сонечным гадзінніку час вызначаўся паводле руху ценю. У вадзяным гадзінніку лічэнне часу вялося па-іншаму. Лічылася, колькі вады вылілася з сасуда з маленькай адтулінай, столькі і часу «ўцякло».

**5. Медыцына.** Вялікіх поспехаў старажытныя егіпцяне дасягнулі ў галіне медыцыны. Бальзаміруючы памерлых людзей, яны добра вывучылі ўнутраныя органы і будову чалавечага цела. Праўда, прычынай хваробы лічыліся злыя духі. Таму хворых лячылі не толькі лякарствамі, але і малітвамі, заклінаннямі.

У час раскопак у Егіпце вучоныя-археолагі знайшлі шмат медыцынскіх інструментаў. Былі выяўлены таксама папірусы з апісаннем хвароб і рэцэптамі. Відавочна, гэта былі першыя кнігі па медыцыне.

**6. Матэматыка.** Дзякуючы працоўнай дзейнасці ўзнікла матэматыка. Уявіце сабе! Рамеснік павінен быў ведаць, колькі частак волава з меддзю трэба ўзяць, каб выплавіць бронзу. Царскі пісар падлічваў, якіх памераў сялянскае поле і колькі ўраджаю з яго можна атрымаць. Архітэктар разлічваў, колькі рабочых і колькі камянёў яму спатрэбіцца для будаўніцтва піраміды або храма.



Правообладатель Народная асвета

*Такім чынам, старажытныя егіпцяне назапасілі вялікія веды ў медыцыне, матэматыцы, астраноміі, стварылі іерагліфічнае пісьмо і навучыліся вырабляць папірус.*

1. Якое вынаходніцтва з'яўляецца важнейшым культурным дасягненнем Старажытнага Егіпта?
2. На чым пісалі егіпцяне?
3. Як вы разумееце прымаўку «Вуха хлопчыка — на яго спіне»? Чым былі выкліканы цяжкасці навучання ў старажытнаегіпецкай школе?
4. Што спрыяла развіццю медыцынскіх ведаў, матэматыкі і астраноміі ў Старажытным Егіпце?
5. Якія культурныя дасягненні егіпцян прымяняюцца да гэтага часу?

6*. Пачніце запаўненне параўнальнай табліцы «Развіццё культуры ў краінах Старажытнага Усходу».

| Краіны | Навуковыя адкрыцці | Пісьменнасць | Мастацтва |
|---|---|---|---|
| Егіпет | | | |
| Месапатамія | | | |
| Хецкая дзяржава | | | |
| Іран | | | |
| Фінікія | | | |
| Палесціна | | | |
| Індыя | | | |
| Кітай | | | |

## Для дапытлівых

### Егіпецкая школа

Малодшым школьнікам для практыкаванняў у пісьме выдавалі разлінееныя гліняныя чарапкі або плоскія каменныя дошчачкі. Каштоўны папірус атрымлівалі толькі вучні старшых класаў. Кожны вучань рыхтаваў чарніла чорнага і чырвонага колераў. Асноўны тэкст пісалі чорным колерам, а чырвоным — загалоўкі і першыя радкі.



Правообладатель Народная асвета

Музыцы, плаванню, скачкам, бегу, замежнай мове будучых вайскоўцаў і паслоў у другія краіны вучылі ў вышэйшых школах. У іх навучэнцы абавязаны былі хутка адказваць на такія пытанні: колькі трэба цэглы для будоўлі пляцоўкі пэўных памераў? Як паставіць на падмурак вялікую скульптуру? Колькі трэба работнікаў для перавозкі калоны пэўнай даўжыні і вагі?



Навучанне ў старажытнаегіпецкай школе

**Пытанні да дакумента.** Якім прадметам у старажытнаегіпецкай школе ўдзялялі асаблівую ўвагу? Чаму?

## Неферціці

Царыца Неферціці — жонка і памочніца фараона Эхнатона. Легенды расказваюць, што ніколі раней Егіпет не нараджаў такой прыгажуні. Яе называлі «Дасканалая». Выява Неферціці ўпрыгожвала храмы па ўсёй краіне. Падчас раскопак у 1912 годзе ў Егіпце германскім археолагам быў знойдзены знакаміты бюст Неферціці. Цяпер ён захоўваецца ў зборы Егіпецкага музея ў Берліне. Скульптурная выява царыцы лічыцца шэдэўрам старажытнаегіпецкага мастацтва. Майстру ўдалося перадаць неверагодную прыгажосць і вытанчанасць жаночага твару.



Неферціці

**Пытанні да дакумента.** Ці можна скульптурную выяву царыцы Неферціці аднесці да шэдэўраў сусветнага мастацтва? Чаму?



Правообладатель Народная асвета

## Абагульненне да главы «Старажытны Егіпет»

Вывучаючы гісторыю Старажытнага Егіпта, вы дакрануліся да грамадства больш высокага ўзроўню развіцця, чым першабытнае. У ім з'явіліся гарады і пісьменнасць, дзяржава, грандыёзныя збудаванні і высокі ўзровень земляробства.

Вучоныя выявілі, што першыя цывілізацыі ўзніклі каля 5 тысяч гадоў таму ва ўрадлівых далінах вялікіх рэк. Адной з такіх цывілізацый з'яўляецца Старажытны Егіпет. Дзякуючы разлівам Ніла, які прыносіў урадлівы глей, і стараннай працы земляробаў квітнела жыццё ўсёй дзяржавы.

На чале старажытнаегіпецкай дзяржавы стаяў фараон. Апорай яго ўлады былі багатыя і бедныя. Першым правіцелем аб'яднанага Егіпта стаў Міна. Пры Тутмосе III Старажытны Егіпет ператварыўся ў моцную дзяржаву, куды бясконцым патокам сцякаліся багацці і рабы.

Старажытныя егіпцяне ўшаноўвалі больш за 2000 багоў. Самым галоўным з іх лічыўся Амон, або Амон-Ра. Абагаўляліся розныя жывёлы. Свяшчэннымі лічыліся кошка і кракадзіл.

У наш час культурная і гістарычная спадчына Старажытнага Егіпта ўяўляе вялікую гістарычную каштоўнасць і знаходзіцца пад аховай.

1. «Чорная зямля» — так называлі сваю краіну старажытныя егіпцяне. Чаму?
2. Калі ў даліне Ніла ўтварыліся дзве вялікія дзяржавы? Пад уладай якой з іх адбылося аб'яднанне Егіпта ў адну дзяржаву? (Пры адказе выкарыстайце карту.)
3. З якой мэтай фараоны вялі войны? Пакажыце на карце напрамкі іх заваёўніцкіх паходаў. Падумайце, каму ў першую чаргу захопнікі падносілі багатыя дары.
4. Растлумачце, чаму мы ведаем пра жыццё фараонаў і знатных людзей нашмат больш, чым пра жыццё простых людзей.
5. Начарціце стужку часу і праверце па ёй, як вы запомнілі даты асноўных падзей гісторыі Старажытнага Егіпта.

6*. Дапоўніце сказ «Дэльта Ніла стала радзімай адной са старажытнейшых цывілізацый у свеце, паколькі …».



Правообладатель Народная асвета

Глава 2. **ПЯРЭДНЯЯ АЗІЯ Ў СТАРАЖЫТНАСЦІ**

# § 15. Паміж Тыграм і Еўфратам

**Успомніце.** Што такое арашаемае земляробства і якую ролю яно адыгрывала ў жыцці старажытных егіпцян?

**1. Прыродныя ўмовы.** На паўночны ўсход ад Егіпта размешчана Пярэдняя Азія. Так называюць заходнюю частку Азіі, якая мяжуе з Міжземным і Чорным морамі. Тут нясуць свае воды рэкі *Тыгр* і *Еўфрат*, якія бяруць пачатак у гарах на поўдні ад Каўказа і ўпадаюць у *Персідскі заліў*. У сярэднім і ніжнім цячэннях гэтых рэк размешчана старажытная краіна *Месапатамія*, што ў перакладзе азначае *Міжрэчча*.




Карта Старажытнай Месапатаміі



Правообладатель Народная асвета



Рака Еўфрат. *Сучасны выгляд*

Дажджы ў Міжрэччы выпадалі рэдка, але калі ішоў дождж, то сапраўдны лівень. Асноўнай жа крыніцай вільгаці, а значыць і жыцця, былі дзве вялікія ракі. Тыгр і Еўфрат разліваліся ад вясенняга раставання снягоў у гарах Каўказа. З-за гэтага часта адбываліся паводкі. Калі ж лета было вельмі гарачым і сухім, то лютавалі пясчаныя буры.

Воды рэк шчодра арашалі палі і рабілі іх урадлівымі. Ужо ў лютым тут пачыналі зелянець лугі. Урадлівая зямля рачных далін давала багатыя ўраджаі і была асноўным багаццем Міжрэчча. Нярэдка за год удавалася збіраць не адзін, а два ўраджаі.

Сваіх металаў, драўніны і будаўнічага каменю ў Месапатаміі амаль не было. Іх завозілі з-за межаў Міжрэчча. Затое ў дастатку было гліны і чароту. Менавіта яны і былі галоўным матэрыялам для мясцовых будаўнікоў і рамеснікаў. Нават пісаць жыхары Месапатаміі навучыліся якраз на гліне.

Прырода не заўсёды спрыяла жыхарам Месапатаміі. Часам рэкі разліваліся больш звычайнага. Затапленні і пясчаныя буры губілі ўсё жывое. Ад гэтых бедстваў трэба было ўмець засцерагацца.



Правообладатель Народная асвета

**2. Земляробства і жывёлагадоўля.** Асваенне Месапатаміі земляробамі вельмі нагадвае асваенне Старажытнага Егіпта. Людзі прыйшлі ў Міжрэчча ў пятым тысячагоддзі да н. э. Ім нялёгка было асвойваць новыя землі. На берагах рэк прыйшлося высякаць кусты, будаваць каналы і дамбы. Каб лепш выкарыстоўваць ваду,



Сцэны земляробчых работ

мясцовыя жыхары, як і егіпцяне, рабілі вадасховішчы. У іх вада надоўга затрымлівалася пасля разліваў, і яе можна было выкарыстоўваць для арашэння палёў. Акрамя таго, вадасховішчы і дамбы захоўвалі пасевы і паселішчы ад патопу.

Большасць насельніцтва Міжрэчча было занята земляробствам. Людзі сеялі ячмень, пшаніцу, проса, вырошчвалі лён і кунжут (другая назва — сезам. Яго насенне выкарыстоўваюць для вырабу алеяў). Зямлю апрацоўвалі матыкамі, а потым і з дапамогай плуга. Асаблівая ўвага надавалася садаводству. Яго значэнне толькі нямногім саступала вырошчванню збожжавых. Найбольш распаўсюджанай садовай раслінай была фінікавая пальма. Фінікі служылі звычайнай ежай, з іх соку рабілі напіткі, размочанымі костачкамі кармілі жывёлу, лісце ішло на пляценне, кара служыла матэрыялам для вырабу вяровак і пражы. Былі вядомыя таксама смакоўніца, гранатавае дрэва, вінаград. Людзі вырошчвалі гарох, бабы, цыбулю, салату, кроп, рэпу, буракі, радыску, агуркі. У садах раслі ружы і лілеі.

У Месапатаміі была добра развіта жывёлагадоўля. Буйную рагатую жывёлу выкарыстоўвалі пры ворыве, малацьбе і для перавозкі грузаў. Незаменнай верхавой і цяглавой жывёлай з'яўляўся асёл. Людзі разводзілі коз, авечак і свіней, а таксама свойскіх птушак— курэй, гусей, паўлінаў і галубоў.

*Такім чынам, жыццё ў Старажытным Міжрэччы было сканцэнтравана ва ўрадлівых далінах Тыгра і Еўфрата. Асноўнымі заняткамі насельніцтва з'яўляліся земляробства і жывёлагадоўля.*



Правообладатель Народная асвета

1. Пакажыце на карце і апішыце словамі месцазнаходжанне Месапатаміі.
2. Параўнайце прыродныя ўмовы Егіпта і Месапатаміі. Што ў іх агульнае? Ці ёсць адрозненні? Растлумачце, чаму ў Егіпце рака Ніл лічылася добрым богам, а ў Месапатаміі абедзве ракі (асабліва Тыгр) — злымі багамі.
3. Што ў занятках жыхароў Старажытнага Міжрэчча егіпцяніну здалося б знаёмым? Які карысны выкапень і ў сувязі з чым тут асабліва цанілі будаўнікі і рамеснікі?
4. Складзіце пералік прадуктаў, якія выраблялі і ўжывалі ў ежу старажытныя жыхары Месапатаміі. Якія з іх з'яўляюцца незаменнымі ў наш час?
5. Абазначце на стужцы часу пачатак асваення Міжрэчча старажытнымі земляробамі. Колькі гадоў таму гэта адбылося?

6*. Назавіце асноўнае багацце Месапатаміі. Калі людзі змаглі яго выявіць і выкарыстаць?

## Для дапытлівых

### Прырода Паўднёвай Месапатаміі (паводле Герадота)

Дажджоў у гэтай зямлі выпадае мала, але і гэтых нязначных дажджоў дастаткова для першапачатковага сілкавання і росту каранёў злакаў. Пры гэтым пасевы арашаюцца з рэк, спеюць, і злак расце. Сама рака, аднак, тут не залівае палі, як у Егіпце, таму арашэнне праводзіцца ўручную водачарпальнымі прыстасаваннямі. Уся Паўднёвая Месапатамія, падобна Егіпту, перарэзана каналамі. Самы вялікі з гэтых каналаў суднаходны; у паўднёва-ўсходнім напрамку ён цячэ з Еўфрата ў другую раку — Тыгр. З усіх краін на свеце, наколькі я ведаю, гэтая зямля дае, бясспрэчна, самыя лепшыя плады. Лісце пшаніцы і ячменю дасягае там цэлых чатырох пальцаў у шырыню. Што проса і сезам бываюць там вышынёй з дрэва, мне добра вядома, але я не стану расказваць аб гэтым. Я ведаю, наколькі вялікі недавер сустрэне мой расказ аб урадлівасці хлебных злакаў.

**Пытанні да дакумента.** Што ў прыродзе Паўднёвай Месапатаміі здзівіла старажытнагрэчаскага гісторыка Герадота? Які вывад можна зрабіць аб узроўні развіцця земляробства ў гэтай краіне ў старажытнасці?



Правообладатель Народная асвета

## § 16. Станаўленне дзяржавы ў Месапатаміі

**Успомніце.** Што спрыяла ўзнікненню дзяржавы ў Старажытным Егіпце?

**1. Рамёствы і гандаль.** У Месапатаміі былі спрыяльныя ўмовы для развіцця рамёстваў. Рамеснікі выкарыстоўвалі мясцовыя матэрыялы: гліну, трыснёг, воўну, лён, скуру. Ужо ў пятым тысячагоддзі да н. э. месапатамскія ганчары выраблялі посуд на заказ.



Рамесныя заняткі ў Месапатаміі

На ўвесь Старажытны свет славіліся і ткачы Міжрэчча. Мясцовыя каменярэзы выраблялі з асобага мінералу — *алебастру* — вазы, чашы, кубкі. Медзь, волава, серабро, золата, а з канца другога тысячагоддзя да н. э. і жалеза ўвозілі з другіх краін.

У Месапатаміі быў добра развіты гандаль. Па рэках гэтай краіны перавозілі збожжа, воўну, шкуры і алеі. Гэтыя прадукты і вырабы становіліся таварамі. *Тавар* — прадукт працы, выраблены для продажу або абмену. У гэты ж час склаліся і важнейшыя гандлёвыя шляхі.

Жыхары Месапатаміі таксама вялі гандаль, і сухапутны і марскі, з суседнімі краінамі. Важнейшымі для Міжрэчча былі гандлёвыя шляхі, пракладзеныя на захад, да ўзбярэжжа Міжземнага мора. Па іх увозілі металы і драўніну.

**2. Узнікненне гарадоў-дзяржаў.** У канцы чацвёртага тысячагоддзя да н. э. развіццё земляробства, рамяства і гандлю прывяло да ўзнікнення гарадоў у Месапатаміі. Кожнае племя ў Міжрэччы мела свой горад, у цэнтры якога знаходзіўся храм. Горадам і прылеглай да яго тэрыторыяй кіравалі жрацы і знаць. Таму ім належалі лепшыя палі і сады.



Правообладатель Народная асвета

Жыццёва важнае значэнне для жыхароў Міжрэчча мелі арашэнне і ахова паселішчаў ад паводкі. Толькі дзякуючы спецыяльным ведам і намаганням многіх людзей можна было справіцца са стыхійнымі разлівамі. Ведамі валодалі жрацы, людзьмі кіравала знаць.

У Міжрэччы не склалася вялікіх племянных саюзаў і царстваў. Замест іх у канцы чацвёртага тысячагоддзя да н. э. узнікла каля дзясятка гарадоў-дзяржаў — невялікіх тэрыторый з горадам у цэнтры. Першыя ***гарады́-дзяржа́вы*** стварылі *шумеры*.

**3. Шумер і Акад.** Шумеры жылі ў балоцістай, затое вельмі ўрадлівай даліне Паўднёвай Месапатаміі. У чацвёртым тысячагоддзі да н. э. яны асвоілі медзь, а затым сталі атрымліваць бронзу. Буйнейшым горадам-дзяржавай Месапатаміі таго часу быў *Урук*. Нямногім уступалі яму *Ур*, *Кіш* і *Лагаш*. У кожным горадзе было некалькі тысяч жыхароў, тут збіраліся народныя сходы, праводзіліся ахвярапрынашэнні багам, засядалі саветы знаці.

Важную ролю ў жыцці горада адыгрывалі жрацы і правіцель. У Шумеры яго называлі «вялікім чалавекам». Для яго ўзводзіўся палац, яму аддавалася асобая пашана.



Ваенная здабыча шумерскіх правіцеляў



Правообладатель Народная асвета

У паўночных суседзяў шумераў — *акадцаў* — склалася сваё царства. Сталіца царства называлася *Акад*. У **XXIV стагоддзі да н. э.** царом у Акадзе стаў ***Саргон***. Ён стварыў першую ў гісторыі пастаянную армію з прафесіянальных лучнікаў і пешых воінаў. Моцная акадская армія хутка заваявала Шумер. Войска Саргона паспяхова ваявала і на захадзе Еўфрата. У выніку правіцель аб'яднаў розныя землі ў адной дзяржаве. Гэта дазволіла акадскім гандлярам свабодна ўвозіць у Месапатамію металы. Магутнасць Акада захавалася і тады, калі краінай кіравалі сыны і ўнукі Саргона.



Саргон Акадскі

*Такім чынам, у канцы чацвёртага тысячагоддзя да н. э. у Міжрэччы ўзніклі гарады-дзяржавы, якімі кіравалі жрацы і племянная знаць. Галоўную ролю ў станаўленні і развіцці дзяржавы ў Месапатаміі адыгралі шумеры і акадцы.*

?

1. Калі месапатамскія ганчары сталі рабіць посуд на заказ? Як называўся прадукт працы, выраблены для продажу і абмену?
2. Якія тавары ўвозіліся ў Старажытнае Міжрэчча і вывозіліся з яго?
3. Што прывяло да ўзнікнення гарадоў у Месапатаміі? Як вы зразумелі, што такое горад-дзяржава?
4. Палічыце, колькі гадоў (стагоддзяў) таму ў Міжрэччы ўзніклі першыя гарады-дзяржавы. Якія з іх былі найбольш буйнымі? Знайдзіце іх на карце.
5. Якімі ведамі павінны былі валодаць шумеры, каб ператварыць урадлівую, але балоцістую даліну Паўднёвай Месапатаміі ў квітнеючы край?
6. Як вы лічыце, акадскі цар Саргон аб'яднальнік ці заваёўнік? Сваё меркаванне растлумачце.

7*. Абгрунтуйце вывад аб тым, што галоўную ролю ў станаўленні і развіцці дзяржавы ў Месапатаміі адыгралі шумеры і акадцы.



Правообладатель Народная асвета

# § 17. Дзяржава Хамурапі

**Успомніце.** Якія гарады-дзяржавы існавалі на тэрыторыі Месапатаміі? Пакажыце іх на карце.

**1. Уварванне качэўнікаў.** У канцы трэцяга тысячагоддзя да н. э. у Месапатаміі пачалася засуха. Людзі не паспявалі аднаўляць арашальныя сістэмы пасля пясчаных бур. Палі давалі менш ураджаю. Гарады-дзяржавы паступова прыходзілі ў заняпад і слабелі.

У гэты час з поўначы ў Месапатамію ўварваліся ваяўнічыя качэўнікі — *амарэі*. Яны перасяліліся на захопленыя землі разам з сем'ямі і статкамі. Хутка ім удалося падпарадкаваць сабе большасць гарадоў-дзяржаў Месапатаміі. Правадыры заваёўнікаў сталі тут царамі. Але яны захавалі ўладу мясцовых жрацоў і знаці.

Спачатку качэўнікі пасвілі свой статак на палях земляробаў. Але паступова прышэльцы зразумелі перавагу арашальнага земляробства. Тады яны сталі дапамагаць мясцовым жыхарам. Таму хутка качэўнікі і земляробы змяшаліся і сталі адзіным насельніцтвам гарадоў-дзяржаў.

Адно з плямён качэўнікаў пабудавала ў XIX стагоддзі да н. э. свой уласны горад — ***Вавілон***. Назва горада перакладаецца «Ва-



Горад у Старажытнай Месапатаміі. *Рэканструкцыя*



Правообладатель Народная асвета

роты бога». Паводле назвы горада мы называем жыхароў гэтай краіны *вавілонянамі*.

**2. Стварэнне дзяржавы Хамурапі.** Горад Вавілон займаў вельмі выгаднае геаграфічнае становішча. Тут Тыгр і Еўфрат бліжэй за ўсё падыходзілі адзін да аднаго. Гэта дало магчымасць царам Вавілона кантраляваць абедзве ракі. У гэтых месцах праходзілі важнейшыя сухапутныя і рачныя гандлёвыя шляхі Пярэдняй Азіі. Гандаль памнажаў багацці горада. Пасля таго як засуха ў Месапатаміі закончылася, ўрадлівыя землі рачных далін зноў сталі даваць багаты ўраджай.




Устройства грамадства: «піраміда» ўлады ў дзяржавах Месапатаміі

Самым знакамітым царом Вавілона быў ***Хамурапі***, які кіраваў у **1792—1750 гадах да н. э.** Спачатку пад яго ўладай быў толькі Вавілон. Хамурапі накіраваў сваю дзейнасць на стварэнне моцнай, добра ўзброенай і абучанай арміі. Далей цар пачаў падпарадкоўваць сабе суседнія гарады-дзяржавы. Больш за 20 гадоў вавілонская армія вяла з суседзямі бесперапынныя войны, у выніку якіх пад уладай цара аказалася ўся Месапатамія. У Месапатаміі ўтварылася магутная дзяржава — ***Вавілонія***.

**3. Праўленне Хамурапі.** Улада Хамурапі была вельмі моцнай. Усе жыхары краіны лічыліся яго падданымі. Цар мог адабраць усю



Правообладатель Народная асвета


Каменная стэла з законамі цара Хамурапі

маёмасць у любога чалавека або пакараць яго смерцю. Але правіцель Вавілона не лічыўся богам, як фараон.

Кіраваць дзяржавай цару, як і ў Егіпце, дапамагалі чыноўнікі. Іх галоўнымі задачамі былі збор падаткаў і набор у армію. Акрамя таго, яны павінны былі сачыць за насельніцтвам падначаленых гарадоў.

Хамурапі вельмі многа зрабіў для развіцця гаспадаркі. Паводле яго загаду прывялі ў парадак арашальныя каналы па ўсёй краіне. Былі праведзены работы па расчыстцы рэчышча Еўфрата, каб пазбегнуць паводак і палепшыць арашэнне зямель.

Для кіравання вялікай краінай неабходны былі добрыя дарогі. Хамурапі загадаў пабудаваць іх. Дарогі выкарыстоўваліся не толькі царскімі ганцамі, але і гандлярамі. З розных краін у Вавілон сталі прывозіць разнастайныя тавары. Цяпер у «Варотах бога» можна было пачуць мову амаль усіх народаў Пярэдняй Азіі.

Каб забяспечыць парадак, Хамурапі выдаў законы, абавязковыя для ўсіх жыхароў дзяржавы. Сам Хамурапі так вызначыў асноўную мэту сваіх законаў: «Каб моцны не прыгнятаў слабага, каб аказаць справядлівасць сіраце і ўдаве, каб прыгнечанаму аказаць справядлівасць». Тэкст законаў быў выбіты на глыбе базальту — трывалым, чорным камені. Гэты камень быў выстаўлены на галоўнай плошчы Вавілона. Цяпер любы чалавек, які ўмеў чытаць, мог азнаёміцца з тэкстам законаў.



Правообладатель Народная асвета

Законы Хамурапі захоўваліся ва ўсёй дзяржаве. Яны не страцілі сілу нават праз 1000 гадоў пасля смерці гэтага цара.

*Такім чынам, у XVIII стагоддзі да н. э. у Пярэдняй Азіі ўтварылася магутная дзяржава. Яе стваральнікам быў цар Хамурапі, магутны, мудры, але жорсткі правіцель.*

1. Калі і якім чынам узнік горад Вавілон?
2. Хто падпарадкаваў сабе гарады-дзяржавы Месапатаміі і стварыў магутную Вавілонскую дзяржаву?
3. Назавіце галоўнае адрозненне вавілонскага цара ад егіпецкага фараона.
4. Ці можна Хамурапі лічыць мудрым і таленавітым правіцелем? Сваё меркаванне пацвердзіце прыкладамі.
5. Падумайце, чаму законы Хамурапі не страцілі сілу нават праз 1000 гадоў пасля смерці самога Хамурапі.

**6*.** Што ў законах Хамурапі здаецца вам справядлівым і што несправядлівым? Прачытайце і падумайце.

## Для дапытлівых

### Артыкулы з законаў Хамурапі

Калі чалавек учыніў абрабаванне і быў злоўлены, то гэты чалавек павінен быць забіты.

Калі сын ударыў свайго бацьку, то яму павінны адсекчы руку.

Калі чалавек выкалаў вочы сыну чалавека, то павінны выкалаць яму вока.

Калі чалавек ударыў па шчацэ чалавека, вышэйшага па становішчы, чым ён сам, то ён павінен быць адсцёбаны валовым бічом 60 разоў.

Калі сын чалавека ўдарыў па шчацэ сына чалавека, роўнага яму, то ён павінен адважыць 1 міну серабра.

Калі раб чалавека ўдарыў па шчацэ сына чалавека, то яму павінны адрэзаць вуха.

**Пытанні да дакумента.** Растлумачце, чаму за адно і тое ж злачынства (глядзіце тры апошнія артыкулы) прадугледжаны розныя пакаранні.



Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

# § 18. Асірыя і Вавілонія

**Успомніце.** Якім чынам Хамурапі ўмацоўваў сваю дзяржаву?

**1. Узвышэнне Асірыі.** На поўначы Месапатаміі ўрадлівыя раўніны змяняліся гарамі. Тут не было зямель, якія прыносілі б высокія ўраджаі. Але і стыхійныя разлівы бурнага Тыгра, ад якіх пакутавалі вавілоняне, амаль не турбавалі мясцовых жыхароў.

У пачатку другога тысячагоддзя да н. э. у верхнім цячэнні Тыгра ўзнік горад-дзяржава *Ашур*. Яго жыхароў прынята называць асірыйцамі, а землі паўночна-ўсходняга Міжрэчча — ***Асірыяй***. Асірыйцы былі ўмелымі жывёлаводамі, разводзілі коз і авечак. Добра знаёмы гэтыя людзі былі і з земляробствам.

Асірыйцы былі нешматлікім, але вельмі ваяўнічым і гордым народам. Нават магутны Хамурапі з вялікай цяжкасцю змог падпарадкаваць сабе іх уладанні. Паступова асірыйцам удалося вызваліцца ад улады іншаземцаў.



Асірыйскія каляснічыя



Правообладатель Народная асвета

У канцы другога тысячагоддзя да н. э. асірыйскія кавалі навучыліся рабіць зброю з жалеза. Жалезная зброя і жорсткая дысцыпліна дазволілі асірыйскім царам стварыць моцную армію. Акрамя таго, асірыйцы вынайшлі сядло і авалодалі верхавой яздой. З узброеных коннікаў была створана грозная ваенная сіла — конніца. З дасканаласцю асірыйская армія авалодала майстэрствам асады і ўзяцця самых умацаваных гарадоў таго часу.

**2. Роскві́т і гібель Асірыі.** У VIII стагоддзі да н. э. асірыйская армія атрымала свае першыя вялікія перамогі. Асірыйскія цары вельмі жорстка расправіліся са сваімі праціўнікамі, што наводзіла жах на суседнія народы. Адна за другой краіны Пярэдняй Азіі скарыліся асірыйскім царам. У выніку да канца стагоддзя Асірыя стала вялікай дзяржавай ад Егіпта да Ірана.

Новай сталіцай дзяржавы стаў горад ***Ніневія***. Тут, у вялікім палацы, жылі асірыйскія цары — магутныя і вельмі жорсткія правіцелі. Многія гарады Пярэдняй Азіі былі разбураны паводле іх загаду. Пацярпеў і Вавілон. У пачатку VII стагоддзя да н. э. «Вароты бога» былі разбураны і затоплены водамі Еўфрата. Толькі праз 10 гадоў вавілоняне змаглі пачаць аднаўленне роднага горада.

Пакораныя народы не хацелі заставацца пад уладай жорсткіх асірыйцаў. У **612 годзе да н. э.** вавілоняне і іх саюзнікі паўсталі і захапілі Ніневію. Горад быў знішчаны. Хутка ў баі загінуў апошні асірыйскі цар. Асірыйскай дзяржавы не стала.

**3. Дзяржава Навухаданосара.** Адноўлены Вавілон зноў стаў сталіцай Міжрэчча. У канцы VII стагоддзя да н. э. царом Вавілона стаў ***Навухаданосар***. Ён быў таленавітым правіцелем і падпарадкаваў сабе амаль усе былыя ўладанні Асірыі. Пасля гэтага, у знак магутнасці і велічы Вавілона, Навухаданосар загадаў перабудаваць самы вялікі храм у горадзе. Цяпер ён стаў яшчэ большым. Гэты храм лічыўся домам бога Мардука — заступніка Вавілона. Ён увайшоў у гісторыю пад назвай *«Вавілонская вежа»*.



Правообладатель Народная асвета

Пры Навуханосары Вавілон стаў буйнейшым і прыгажэйшым горадам свету. Паводле загаду цара горад акружылі высокімі і магутнымі каменнымі сценамі. Па такой сцяне магла праехаць калясніца.

Вакол сталіцы па равах і каналах былі пушчаны воды Еўфрата. Праз равы і каналы да варот горада ішлі асобыя масты. У выпадку нападзення ворагаў гэтыя масты разбіралі, што зрабіла Вавілон непрыступнай крэпасцю.

Навуханосар правіў 44 гады. Пасля яго дзяржава паступова аслабела і трапіла пад уладу іншаземцаў.

*Такім чынам, у VIII—VII стагоддзях да н. э. Месапатамію ненадоўга падпарадкавала ваяўнічая Асірыя. Але ўжо ў канцы VII стагоддзя да н. э. пакораныя народы скінулі ўладу Асірыі. Царом Вавілона стаў Навуханосар, пры якім Вавілонія ў апошні раз дасягнула піка сваёй магутнасці.*

1. Якія новаўвядзенні дазволілі асірыйцам стварыць грозную і моцную армію?
2. Калі Асірыя стала вялікай дзяржавай?
3. Чаму «жалезнае» Асірыйскае царства аказалася недаўгавечным? Калі і хто разбурыў яго сталіцу?
4. Што сабой уяўляў Вавілон у гады росквіту? Хто клапаціўся аб яго магутнасці і велічы?

5*. Чаму нас вучыць гісторыя Асірыйскай дзяржавы?

## Для дапытлівых

### Другое цуда свету

Слава аб прыгажосці і велічы Вавілона шырока распаўсюдзілася сярод суседніх народаў. Чужаземныя пісьменнікі яшчэ доўга паўтаралі хвалебныя водгукі аб другім цудзе свету. Яны назвалі гэта цуда «вісячыя сады».

Паводле падання, адна з жонак цара Вавілона вельмі сумавала на раўніне па сваёй роднай горнай краіне. Тады любячы цар загадаў разбіць сады з кустоў і дрэў на плоскіх дахах свайго палаца. Дах



Правообладатель Народная асвета



«Вісячыя сады» Вавілона

падымаўся тэрасамі і ствараў уражанне горнай мясцовасці. Дрэвы як бы віселі, луналі ў паветры. У гэтых пышных, зялёных садах царыца магла ўспомніць сваю горную радзіму.

Сучасныя вучоныя-археолагі пацвердзілі, што жыхары Месапатаміі маглі ствараць такія сады на плоскіх дахах сваіх пабудоў.

**Пытанні да дакумента.** Апішыце вядомыя вам знакамітыя пабудовы Вавілона. Як вы думаеце, чаму памяць аб іх захоўваецца на працягу некалькіх тысячагоддзяў?

## § 19. Культура і рэлігія народаў Міжрэчча

**Успомніце.** Важнейшыя культурныя дасягненні старажытных егіпцян.

**1. З'яўленне клінапісу.** У старажытнасці Міжрэчча было населена рознымі народамі. Гэтыя народы размаўлялі на розных мовах. З цягам часу ў іх узнікла пісьменнасць.

Вынаходнікамі пісьменнасці лічацца шумеры. Менавіта яны ў канцы чацвёртага тысячагоддзя да н. э. стварылі ***клíнапіс***. Клінапіс, як мяркуюць вучоныя, з'яўляецца старажытнейшай пісьменнасцю



Правообладатель Народная асвета



Шумерскі клінапіс

ў гісторыі. Усе народы Месапатаміі, незалежна ад іх роднай мовы, выкарыстоўвалі клінапіс на працягу трох тысяч гадоў.

Пісалі шумеры на гліняных таблічках трысняговай палачкай. Гэтая палачка на канцы мела форму кліна. Кліны выціскаліся на сырой таблічцы так, што складалі асобыя знакі. Гэтыя знакі і далі назву пісьменнасці.

Таблічкі з надпісамі размяшчалі ў асветленых сонцам месцах, каб гліна высахла. Калі надпісы лічыліся вельмі важнымі, таблічкі абпальвалі. Такія запісы ўжо не баяліся ні агню, ні вады, ні часу. Многія з іх цудоўна захаваліся да нашых дзён. Менавіта па іх сучасныя гісторыкі вывучаюць гісторыю такой далёкай старажытнасці.

**2. Веды жыхароў Старажытнага Міжрэчча.** У Месапатаміі былі адкрыты шматлікія школы, у якіх дзяцей вучылі лічыць і чытаць. Пры школах знаходзіліся бібліятэкі «гліняных кніг». У іх складаліся спецыяльныя спіскі тэкстаў. Па такім спіску лёгка можна было знайсці месца захоўвання кожнай таблічкі. Нядзіўна, што многія людзі былі вельмі адукаванымі для свайго часу.

Жыхары Месапатаміі добра ведалі матэматыку. З яе дапамогай вылічвалі, колькі зямлі трэба для ўзвядзення платы. Умелі ў Старажытным Міжрэччы вызначаць ёмістасць кошыка і бочкі, пасудзіны і вагу грузу, які можа везці судна. Знатакі матэматыкі карысталіся асаблівай павагай. Іх называлі «мудрымі пісцамі лікаў».

Астраномія і медыцына ў Месапатаміі былі не менш развіты, чым у Егіпце. Да нашых дзён захаваліся запісы надвор’я і звесткі аб планетах і зорках. Складалі ў Міжрэччы і ўказальнікі часу месячных і сонечных зацьменняў.



Правообладатель Народная асвета

На 40 гліняных таблічках напісаны сачыненні па медыцыне. У Месапатаміі былі састаўлены дапаможнікі па хваробах вуха, вачэй, дыхальных шляхоў. Гэта сведчыць аб тым, што ў далёкія часы ўрачы ведалі хваробы і ўмелі лячыць хворых. Вядома таксама, што месапатамскія медыкі мелі хірургічныя інструменты і ўмелі рабіць аперацыі.

**3. Месапатамскі каляндар.** Назіранні за зоркамі, планетамі і змяненнямі ў прыродзе прывялі жыхароў Старажытнага Міжрэчча да стварэння календара. Месяцам у ім лічыўся абарот Месяца вакол зямлі. Яго працягласць складала прыкладна 28 дзён. Кожны месяц дзялілі на чатыры часткі, або тыдні. Такім чынам, у тыдні было сем дзён. З той пары вельмі многія народы свету, у тым ліку і мы, карыстаемся сямідзённым тыднем.



Месца назірання за свяцiламі.
*Часткова рэканструяваны месапатамскі храм*

Каляндар, у якім лічэнне часу вядзецца па абаротах Месяца вакол Зямлі, а час лічаць па Месяцы, называецца месячным календаром. Аднак такі каляндар не мог дакладна вызначыць пачатак наступнага года, паколькі год — гэта абарот Зямлі вакол Сонца. Таму за Сонцам у Міжрэччы таксама вяліся спецыяльныя назіранні. Каб дакладна вызначыць пачатак года, у каляндар уносілі спецыяльныя папраўкі. Гэта былі дадатковыя дні і нават месяцы. Каляндар, які спалучае назіранні за Сонцам і Месяцам, называецца месячна-сонечным.



Правообладатель Народная асвета



Вароты багіні Іштар
у Вавілоне



Выява на варотах Іштар



Свяшчэнны сторож варот.
*Рэканструкцыя*

**4. Рэлігія народаў Месапатаміі.** У Старажытным Міжрэччы шанавалі многіх багоў. У іх гонар спраўлялі разнастайныя абрады. Як і ў Старажытным Егіпце, у кожнай мясцовасці шанаваўся свой бог-заступнік. Ён увасабляў вышэйшыя сілы, якія ўладараць над жыццём людзей. Асобае месца займала вера ў *Тамуза* — бога паміраючай і ажываючай раслiннасці. Бо людзі лічылі, што ад яго залежыць ураджай на палях. Абагаўляліся таксама неба, зямля і вада.

Асаблівай павагай у жыхароў Міжрэчча карысталася багіня кахання *Іштар*. Свяцілішчы ў яе гонар былі ў многіх гарадах. У Вавілоне яе імем былі названы свяшчэнныя вароты для ўрачыстага ўезду ў горад. У Месапатаміі, як і ў Старажытным Егіпце, правядзеннем абрадаў кіравалі жрацы.

*Такім чынам, жыхары Месапатаміі стварылі старажытнейшую ў гісторыі чалавецтва пісьменнасць і месячна-сонечны каляндар, дасягнулі вялікіх поспехаў у матэматыцы, медыцыне і астраноміі. Жыхары Старажытнага Міжрэчча пакланяліся многім багам.*



Правообладатель Народная асвета

1. Калі была вынайдзена пісьменнасць у Месапатаміі? Як яна называлася? Чаму?
2. У якіх галінах жыцця знаходзілі прымяненне дасягненні вучоных Старажытнага Міжрэчча?
3. Дзе ў наш час выкарыстоўваецца месапатамскі каляндар? Хто асабліва ў ім зацікаўлены?
4. Параўнайце багоў Старажытнага Егіпта і Месапатаміі. Вызначце, ці ёсць паміж імі падабенства або адрозненне.
5. Ці згодны вы з думкай аб тым, што гліняныя таблічкі — гэта сімвал Міжрэчча? Растлумачце свой пункт погляду.

6*. Прадоўжыце запаўненне табліцы «Развіццё культуры ў краінах Старажытнага Усходу».

## § 20. Хецкая дзяржава

**Успомніце.** 1. Якія магутныя дзяржавы Старажытнага Усходу вам вядомы? 2. Пакажыце іх на карце.

**1. «Забыты народ».** Хеты былі першым індаеўрапейскім народам, які стварыў у старажытнасці магутную дзяржаву. Акрамя хетаў, да індаеўрапейцаў належалі індыйцы, іранцы, кельты, грэкі, рымляне, славяне і германцы. Аб хетах упамінаецца ў свяшчэннай кнізе хрысціян — Бібліі. У егіпецкіх і асірыйскіх надпісах гаворыцца аб «краіне Хета», або «Хаці».

Цяжка ўявіць, што да нядаўняга часу мы амаль нічога не ведалі аб гісторыі гэтага народа. Доўгі час хецкія пісьмёны не паддаваліся прачытанню. Яны «загаварылі» толькі пасля таго, як вучоным у сярэдзіне XX стагоддзя ўдалося іх расшыфраваць.



Жыхар Малой Азіі.
*Старажытнаегіпецкая выява*

**2. Утварэнне Хецкай дзяржавы.** Першапачаткова хецкія плямёны жылі на стэпавых тэрыторыях, размешчаных на поўнач ад Чорнага



Правообладатель Народная асвета

і Каспійскага мораў. Тут яны займаліся жывёлагадоўляй — разводзілі коз і авечак. З цягам часу прыручылі коней і навучыліся выкарыстоўваць іх для перамяшчэння калёсных павозак.

У самым пачатку другога тысячагоддзя да н. э. хеты ўварваліся ў межы *Малой Азіі* (тэрыторыя сучаснай Турцыі). Тут яны заснавалі некалькі дзяржаў, якія ў XVII стагоддзі да н. э. аб'ядналіся ў адзінае ***Хецкае царства***.

У старажытнасці Малая Азія была своеасаблівым мостам, які злучаў Пярэднюю Азію з Балканскім паўвостравам. Праз яе праходзілі шматлікія гандлёвыя шляхі. Вялікую ролю ў жыцці народаў гэтага рэгіёна адыгралі яго прыродныя багацці: жалезная руда, медзь, серабро, свінец, золата.

Хеты раней егіпцян і народаў Міжрэчча авалодалі сакрэтам выплаўкі жалеза і захоўвалі гэты сакрэт на працягу многіх гадоў. Яны навучыліся рабіць з жалеза не толькі прылады працы, але і зброю — кінжалы, мячы, наканечнікі для стрэл. У XVI стагоддзі да н. э. хеты выкарыстоўвалі і баявыя калясніцы, запрэжаныя конямі, якія сталі ўдарнай сілай хецкай арміі.



Сталіца Хецкага царства Хатуса. Ільвіныя вароты



Правообладатель Народная асвета

**3. Цар і царская ўлада.** На чале Хецкай дзяржавы стаяў цар. Ён быў вярхоўным галоўнакамандуючым, вярхоўным суддзёй і вярхоўным жрацом.

Цар быў абавязаны весці войны і выконваць свяшчэнныя рытуалы. Паспяховыя ваенныя паходы прыносілі багатую здабычу. А ад малітваў багам залежала само жыццё краіны Хаці. Нават падчас вайны цар пакідаў замест сябе свайго палкаводца і спяшаўся ў сталіцу для правядзення рэлігійных цырымоній. Але ў адрозненне ад Егіпта цару хетаў не пакланяліся як бажаству.

Важным дасягненнем хетаў былі законы. Хецкія законы не былі такімі жорсткімі, як законы Хамурапі. Людзей рэдка прыгаворвалі да смяротнага пакарання. Але нават цара хетаў за парушэнне законаў маглі пакараць перад саветам знаці.

**4. Заваявальныя паходы хетаў.** Аснову ваеннай сілы Хецкай дзяржавы складала добра арганізаваная і абучаная пяхота і лёгкія баявыя калясніцы, запрэжаныя коньмі.

Хеты пакарылі Малую Азію, заваявалі паўночную частку Сірыі. Яны вялі войны з Вавілонам, паспяхова сапернічалі са Старажытным Егіптам. Жыхароў заваяваных месцаў часта ператваралі ў рабоў. Найвышэйшай магутнасці дзяржава хетаў дасягнула ў XIV—XIII стагоддзях да н. э. Аднак бесперапынныя ваенныя паходы моцна аслаблялі краіну.

Хеты былі не толькі храбрымі воінамі, але і ўмелымі дыпламатамі. З дапамогай перагавораў і пагадненняў яны часта дабіваліся таго, чаго іншыя стараліся дабіцца з дапамогай зброі.

Каля **1200 года да н. э.** у Малую Азію ўварваліся плямёны, якія жылі на ўзбярэжжы Эгейскага мора. Яны паклалі канец магутнасці вялікай Хецкай дзяржавы.



Баявая калясніца хетаў



Правообладатель Народная асвета



Хецкае бажаства

**5. Рэлігія хетаў.** «Клінапісныя бібліятэкі», якія дайшлі да нашых дзён, даюць яркае ўяўленне аб тым, як жылі хеты, з кім ваявалі і ў што верылі.

Хетаў часта называюць народам «тысячы багоў». У іх лік уваходзілі таксама багі заваяваных народаў. Вярхоўным бажаством у хетаў лічыўся бог навальніцы. Шанавалася таксама яго жонка — багіня сонца. Шырока вядомыя былі багі і багіні ўрадлівасці. Выключным уплывам карысталася багіня кахання, разбурэння і вайны.

*Такім чынам, хеты раней за іншыя народы навучыліся выплаўляць і апрацоўваць жалеза. Яны стварылі магутную дзяржаву старажытнасці. Хеты былі не толькі мужнымі воінамі, але і выдатнымі дыпламатамі.*

1. Пералічыце народы, якія з'яўляюцца індаеўрапейскімі.
2. Пакажыце на карце тэрыторыю сучаснай Турцыі, на якой утварылася Хецкае царства. Калі гэта адбылося?
3. Якія вынаходніцтвы хетаў садзейнічалі ператварэнню іх дзяржавы ў магутную дзяржаву Старажытнага Усходу?
4. Чаму хецкія цары абмяркоўвалі пытанні з саветам знаці? Чым іх законы адрозніваліся ад законаў Хамурапі?
5. Чым рэлігія хетаў падобна на рэлігію вядомых вам старажытных народаў?

6*. Растлумачце, што значыць быць выдатным дыпламатам. Якое значэнне гэта майстэрства мае ў нашы дні?

## § 21. Старажытны Іран

**Успомніце.** Чаму хетаў называюць народам «тысячы багоў»?

**1. Прыродныя ўмовы і насельніцтва.** На ўсход ад Месапатаміі, амаль да граніц Індыі, ляжыць старажытная краіна *Іран*. Тэрыторыя Старажытнага Ірана ў многім супадае з граніцамі сучаснай краіны.



Правообладатель Народная асвета

У Іране вялікія стэпы чаргуюцца з вялікімі горнымі масівамі. Землі не вызначаюцца асаблівай урадлівасцю, але і беднымі іх не назавеш. У гарах ёсць даліны, дзе заўсёды збіралі багатыя ўраджаі. Іранскія горы багатыя на карысныя выкапні. Таму ўжо ў старажытнасці людзі былі забяспечаны глінай, каменем, рудамі металаў, іншымі матэрыяламі, неабходнымі для жыцця.


Павозка качэўнікаў

Сама назва «Іран» азначае «краіна арыяў». Арыі — так называўся шэраг індаеўрапейскіх плямён. У трэцім тысячагоддзі да н. э. яны рассяліліся паміж Дняпром і Уралам.

Арыі першыя ў гісторыі чалавецтва прыручылі каня. Хутка каняводства стала іх асноўным гаспадарчым заняткам. Земляробства і апрацоўка металаў арыям таксама былі добра знаёмы. Ішоў час, і асобныя плямёны арыяў прыйшлі ў Іран.

**2. Дзяржавы Старажытнага Ірана.** Яшчэ да прыходу арыяў тут існавала дзяржава *Элам*. Яе правіцелі часта ваявалі з царамі Месапатаміі. У VII стагоддзі да н. э. Элам быў заваяваны Асірыяй.

У гэты час сярод арыяў узнік магутны племянны саюз *персаў*. У сярэдзіне VI стагоддзя да н. э. персы падпарадкавалі сабе ўвесь Іран і Малую Азію. Затым яны перамаглі вавілонян і занялі іх сталіцу, якая лічылася непрыступнай. Наступным вялікім поспехам персаў стала заваяванне Егіпта. Так утварылася вялікая Персідская дзяржава.


Дарый Першы



Правообладатель Народная асвета

Персідская дзяржава мела некалькі сталіц, у тым ліку і Вавілон. Цяпер цара персаў сталі называць «вялікім царом». Самым магутным правіцелем з'яўляўся ***Дарый Першы***, які правіў з **522** па **486 год да н. э.** Вялікая дзяржава была раздзелена на вобласці, якія называліся *сатрапіі*. На чале кожнай вобласці стаяў намеснік цара— ***сатра́п***. Ён збіраў падаткі, сачыў за наборам у армію. Яму падпарадкоўваліся мясцовыя суды. Дзеянні сатрапаў часта прыносілі простым людзям гора. З гэтага часу слова «сатрап» стала азначаць «жорсткі чалавек, прыгнятальнік».

Персідская дзяржава праіснавала каля двухсот гадоў, пасля чаго была заваявана іншаземцамі.

**3. Рэлігія Старажытнага Ірана.** Старажытныя іранцы мелі ўласную рэлігію. У яе аснове ляжыць культ святла, ідэя барацьбы дабра са злом. Вярхоўным богам з'яўляўся бог дабра, справядлівасці і святла. Ён і цэлае войска памочнікаў супрацьстаялі сілам зла і цемры. Свяшчэнная кніга рэлігіі старажытных іранцаў называецца «*Авеста*». Лічыцца, што яе аўтарам быў ***Зараастр***. Таму саму рэлігію называюць *зараастрызмам*. Зараастрыйцы пакланяліся агню.



Іранскі вярхоўны бог. *Рэльеф, высечаны на скале*



Правообладатель Народная асвета

*Такім чынам, старажытнейшай дзяржавай Ірана быў Элам. У VI стагоддзі да н. э. персы стварылі магутную дзяржаву ад Ніла да Інда. Рэлігіяй старажытных іранцаў быў зараастрызм. У яго аснове ляжала ідэя барацьбы дабра са злом.*

1. Вызначце месцазнаходжанне Старажытнага Ірана. Апішыце словамі прыродныя ўмовы гэтай краіны.
2. Што вы даведаліся аб арыях? Колькі тысячагоддзяў налічвае гісторыя гэтага народа?
3. Назавіце старажытнейшую дзяржаву на тэрыторыі Ірана. Кім яна была заваявана?
4. Які народ падпарадкаваў сабе Іран, Малую Азію, Егіпет і стварыў вялікую дзяржаву? Калі гэта адбылося?
5. Растлумачце, якім чынам кіравалася Персідская дзяржава. Раскажыце аб рэлігіі Старажытнага Ірана.

## § 22. Фінікія

**Успомніце.** Чым былі падобныя асноўныя заняткі старажытных егіпцян і жыхароў Месапатаміі?

У старажытнасці на тэрыторыі, размешчанай паміж Егіптам і Месапатаміяй, пражывалі шматлікія народы. Імёны адных нам добра вядомы. Імёны другіх ведаюць толькі вучоныя-спецыялісты. Егіпцяне, асірыйцы і вавілоняне стварылі магутныя дзяржавы. Глыбокі след у гісторыі чалавечай культуры пакінулі фінікійцы і старажытныя яўрэі, або народы Ізраіля.



Фінікійскі рэльеф з выявай карабля

**1. Краіна і людзі.** На ўсходнім узбярэжжы Міжземнага мора, там, дзе размешчана сучасная дзяржава Ліван, знаходзілася старажытная ***Фінікі́я***. Ад астатняй Пярэдняй Азіі яна была адгароджана гарамі з кедравымі і змешанымі лясамі, альпійскімі лугамі і снежнымі вяршынямі. З захаду



Правообладатель Народная асвета



Фінікійскі карабель.
*Рэканструкцыя*

яе абмывалі цёплыя воды Міжземнага мора. Вільготныя вятры прыносілі дажджы, і глеба не мела патрэбы ў штучным арашэнні. Узбярэжжа было зрэзана дробнымі і зручнымі бухтамі. Усё жыццё фінікійцаў было звязана з морам. Невыпадкова яны ўвайшлі ў гісторыю як умелыя мараплаўцы.

Зямля Фінікіі была ўрадлівай. Але яе не хапала, каб пракарміць усіх людзей. Таму фінікійцы займаліся рыбнай лоўляй і рамёствамі. Яны выраблялі шкло і вырабы з яго, рабілі ювелірныя ўпрыгожанні і адзенне, навучыліся здабываць фарбу з марскога малюска. Асабліва славіліся фінікійцы вытворчасцю чырвона-ліловай фарбы, або *пурпуру*. Адзенне, афарбаванае пурпурам, каштавала вельмі дорага, і яго маглі насіць толькі цары і вельмі багатыя людзі.

**2. Фінікійскія гарады-дзяржавы.** Фінікія ніколі не была адзінай краінай. Яна складалася з невялікіх гарадоў-дзяржаў, размешчаных на ўзбярэжжы. Буйным партовым горадам быў *Цір*, які ўзнік яшчэ ў трэцім тысячагоддзі да н. э. Вядомы таксама *Бібл*, *Бейрут* і *Сідон*. Жыхары называлі сябе па назве горада. Толькі чужаземцы называлі іх фінікійцамі.

Цэнтрам дзелавога жыцця горада з'яўляўся порт. Тут загружаліся і разгружаліся караблі. Сюды дастаўляліся папірус, тканіны і золата з Егіпта, гліняныя вырабы з Месапатаміі, медзь з Кіпра. Тавары захоўваліся на складах і чакалі адпраўкі ўнутр краіны або за яе межы.



Фінікійская
манета

**3. Гандляры і мараплаўцы.** Фінікійскія гарады падтрымлівалі цесныя сувязі з суседнім



Правообладатель Народная асвета

Ізраілем. Хірам, цар Ціра, пасылаў Саламону, цару Ізраіля, ствалы кедраў для будаўніцтва храма ў Іерусаліме. Фінікійскія купцы гандлявалі па ўсім узбярэжжы Міжземнага мора. Марскія падарожжы патрабавалі вялікай мужнасці і спрытнасці. У моры прыходзілася арыентавацца па сонцы і зорках.

Паступова ўвесь гандаль у Міжземнамор'і сканцэнтраваўся ў руках фінікійцаў. Для зручнасці ў гандлёвых справах яны заснавалі *калоніі* (пасяленні) на ўзбярэжжы Міжземнага мора. Буйнейшым з іх быў ***Карфаген***, які пазней ператварыўся ў сталіцу магутнай дзяржавы.

**4. Фінікійскі алфавіт.** Першапачаткова жыхары Фінікіі карысталіся клінапісным пісьмом, якое яны перанялі ў народаў Месапатаміі. Але клінапіс быў даволі складаным і таму нязручным для вядзення гандлёвых запісаў і разлікаў. Фінікійцы прыдумалі больш простую сістэму пісьма. У ёй кожны значок быў літарай і абазначаў асобны зычны гук, а не слова. Такіх значкоў, або літар, было 22. Літары расстаўляліся ў пэўным парадку, у выніку чаго атрымаўся алфавіт.



Высечаны на камені фінікійскі надпіс

Старажытныя грэкі запазычылі ў фінікійцаў іх алфавіт. Грэкі сталі абазначаць значкамі не толькі зычныя, але і галосныя гукі. Многія алфавіты свету бяруць пачатак ад фінікійскай і грэчаскай сістэм пісьма. Першыя дзве фінікійскія літары «алеф» і «бет» далі назву слову «алфавіт».

*Такім чынам, фінікійцы былі ўмелымі рамеснікамі і гандлярамі, выдатнымі мараплаўцамі, стваральнікамі першага алфавіта.*



Правообладатель Народная асвета

1. Дзе была размешчана Фінікія?
2. Якія былі заняткі фінікійцаў? Чым яны адрозніваліся ад заняткаў старажытных егіпцян і вавілонян?
3. Пералічыце адкрыцці фінікійцаў. Якія перавагі вынайдзенага імі алфавіта ў параўнанні з пісьменнасцю Старажытнага Егіпта і Месапатаміі?
4. Чаму з цягам часу ўвесь гандаль у Міжземным моры сканцэнтраваўся ў руках фінікійцаў?
5. Якая з калоній фінікійцаў ператварылася ў сталіцу магутнай дзяржавы?
6*. Абмяркуйце мудрыя думкі старажытных фінікійцаў: «Хто ў дзяцінстве быў гультаём, той у старасці будзе жабраком», «Калі мыш захоча праглынуць вярблюда, то лопне». Ці мае іх сэнс значэнне для нас?

## Для дапытлівых

Аднойчы фінікійскі гандлёвы карабель, які вёз груз соды, прыстаў да пясчанага берага. Купцы вырашылі паабедаць, расклалі вогнішча, дасталі кацялкі, але не знайшлі камянёў, на якія можна было б іх паставіць. Тады яны замест камянёў выкарысталі ўзятыя з карабля кавалкі соды. Агонь быў моцным, сода расплавілася і змяшалася з пяском і ракавінкамі: ад кастра пацяклі струмені празрыстай вадкасці. Гэта вадкасць, калі застыла, ператварылася ў шкло.

Цяжка сказаць, наколькі праўдзівы гэты расказ. Аднак вядома, што шкло на самай справе можна зварыць з соды, пяску і ракавінак (вапны).

**Пытанні да дакумента.** Якое значэнне ў паўсядзённым жыцці чалавека мела вынаходніцтва шкла?

# § 23. Старажытная Палесціна

**Успомніце.** Якімі дасягненнямі (адкрыццямі) народы Старажытнага Усходу ўзбагацілі сусветную культуру?

**1. Прыродныя ўмовы.** ***Палесціна*** — невялікая краіна, размешчаная на поўдзень ад Фінікіі. Прырода гэтай краіны суровая і разнастайная. Тут можна сустрэць невысокія горы і ўзгоркі. На-



Правообладатель Народная асвета

гор’е змяняецца аазісамі і ўрадлівымі далінамі. Багатая нізіна цягнецца ўздоўж Міжземнага мора. На поўначы падымаюцца пакрытыя снегам вяршыні, а з поўдня і захаду падступаюць выпаленыя сонцам пустыні. Насельніцтва са старажытных часоў займалася земляробствам і жывёлагадоўляй. Жыццё было цяжкім і небагатым. Хрысціяне называюць месцы Палесціны, дзе нарадзіўся, жыў і прапаведаваў Ісус Хрыстос, Святой Зямлёй.

**2. Паходжанне яўрэяў.** Першапачаткова яўрэі пражывалі на поўдні Месапатаміі, за ракой Еўфрат. У пошуках урадлівых земляў і пашаў яны качавалі па прасторах Пярэдняй Азіі. Суседнія народы называлі іх «людзьмі, якія прыйшлі з-за ракі» («ібрым», або «яўрэі»). У XIII—XII стагоддзях да н. э. яўрэі пасяліліся ў Палесціне. Тут ім прыйшлося весці барацьбу з мясцовым насельніцтвам. Асабліва ўпартай яна была з *філісцімлянамі*, ад імя якіх пайшла назва Палесціны.



Паводле падання, частка яўрэяў перасялілася ў Егіпет, дзе іх прыгняталі.
*Фрагмент карціны еўрапейскага мастака XIX стагоддзя*

**3. Царства Ізраіль.** Сумесная барацьба аб’ядноўвала старажытнаяўрэйскія роды і плямёны. У канцы XI стагоддзя да н. э. яны аб’ядналіся і ўтварылі сваё царства — ***Ізрáіль***. Знакаміты цар ***Давід*** быў правіцелем Ізраіля ў **1005—965 гадах да н. э.** Ён заваяваў горад Іерусалім і абвясціў яго сталіцай Ізраільскага царства. Давід быў



Правообладатель Народная асвета



Храм Саламона. *Рэканструкцыя*

не толькі палкаводцам, але і выдатным музыкантам і паэтам. Яго псалмы-песні ўвайшлі ў свяшчэнную кнігу яўрэяў *Стары Запавет*, і імі да гэтага часу захапляюцца людзі. Але самым знакамітым і мудрым у гісторыі лічыцца сын Давіда цар ***Саламон***. У яго царстваванне **(965—926 гады да н. э.)** Іерусалім ператварыўся ў багацейшы горад таго часу. Саламон пабудаваў першы храм у Іерусаліме. У ім змясцілі рэлігійныя святыні яўрэяў. Пасля смерці Саламона Ізраіль распаўся на два царствы. За адным захавалася ранейшая назва. Другое стала называцца *Іудзеяй*. Каля 200 гадоў два царствы варагавалі адно з другім. Аслабленыя, яны сталі лёгкай здабычай заваёўнікаў — асірыйцаў і вавілонян.

**4. Рэлігія яўрэяў.** Як і іншыя народы Старажытнага Усходу, яўрэі былі язычнікамі. Але яны першымі перайшлі ад мнагабожжа да адзінабожжа, сталі шанаваць аднаго Бога — *Яхве*. Усемагутны і ўсёвідушчы, Яхве быў тварцом неба, зямлі, усяго, што на ёй існуе. Ён даў людзям дзесяць *запаведзяў* — правіл, па якіх неабходна жыць. Гэтыя правілы былі запісаны на каменных плітах — *скрыжалях*, якія Бог уручыў правадыру яўрэяў ***Маісею***.



Маісей трымае скрыжалі з запаведзямі. *Сучасны малюнак*

Важнейшыя запаведзі такія: верыць у адзінага Бога — Яхве і не вымаўляць дарэмна Яго свяшчэннае імя, паважаць бацьку і маці, не красці, не ілгаць і не забіваць чалавека. Вінаватага спасцігне Божая кара.



Правообладатель Народная асвета

Яўрэі верылі ў тое, што яны заключылі з Яхве *запавет*, г. зн. дагавор. Яны згадзіліся выконваць усе запаведзі, запісаныя на скрыжалях. І верылі ў тое, што Бог абяцаў за гэта багаты край — Палесціну, дастатак і шчасце.

Рэлігійныя вераванні старажытных яўрэяў выкладзены ў Старым Запавеце. У ім змяшчаюцца таксама яўрэйскія міфы і паданні аб старыне, разважанні мудрацоў, старажытныя законы і звычаі. Стары Запавет з'яўляецца найбольш старажытнай часткай свяшчэннай кнігі хрысціян — ***Бібліі***.

*Такім чынам, старажытныя яўрэі ўнеслі важны ўклад у гісторыю культуры ўсяго чалавецтва. У Старажытнай Палесціне ўзнікла адзінабожжа і быў створаны Стары Запавет — першая частка Бібліі.*

**1.** Апішыце словамі прыродныя ўмовы Старажытнай Палесціны. Пакажыце яе на карце. Чаму гэтую краіну называюць Святой Зямлёй?
**2.** Калі і якім чынам на тэрыторыю Палесціны трапілі яўрэі? З кім з мясцовага насельніцтва ім прыйшлося весці ўпартую барацьбу?
**3.** З іменем якіх цароў звязана гісторыя царства Ізраіль? Чаму яны праславіліся?
**4.** Чым рэлігія яўрэяў адрознівалася ад вядомых вам рэлігій? Як яна паўплывала на гісторыю многіх народаў?
**5.** У чым сэнс важнейшых запаведзяў, якія даў Бог Яхве яўрэйскаму народу?
**6*.** Прадоўжыце запаўненне параўнальнай табліцы «Развіццё культуры ў краінах Старажытнага Усходу».

## Абагульненне да главы «Пярэдняя Азія ў старажытнасці»

Старажытная гісторыя шматлікіх народаў Пярэдняй Азіі пакінула глыбокі след у памяці чалавецтва. Цывілізацыі, якія склаліся ў далінах Тыгра і Еўфрата, мелі свае асобыя традыцыі і дасягненні. Тут узніклі магутныя дзяржавы Акад, Вавілон, Асірыя і Іран.

У эпоху праўлення Хамурапі Вавілонскае царства стала самай моцнай і развітай дзяржавай Пярэдняй Азіі. А законы, створаныя



Правообладатель Народная асвета

правіцелем, дзейнічалі ў Вавілоне больш чым 1000 гадоў. У VII стагоддзі да н. э. асірыйскія войскі захапілі і разбурылі Вавілон, але пабудаваная на захопах Асірыйская дзяржава пасля гэтага праіснавала нядоўга.

Персы стварылі вялікую дзяржаву, у якой змаглі аб'яднаць многія цывілізаваныя народы Пярэдняй Азіі і Егіпта.

Фінікійцы, якія не перастаюць нас здзіўляць, заснавалі вялікую колькасць калоній па берагах Міжземнага мора. І менавіта яны сталі стваральнікамі алфавіта.

Старажытныя яўрэі ўнеслі важны ўклад у гісторыю чалавечай культуры. У Старажытнай Палесціне ўзнікла адзінабожжа. Быў створаны Стары Запавет — першая частка Бібліі.

1. З гісторыяй якіх старажытных народаў, якія насялялі Пярэднюю Азію, вы пазнаёміліся?
2. Назавіце падзеі гісторыі Пярэдняй Азіі, якія вам асабліва запомніліся. Чаму?
3. Назавіце імёны выдатных правіцеляў дзяржаў Пярэдняй Азіі. Што карыснага яны здзейснілі? Што ў іх праўленні вам не спадабалася?
4. Растлумачце значэнне тэрмінаў і паняццяў, з якімі вы пазнаёміліся.

## Глава 3. ІНДЫЯ І КІТАЙ У СТАРАЖЫТНАСЦІ

### § 24. Старажытная Індыя

**Успомніце.** Якія цывілізацыі ўзніклі ў басейнах вялікіх рэк?

1. **Узнікненне дзяржавы ў Старажытнай Індыі.** На поўдні Азіі размешчана дзіўная краіна — Індыя. Яе гісторыя налічвае больш за 5 тысяч гадоў. Першыя аселыя паселішчы ўзніклі ў Індыі ў далінах рэк *Інд* і *Сарасваці*. Назва «Індыя» была дадзена гэтай краіне пазней старажытнымі грэкамі ў гонар ракі Інд.



Правообладатель Народная асвета




Карта Старажытнай Індыі

Вядома, што ўжо ў трэцім — пачатку другога тысячагоддзя да н. э. у далінах Інда і Сарасваці існавала адзіная дзяржава. У ёй былі дзве сталіцы — ***Харапа*** на поўначы і ***Махенджа-Дара*** на поўдні, а таксама шмат гарадоў. Гэта была самая вялікая, густанаселеная і багатая дзяржава таго часу ў свеце. Жыхары краіны дзяліліся на багатых і бедных. Лічаць, што на чале дзяржавы стаялі жрацы.

Калі рака Сарасваці перасохла, дзяржава распалася і людзі паступова перасяліліся ў даліну ракі Ганг.

**2. Старажытнаіндыйскае грамадства.** Старажытную Індыю насялялі розныя плямёны. Працяглае жыццё на адной тэрыторыі збліжала і аб’ядноўвала іх. Сярод гэтых плямён пастаянна з’яўляліся і тыя, якія называлі сябе *арыямі*.



Правообладатель Народная асвета



Пячатка з Махенджа-Дара

З цягам часу ўсё стараіндыйскае грамадства стала дзяліцца на арыяў («сваіх») і дасаў («чужых»). Адрозненне паміж імі было ў тым, што арыі і дасы пакланяліся розным багам і займалі рознае становішча ў грамадстве. Усе арыі раздзяляліся на тры *ва́рны*. Варна — вялікая група людзей, якая выконвала ў грамадстве адну і тую ж работу, мела пэўныя правы і абавязкі. Першай і вышэйшай варнай былі жрацы-*брахманы*. Другой варнай — ваенная знаць, трэцюю варну складалі земляробы, рамеснікі і гандляры. Дасы складалі чацвёртую, ніжэйшую варну. Гэтую варну называлі «шудра», што азначае «слуга». Шудры былі абавязаны служыць тром першым варнам.




Устройства грамадства: «піраміда» ўлады
ў Старажытнай Індыі

Ішоў час, і ў Індыі ўтварыліся царствы. На чале кожнага з іх стаяў цар. У канцы IV стагоддзя да н. э. у Індыі зноў утварылася вялікая дзяржава. Найвышэйшай магутнасці яна дасягнула пры цары ***Ашоку.*** Пасля яго смерці дзяржава хутка распалася на невялікія самастойныя царствы.

**3. Гаспадарчае жыццё ў Старажытнай Індыі.** З трэцяга тысячагоддзя да н. э. галоўным заняткам жыхароў Індыі было земляробства. Вырошчвалі пшаніцу, ячмень, гарох, проса і ўпершыню



Правообладатель Народная асвета

ў свеце бавоўну і цукровы трыснёг. Другой па значэнні ў гаспадарцы была жывёлагадоўля. Разводзілі кароў, авечак, коз, свіней, аслоў. Акрамя таго, упершыню ў свеце індыйцы прыручылі сланоў. З цягам часу людзі сталі выкарыстоўваць у гаспадарцы і каня.


Калона, створаная пры Ашоку

Асноўныя прылады працы ў Старажытнай Індыі выраблялі спачатку з медзі, пазней — з бронзы. Менавіта з гэтых металаў выплаўлялі нажы, наканечнікі для коп'яў і стрэл, матыкі, сякеры і многае іншае. Былі вядомы золата і свінец. Жалеза было асвоена толькі ў першым тысячагоддзі да н. э. Важную ролю ў гаспадарцы індыйцаў ігралі прадзенне, ткацтва і ювелірная справа.

Высокага ўзроўню дасягнуў марскі і сухапутны гандаль. У трэцім тысячагоддзі да н. э. найбольш актыўна індыйцы гандлявалі з Міжрэччам. Туды з Індыі везлі цудоўныя індыйскія баваўняныя тканіны, ювелірныя вырабы. Індыйскія вырабы траплялі нават у далёкі Егіпет. У Індыю прывозілі ячмень, гародніну, фрукты. Па сушы індыйцы гандлявалі з суседнімі качавымі народамі. Да сярэдзіны другога тысячагоддзя да н. э. марскі гандаль Індыі спыніўся.

*Такім чынам, у трэцім — пачатку другога тысячагоддзя да н. э. у Індыі ўжо існавала адзіная дзяржава. Грамадства старажытных індыйцаў дзялілася на варны. З цягам часу з'явіліся новыя царствы. Старажытныя індыйцы падаравалі чалавецтву такія сельскагаспадарчыя культуры, як бавоўнік і цукровы трыснёг, прыручылі слана.*

?

1. Калі і ў далінах якіх рэк у Індыі ўзнікла адзіная дзяржава? Што заставіла людзей перасяліцца ў даліну Ганга?
2. Што ўяўляла сабой старажытнаіндыйскае грамадства?



Правообладатель Народная асвета

3. Пры якім правіцелі ў Індыі ўтварылася вялікая дзяржава? Палічыце, колькі стагоддзяў назад гэта адбылося.
4. Раскажыце аб гаспадарчым жыцці жыхароў Індыі ў старажытнасці. Зрабіце вывад.
5. Растлумачце, чаму першыя дзяржавы ўтварыліся ў далінах вялікіх рэк. Што агульнага было ў іх прыродных умовах?
6. «Прачытайце» гістарычную карту з апорай на яе легенду (гл. с. 91 вучэбнага дапаможніка).
7*. Як вы лічыце, чаму старажытныя індыйцы былі раздзелены на варны? Каму гэта было выгадна?

## § 25. Культура Старажытнай Індыі

**Успомніце.** Дасягненні хецкага і іранскага народаў у старажытнасці.

**1. Мова і пісьменнасць Старажытнай Індыі.** Пакуль невядома, на якіх мовах размаўлялі жыхары Індыі ў трэцім тысячагоддзі да н. э. Іх пісьменнасць яшчэ не расшыфравана. Але вядома мова, на якой размаўлялі арыі. Яна называецца *санскрыт*, што значыць «дасканалы». Многія сучасныя мовы Індыі блізкія санскрыту. Ёсць у санскрыце і словы, падобныя на беларускія. Напрыклад, «веда» — «веды», «швета» — «свята», «брахман» — «рахманы», «будх» — «будзіць».



Запіс на санскрыце

Стваральнікамі санскрыту лічыліся богі, а захавальнікамі — брахманы. Кожны чалавек, які лічыў сябе арыем, павінен быў ведаць гэтую мову. Шудры не мелі права вывучаць санскрыт пад страхам жорсткага пакарання.

**2. Літаратура.** Літаратура старажытных індыйцаў — гэта вялікая спадчына для ўсяго чалавецтва. Старажытнейшымі творамі індыйскай літаратуры лічацца ***Веды***, створаныя не пазней другога тысячагоддзя да н. э. Веды (даслоўна



Правообладатель Народная асвета

«веды», «мудрасць») — свяшчэнныя кнігі, якія змяшчалі многія важныя для старажытных індыйцаў веды. Іх праўдзівасць і карысць ніколі не аспрэчваліся. Усё духоўнае жыццё старажытных індыйцаў стваралася на аснове Ведаў. Таму старажытную індыйскую культуру часта называюць ведыйскай.

Большая частка старажытнаіндыйскай літаратуры напісана на санскрыце. Значная колькасць сачыненняў старажытных індыйцаў уваходзіць і ў скарбонку сусветнай літаратуры. Першае месца ў гэтым шэрагу належыць вялікім паэмам ***Махабхарата*** і ***Рамаяна***. Паэмы расказваюць аб жыцці старажытных індыйцаў, іх войнах, вераваннях, звычаях і прыгодах. Старажытныя індыйцы назвалі Махабхарату «народнай Ведай».

Створаныя імі цудоўныя казкі, паданні, міфы і легенды сёння ведаюць далёка за межамі Індыі. Многія творы перакладзены на сучасныя мовы розных народаў свету.

**3. Рэлігіі Старажытнай Індыі.** Аб народных вераваннях індыйцаў трэцяга тысячагоддзя да н. э. мы ведаем пакуль нямнога. Яны верылі ў багіню-маці, у трохлікага бога, апекуна жывёлагадоўлі, пакланяліся некаторым відам расліннага і жывёльнага свету. Свяшчэннымі жывёламі лічыліся бык і карова. Існаваў таксама культ вады і вера ў замагільнае жыццё. Але ёсць вераванні, аб якіх мы ведаем значна больш.

Старажытная Індыя з'яўляецца радзімай адразу дзвюх вялікіх рэлігій Усходу — ***індуі́зму*** і ***будызму***. Індуізм бярэ свой пачатак у Ведах. Веды — першыя і галоўныя кнігі індуізму. У тыя часы індыйцы верылі не ў аднаго, а ў многіх багоў. Навальніцай кіраваў *Індра*, агнём — *Агні*. Водамі кіраваў грозны *Варуна*. Людзей ад напасцей ахоўваў *Мітра*. Вялікім і жудасным быў разбуральнік *Шыва*.



Вароты будыйскага храма



Правообладатель Народная асвета



Фрагмент будыйскага храма

Прыкладна з VI стагоддзя да н. э. у Індыі з’явілася новая рэлігія, якая з цягам часу ператварылася ў сусветную. Яе заснавальнікам быў ***Буда***. Імя «Буда» азначае «разбужаны» або «прасветлены». У старажытным будызме няма веры ў багоў. Адзіны святы — сам Буда. Ён паказаў людзям шлях да дасканаласці і выратавання ад пакут.

Будызм вельмі хутка распаўсюдзіўся ў старажытнаіндыйскім грамадстве. У III стагоддзі да н. э. яго прыняў вялікі цар Ашока. Але ў пачатку нашай эры будызм быў выцеснены індуізмам з Індыі ў Кітай і іншыя суседнія краіны.

Прыхільнікаў будызму і індуізму аб’ядноўвала агульная вера ў жыццё пасля смерці. Гэтыя людзі верылі таксама ў тое, што пасля смерці чалавек нараджаецца зноў. Але пры нараджэнні ён атрымлівае тое, што заслужыў сваімі паводзінамі ў мінулым жыцці.

*Такім чынам, старажытнаіндыйская культура вельмі багатая і разнастайная. Асобае месца ў ёй займаюць Веды, Махабхарата і Рамаяна. Старажытныя індыйцы стварылі дзве вялікія рэлігіі — індуізм і будызм.*

**1.** Што вы даведаліся аб мовах і пісьменнасці Старажытнай Індыі? Што вас здзівіла?
**2.** Чаму старажытнаіндыйскую культуру называюць ведыйскай?
**3.** Назавіце знакамітыя паэмы старажытнаіндыйскай літаратуры. На якой мове яны напісаны?
**4.** Падумайце, чаму шудры не мелі права вывучаць санскрыт.
**5.** Назавіце галоўныя рэлігіі Старажытнай Індыі. Што іх аб’ядноўвала і якім мэтам яны служылі?
**6*.** Прадоўжыце запаўненне параўнальнай табліцы «Развіццё культуры ў краінах Старажытнага Усходу».



Правообладатель Народная асвета

# § 26. Узнікненне дзяржавы ў Кітаі

**Успомніце.** 1. Каму належала ўлада ў старажытных дзяржавах Усходу? 2. Як гэтая ўлада ўмацоўвалася?

**1. Краіна і насельніцтва.** Кітай размешчаны на ўсходзе Азіі. Яшчэ ў глыбокай старажытнасці людзі засялялі шырокія раўніны, па якіх працякаюць вялікія рэкі — *Хуанхэ* і *Янцзы*. На захадзе раўніна пераходзіць у пласкагор'е, а далей — у скалістыя горныя хрыбты.

Стагоддзямі рака-працаўніца Хуанхэ, што азначае «Жоўтая рака», прыносіла ў даліну часцінкі жоўтай глебы — *лёсу*. Знешне ён падобны на пясок, але пры гэтым вельмі ўрадлівы.

Пры дастатковай колькасці вільгаці на гэтай глебе людзі атрымлівалі высокія ўраджаі. Ураджаі залежалі не толькі ад выкарыстання вод ракі, але і ад дажджоў, якія шчодра выпадалі ў месцах, блізкіх да берагоў Ціхага акіяна. Часта ў сезоны дажджоў вада перапаўняла Хуанхэ, і яна, выйшаўшы з берагоў, губіла дзясяткі і сотні кітайскіх паселішчаў. Мясцовыя жыхары баяліся гэтых бурных разліваў і называлі Хуанхэ «ракой тысячы бедстваў». Нават старажытнакітайскі



Даліна ракі Хуанхэ. *Сучасны выгляд*



Правообладатель Народная асвета




Карта Старажытнага Кітая

іерогліф «няшчасце» выяўляў ваду, якая разлілася. Усё гэта знайшло адлюстраванне ў міфах аб вялікіх драконах, якія жывуць у рацэ.

**2. Заняткі старажытных кітайцаў.** Як і ў іншых цывілізацыях Старажытнага Усходу, асновай гаспадаркі старажытных кітайцаў стала земляробства. Першыя земляробы аселі ў сярэднім цячэнні Хуанхэ. Яны апрацоўвалі мяккую лёсавую глебу матыкамі. Сеялі проса і пшаніцу, вырошчвалі агародніну, разводзілі жывёл. Прылады працы і зброю рабілі з бронзы. З развіццём гаспадаркі ў другім тысячагоддзі да н. э. узнікла дзяржава.



Правообладатель Народная асвета

У V стагоддзі да н. э. на змену бронзе прыйшло жалеза. У сельскай гаспадарцы з'явіўся плуг з жалезным наканечнікам. У апрацоўцы палёў ручную працу замяніла цяглавая сіла — быкі. Гэта значна павялічыла ўраджай. Адначасова старажытныя кітайцы асвоілі вырошчванне рысу. Рыс збіралі два-тры разы ў год. Для вырошчвання рысу патрабавалася шмат вільгаці, і земляробы сталі ствараць арашальныя каналы. Высокія ўраджаі спрыялі росту колькасці насельніцтва. Краіна была густа заселена. Старажытныя кітайцы пачалі асвойваць аддаленыя ад Хуанхэ землі.



Баявы бронзавы тапор

У гэты час з'явіліся і першыя гарады. У многіх з іх жылі дзясяткі тысяч чалавек. Каб абараніцца ад паводак, гарады часта адгароджвалі ад ракі землянымі дамбамі.

Кітайцы першымі ў свеце сталі вырабляць тонкія і лёгкія шаўковыя тканіны. Вельмі тонкую нітку для іх атрымлівалі з коканаў шаўкавічных чарвякоў. Каб зрабіць прыгожую тканіну, патрэбны былі вялікія намаганні і цярпенне. Вытворчасць шоўку трымалася ў строгім сакрэце.



Сельскагаспадарчыя работы.
*Старажытны малюнак*



Работа на рысавым полі.
*Сучасная фатаграфія*



Правообладатель Народная асвета

**3. Стварэнне адзінай кітайскай дзяржавы.** У III стагоддзі да н. э. у Кітаі існавала некалькі дзяржаў, якія ўпарта змагаліся паміж сабой за ўладу. У выніку гэтай барацьбы дзяржава ***Цынь*** падпарадкавала ўвесь Кітай. Яго імператар у **221 г. да н. э.** прыняў тытул Цынь Шыхуандзі, стаўшы першым імператарам ***дына́стыі*** Цынь. Па ўсёй краіне былі выдадзены адзіныя законы, уведзена агульная манета. Нават пісьменнасць была зменена такім чынам, каб яе разумелі ва ўсіх канцах Кітая.

Каб спыніць набегі качэўнікаў, уздоўж паўночнай граніцы краіны Цынь Шыхуандзі загадаў пабудаваць вялікую сцяну, якая ўвайшла ў гісторыю пад назвай ***Вялікай Кітайскай сцяны***. Адначасова паблізу ад сваёй сталіцы ён пабудаваў для сябе ўнутры цэлай гары вялікую падземную грабніцу. Адразу пасля смерці Цынь Шыхуандзі ў Кітаі пачаліся народныя паўстанні, якія знішчылі дынастыю Цынь.

**4. Дынастыя Хань.** У **II стагоддзі да н. э.** улада перайшла да новай дынастыі ***Хань***. Адзіная кітайская дзяржава квітнела. Граніцы дзяржавы пашыраліся. Гэта прывяло Кітай да цяжкіх і ўпартых войнаў з суседзямі.

У перыяд дынастыі Хань кітайцы ўпершыню сутыкнуліся з іншымі развітымі цывілізацыямі старажытнасці. Пераадолеўшы горы і пустыні, кітайскія купцы даведаліся аб існаванні гарадоў і дзяржаў у Сярэдняй Азіі. Яны прывезлі адтуль многія сельскагаспадарчыя культуры, напрыклад персікі і дыні. А жыхарам Сярэдняй Азіі вельмі падабаліся выдатныя кітайскія тавары, і ў першую чаргу тканіны з шоўку. Вялікім попытам карысталіся кітайскія вырабы з бронзы, пакрытыя лакам прадметы раскошы і папера. Кітайскія тавары былі запатрабаванымі ў многіх краінах. Так узнік



Выраб з бронзы. *Прадмет кітайскага гандлю*



Правообладатель Народная асвета

*Вялікі шаўковы шлях*, які праз вялікія прасторы Азіі працягнуўся да Еўропы.

*У перыяд праўлення дынастыі Цынь Кітай быў аб'яднаны пад уладай аднаго правіцеля. А ў перыяд праўлення дынастыі Хань Старажытны Кітай дасягнуў вяршыні сваёй магутнасці.*

1. Дзе размешчаны Кітай? Апішыце рост Кітайскай дзяржавы на працягу другога тысячагоддзя да н. э. — III стагоддзя н. э., карыстаючыся картай на с. 99 вучэбнага дапаможніка.
2. Чаму першыя земляробы на тэрыторыі Кітая сяліліся ў даліне Хуанхэ? З якімі цяжкасцямі яны тут сустрэліся?
3. Чым у гісторыю Кітая ўвайшло праўленне дынастыі Цынь і дынастыі Хань?
4. На стужцы часу абазначце гады стварэння адзінай дзяржавы ў Кітаі, у Індыі і ў Старажытным Егіпце. Вызначце, якая з іх з'явілася раней. Наколькі раней?

## Для дапытлівых

### Старажытнакітайскі гісторык аб грабніцы Цынь Шыхуандзі

Спачатку прарылі гару. У сярэдзіну змясцілі мадэлі царскіх палацаў, каштоўныя рэчы і ўпрыгожанні. У грабніцу змясцілі і 6000 гліняных фігур — узброеных воінаў, якія павінны былі ахоўваць свайго ўладара. Былі ўстаноўлены лукі-самастрэлы, каб забіваць магчымых рабаўнікоў. Будаўнікоў грабніцы замуравалі ў ёй. Потым магільны склеп засыпалі зямлёй. Гару замаскіравалі пасеянай травой.

**Пытанні да дакумента.** Які вывад можна зрабіць на аснове апісання грабніцы?



Гліняны салдат з грабніцы Цынь Шыхуандзі



Правообладатель Народная асвета



Вялікая Кітайская сцяна. *Сучасны выгляд*

**Будаўніцтва Вялікай Кітайскай сцяны**

Для яе ўзвядзення зганялі сотні тысяч сялян, рабоў, воінаў і асуджаных. Умовы працы былі вельмі цяжкімі, ежы для будаўнікоў не хапала, і яны часта паміралі ад голаду. Кітайскі гісторык пісаў: «Скопвалі горы, засыпалі цясніны, пракладвалі прамую дарогу. Як танна цанілі працу і жыццё простага народа!» Так была пабудавана Вялікая Кітайская сцяна працягласцю 4000 км.

**Пытанні да дакумента.** Каго кітайскі гісторык лічыў сапраўдным творцом Вялікай Кітайскай сцяны?

## § 27. Грамадства і культура Старажытнага Кітая

**Успомніце.** Што ўяўляла сабой грамадства Старажытнай Індыі?

**1. Грамадства Старажытнага Кітая.** На чале аб'яднанай кітайскай дзяржавы стаяў ***імператар***. Яго ўлада была неабмежаванай. Лічылася, што ён мае боскае паходжанне і з'яў-



Правообладатель Народная асвета

ляецца «Сынам Неба». «Неба» для кітайцаў было галоўным бажаством. Таму сваю дзяржаву кітайцы называлі Паднябеснай імперыяй.

Кітайскае грамадства было раздзелена на *рангі*, або *чыны*. Людзі, якія належалі пэўнаму рангу, мелі дакладна вызначаныя правы і абавязкі. Ранг перадаваўся ў спадчыну. Яго можна было павысіць за заслугі перад дзяржавай і за грашовую плату.




Устройства грамадства: «піраміда» ўлады
ў Старажытным Кітаі

Кітайскія сяляне жылі родавымі абшчынамі, якія складаліся з вялікіх сем'яў. Абшчына атрымлівала ад дзяржавы зямлю, якую яна апрацоўвала. За гэта частку ўраджаю земляробы аддавалі дзяржаве.

Жыццё свабоднага кітайскага земляроба было цяжкім. Але становішча рабоў — яшчэ горшае. Многія земляробы траплялі ў рабства. Для гэтага дастаткова было не аддаць доўг, не заплаціць падатак. Голад даводзіў да таго, што бацькі прадавалі ў рабства сваіх дзяцей, каб пракарміць сям'ю. Дзяржава ператварала ў рабоў не толькі асуджаных, але і іх сем'і. Раба можна было пазнаць па кляйму на твары і стрыжанай галаве.



Правообладатель Народная асвета



Канфуцый

**2. Канфуцый.** Адным з найбольш вядомых старажытнакітайскіх мысліцеляў з'яўляецца ***Канфуцый*** **(551—479 гады да н. э.)**. Ён адкрыў спецыяльную школу, дзе моладзь набывала веды і вучылася добрым паводзінам.

Ідэі Канфуцыя леглі ў аснову жыцця кітайскага грамадства. Яго вучэнне — ***канфуцыянства*** — патрабавала, каб людзі пакланяліся багам, прытрымліваліся старых звычаяў, паважалі продкаў і старэйшых. Кожная кітайская сям'я мела прысвечаны продкам храм. Павага да продкаў стала асновай жыцця кітайскага грамадства.

Дзяржава, па меркаванні Канфуцыя, павінна будавацца як вялікая сям'я. Як слова бацькі — закон для ўсёй сям'і, так і загад імператара — закон для ўсёй краіны. Хутка канфуцыянства стала дзяржаўнай рэлігіяй.

**3. Пісьменнасць і літаратура.** Кітайцы стварылі сваю пісьменнасць, якая выкарыстоўвае іерогліфы. Першыя запісы вядомы нам у сярэдзіне другога тысячагоддзя да н. э. Кожны знак на пісьме абазначае цэлае слова. Гэта вельмі складаная сістэма пісьма. Для таго каб яе асвоіць, трэба было вучыцца шмат гадоў.

Таму кітайцы цанілі людзей, якія былі пісьменнымі і маглі прыгожа пісаць іерогліфы. Узнікла цэлае мастацтва *каліграфіі* — напісанне іерогліфаў тушшу з дапамогай пэндзліка. Самыя старажытныя надпісы былі зроблены на касцях жывёл. Потым пачалі пісаць на дошчачках з бамбуку. Але такія кнігі былі вельмі цяжкімі. Вопытным каліграфістам дазвалялі пісаць на дарагім шоўку. У I стагоддзі да н. э. кітайцы вынайшлі танную і лёгкую паперу, якую выраблялі з драўніны і ануч.



Народная асвета
Правообладатель Народная асвета

У Кітаі вельмі любілі паэзію. Да нас дайшло шмат паэтычных зборнікаў. Звычайна вершы чыталіся пад музыку. З тых далёкіх часоў захаваўся выраз: «Словы могуць абмануць, людзі могуць прыкідвацца, толькі музыка не можа ілгаць».



Старажытнакітайскія іерогліфы

**4. Навуковыя веды.** Самымі патрэбнымі ў паўсядзённым жыцці былі матэматыка і астраномія. Кітайскія вучоныя даволі дакладна вылічылі час сонечнага года — 365,25 дня. Яны ведалі 783 зоркі. Астранамічныя веды выкарыстоўваліся ў сельскай гаспадарцы.

Старажытнае паходжанне мае кітайская медыцына. Вядомае зараз ва ўсім свеце іголкаўколванне адкрылі кітайцы. У аснову гэтага метаду лягло вучэнне аб тым, што розныя кропкі на целе чалавека звязаны з унутранымі органамі. Уздзейнічаючы на такую кропку іголкай, можна лячыць і самі ўнутраныя органы.

Веды кітайскіх купцоў, якія пабывалі ў многіх краінах, з'явіліся асновай першых геаграфічных сачыненняў. Для працяглых падарожжаў па марах і пустынях кітайцы вынайшлі *компас*. У горных раёнах часта адбываліся землетрасенні. Каб хутчэй даведацца аб іх, у Старажытным Кітаі быў вынайдзены прыбор для вызначэння ваганняў зямной паверхні.

*Такім чынам, адкрыцці і вынаходніцтвы старажытнакітайскай цывілізацыі ўнеслі вялікі ўклад у сусветную скарбонку ўсяго чалавецтва.*

?

1. Апішыце грамадства Старажытнага Кітая, выкарыстайце пры гэтым словы і выразы: імператар, «Сын Неба», рангі, рабства.
2. Чаму вучыў вялікі кітайскі мудрэц Канфуцый? За што яго шануюць кітайцы?



Правообладатель Народная асвета

3. Чаму ў Кітаі так цанілася мастацтва каліграфіі?
4. Аб чым сведчыць выказванне: «Словы могуць абмануць, людзі могуць прыкідвацца, толькі музыка не можа ілгаць»? Як вы разумееце сэнс гэтага выразу? Ці згодны вы з ім?
5. Закончыце запаўненне табліцы «Развіццё культуры ў краінах Старажытнага Усходу».

# Глава 4. СТАРАЖЫТНАЯ АМЕРЫКА

## § 28. Найстаражытнае насельніцтва Амерыкі

**Успомніце.** Які спосаб жыцця вялі людзі да ўзнікнення цывілізацыі?

**1. З'яўленне чалавека ў Амерыцы.** Амерыку з усіх бакоў амываюць воды сусветнага акіяна, але перабраўся чалавек на гэты кантынент з Азіі пяшком. Гэта адбылося дзякуючы рэгулярным хістанням узроўню мора ў раёне *Берынгава праліва*. Шырыня гэтага праліва, які раздзяляе Азію і Амерыку, складае ўсяго некалькі дзясяткаў кіламетраў.

Каля 45 тысяч гадоў назад, пасля чарговага паніжэння ўзроўню мора, паміж Азіяй і Амерыкай узнікла паласа сушы. Па гэтаму




Карта Старажытнай Амерыкі



Правообладатель Народная асвета

часоваму «масту» ў Старажытную Амерыку прайшлі сталкі жывёл. Услед за імі 12—14 тысяч гадоў назад — першыя перасяленцы з Паўночна-Усходняй Азіі.

**2. Найстаражытнае насельніцтва Амерыкі.** Перасяленцы павольна, але ўпэўнена асвойвалі новыя тэрыторыі. У Паўночнай Амерыцы палявалі галоўным чынам на буйных звяроў — мамантаў, бізонаў, аленяў. Асноўным спосабам палявання быў калектыўны загон звера ў раней падрыхтаваную пастку. Пасля гібелі мамантаў першабытныя людзі ад палявання амаль цалкам перайшлі да збіральніцтва.

Час ад часу перасяленцы або нашчадкі пакідалі ранейшыя паўночныя месцы пражывання і прасоўваліся на поўдзень уздоўж Ціхаакіянскага ўзбярэжжа. Людзі асвойвалі і замацоўвалі за сабой найбольш зручныя тэрыторыі.




Устройства грамадства: «піраміда» ўлады
ў Старажытнай Амерыцы

На працягу тысячагоддзяў старажытнае насельніцтва Амерыкі вяло прымітыўную гаспадарку. Людзі былі паляўнічымі, рыбаловамі, збіральнікамі. Паляўнічая зброя традыцыйна рабілася з дрэва, каменю, косці: коп'і, дроцікі, лук са стрэламі, сіло і пасткі.

На змену першабытнаму калектыву прыйшла родавая і племянная арганізацыя грамадства. На чале племені стаяў правадыр. Як



Правообладатель Народная асвета

правіла, ім станавіўся выдатны воін, які кіраваў у паходах. З цягам часу ўлада правадыра стала перадавацца ў спадчыну.

З ростам плямён і племянных аб'яднанняў павялічвалася колькасць моў. Адны мовы былі роднаснымі, іншыя — цалкам самастойнымі. Усяго да трэцяга тысячагоддзя да н. э. налічвалася каля 3000 мясцовых моў. Менавіта ў гэты час у Амерыцы сталі фарміравацца першыя цывілізацыі.

**3. Пераход да земляробства.** Узнікненне цывілізацый у Старажытнай Амерыцы, як і ў другіх частках свету, звязана з развіццём земляробства. Земляробчыя ачагі, а гэта значыць і пераход да аселага спосабу жыцця ўзніклі ў двух раёнах — на тэрыторыі сучаснай *Мексікі* (Паўночная Амерыка) і сучаснага *Перу* (Паўднёвая Амерыка).

Высокага ўзроўню развіцця дасягнулі тыя земляробы, якія пражывалі на ўзбярэжжы Мексіканскага заліва. Яны жылі абшчыннымі пасяленнямі ў паўпадземным жыллі. Верылі шаманам і чарадзеям, рабілі ахвярапрынашэнні. Усё гэта гаварыла аб тым, што ў асобных груп земляробаў зараджаліся рэлігійныя ўяўленні. Але дзяржавы яшчэ не было. Яе з'яўленне звязана з узнікненнем цывілізацыі ***альмекаў*** у другім тысячагоддзі да н. э.

*Такім чынам, важнейшай падзеяй у гісторыі народаў Старажытнай Амерыкі, як і ў гісторыі народаў Старажытнага Усходу, быў пераход да аселага ладу жыцця і земляробства.*

1. Калі, як і адкуль, па меркаванні вучоных, з'явіліся людзі ў Амерыцы?
2. Апішыце лад жыцця і асноўныя заняткі старажытнага насельніцтва Амерыкі.
3. Якімі калектывамі жылі тут людзі?
4. Пакажыце на карце старажытныя раёны земляробства ў Паўночнай і Паўднёвай Амерыцы. Які з іх лічыцца найбольш развітым?
5. Што сведчыць аб зараджэнні рэлігійных уяўленняў у жыхароў Амерыкі ў старажытнасці?

6*. Вызначце важнейшую падзею ў жыцці старажытнейшага насельніцтва кантынентаў Паўночная Амерыка і Паўднёвая Амерыка. Сваё меркаванне абгрунтуйце.



Правообладатель Народная асвета

# § 29. Цывілізацыя альмекаў

**Успомніце.** Якімі прыметамі характарызуецца цывілізацыя ў адрозненне ад першабытнага грамадства?

**1. Альмекі — стваральнікі старажытнейшай культуры.** Альмекі з'явіліся на ўзбярэжжы Мексіканскага заліва ў трэцім тысячагоддзі да н. э. Нам невядома, адкуль яны прыйшлі. Таксама невядома, куды на пачатку нашай эры яны нечакана зніклі. У другім тысячагоддзі да н. э. альмекі стварылі ўласную цывілізацыю. Яны пакінулі багатую культурную спадчыну, якая захоўвае ў сабе нямала таямніц і загадак. Альмекі пражывалі ў сельскагаспадарчых паселішчах на паўвостраве Юкатан. Збіралі вялікія ўраджаі *маісу* (кукурузы). Свой рацыён дапаўнялі рыбай, малюскамі і мясам дзікіх звяроў. Альмекі былі ўжо не толькі земляробамі і рыбакамі, але і спрактыкаванымі рамеснікамі і гандлярамі.

З цягам часу ўзніклі храмавыя комплексы, вакол іх — гарадскія цэнтры. Буйнейшы горад альмекаў — ***Ла-Вента*** (сучасная назва па месцы правядзення археалагічных раскопак). Яго ўзвышэнне і росквіт адбываецца ў 800—500 гадах да н. э. Гэты горад найбольш ярка ілюструе дасягненні альмекскай культуры.

**2. Ла-Вента — горад альмекаў.** Ла-Вента займала даволі вялікую плошчу. Галоўным збудаваннем горада з'яўлялася вялікая ўсечаная піраміда 30-метровай вышыні, зробленая з утрамбаванай зямлі. Піраміда выкарыстоўвалася ў рэлігійных мэтах. Каля яе падножжа стаялі манументальныя помнікі — стэлы і каменныя фігуры, а вакол — дамы знаці з трысняговымі дахамі і адкрытымі сценамі



Каменная галава



Правообладатель Народная асвета

для прахалоды. Правіцелі Ла-Венты мелі неабмежаваную ўладу над рамеснікамі, гандлярамі і земляробамі.

Важнай часткай гарадскога ансамбля з'яўляліся гіганцкія галовы. Гэта былі каменныя маналіты вышэй чалавечага росту, якія мелі выяву галавы. Падобныя галовы знойдзены і ў другіх гарадскіх цэнтрах. Магчыма, яны перадавалі вобразы родавых правадыроў таго ці іншага племені. А магчыма, і тое, што галовы-маналіты падкрэслівалі ўладу правіцеляў над навакольным светам. Як бы там ні было, сэнс і прызначэнне гэтых помнікаў да гэтага часу застаюцца загадкай альмекскай цывілізацыі.

**3. Рэлігійныя ўяўленні і культура.** Альмекі верылі ў існаванне замагільнага жыцця. Яны рабілі выявы сваіх багоў у выглядзе напаўлюдзей-напаўжывёл, так жа як гэта было ў Старажытным Егіпце або ў Старажытнай Індыі. У розны час абагаўляліся розныя жывёлы. Але перавагу аддавалі ягуару — вельмі хуткаму і небяспечнаму драпежніку. Ён паказваўся страшным і магутным, з апярэннем над брывамі і раздвоеным языком змяі.



Свяцілішча ў Ла-Венце



Правообладатель Народная асвета

Альмекі стварылі свой месячны каляндар. У канцы першага тысячагоддзя да н. э. яны перайшлі ад месячнага календара да сонечнага. Да гэтага ж часу адносяцца першыя ўзоры альмекскай пісьменнасці, якія дайшлі да нас. Альмекі пакінулі аб сабе памяць як выдатныя рэзчыкі па камені. Любімым вобразам іх мастацтва была фігура плачучага дзіцяці з рысамі ягуара.

*Альмекская культура знікла, каб уступіць месца іншым цывілізацыям. Але яна аказала вялікі ўплыў на другія народы Амерыкі. Прамым нашчадкам гэтай культуры стала цывілізацыя майя.*

1. Калі ўзнікла самая старажытная цывілізацыя ў Амерыцы?
2. У якіх паселішчах жылі і чым займаліся альмекі? Як вы зразумелі, што такое храмавы комплекс?
3. Назавіце буйнейшы горад альмекаў. Калі і ў сувязі з чым ён перажываў росквіт?
4. Апішыце словамі культурныя дасягненні альмекскай цывілізацыі.
5. Падумайце, чым падобны рэлігійныя ўяўленні альмекаў, старажытных егіпцян і старажытных індыйцаў.

6*. Выкажыце меркаванне, якім чынам магла знікнуць альмекская культура.

### Абагульненне да раздзела «Старажытны Усход і Амерыка»

Вы перагарнулі апошнюю старонку раздзела. Задумайцеся яшчэ раз аб паходжанні назвы Старажытны Усход. Яе далі людзі, якія жылі ў Заходняй Еўропе, і таму нядзіўна, што для іх Егіпет, краіны Пярэдняй Азіі, Індыя і Кітай сапраўды ўсходнія.

У 4-м класе вы пазнаёміліся з гісторыяй Беларусі ў курсе «Мая Радзіма — Беларусь» і таму зараз, вядома ж, паспелі заўважыць, што гісторыя краін Старажытнага Усходу зусім не падобна на нашу, айчынную. Перш за ўсё, гісторыя старажытнаўсходніх дзяржаў ахоплівае вялікую эпоху і тэрыторыю. Звесткі аб розных краінах адрывачныя і непаслядоўныя. Але такая доля цывілізацый, якія існавалі многія тысячагоддзі таму назад. Нягледзячы на час, які нас раз-



Правообладатель Народная асвета

дзяляе, культурная спадчына старажытнаўсходніх народаў у асноўным захавалася.

Напрыклад, Старажытны Егіпет. Іерогліфы былі не толькі забыты, але і зноў «адкрыты» еўрапейскімі вучонымі ў пазамінулым стагоддзі. Егіпецкія рамеснікі, жрацы-вучоныя, земляробы перадалі свае дасягненні суседнім народам, і мы зараз карыстаемся многімі з іх. Так, мы дзелім год на 365 дзён, не задумваючыся, што першымі гэта зрабілі старажытныя егіпцяне. Яны ж вынайшлі арыфметыку дробаў і геаметрыю многавугольнікаў, адкрылі планеты на зорным небе, сталі прадказваць сонечныя і месячныя зацьменні. Нават такія імёны, як Сусанна («Лотас»), Таісія («зямля багіні Ісіды»), Ануфрый («добры, прыгожы»), Сідар («дар Ізіды»), — старажытнаегіпецкія.

Дайшоў да нас такі шчодры дар праз грэкаў, яўрэяў, рымлян, візантыйцаў, арабаў.

Народы Пярэдняй Азіі вынайшлі алфавіт, які хутка распаўсюдзіўся па ўсім Бліжнім Усходзе. Продкам сучаснага грэчаскага, лацінскага, рускага, яўрэйскага, арабскага алфавітаў з’яўляецца фінікійскі. Дзякуючы гэтаму вынаходніцтву колькасць пісьменных людзей стала хутка павялічвацца, з’явіліся першыя бібліятэкі.

Індыйцы падаравалі свету лічбы, якія прыйшлі да нас праз арабаў, таму мы і называем свае лічбы арабскімі. У далінах Інда і Ганга ўпершыню сталі вырошчваць бавоўнік і ткаць з яго тканіну, а з цукровага трыснягу вырабляць цукар. Шахматы таксама прыдумалі ў Старажытнай Індыі.

Кітайцам мы абавязаны вынаходніцтвам компаса, вытворчасцю тонкіх шаўковых тканін. І нават чай — старажытны кітайскі напітак.

У далінах вялікіх паўднёвых рэк хутка развівалася земляробства, і хутчэй за ўсё першы хлеб быў спечаны чалавекам менавіта тут. Легендарная зямля Азіі, Паўночна-Усходняй Афрыкі і Амерыкі да гэтага часу захоўвае астаткі першых гарадоў на нашай планеце. Без



Правообладатель Народная асвета

сумнення, спіс вынаходніцтваў і адкрыццяў народаў Старажытнага Усходу і Амерыкі можна яшчэ доўга працягваць. Іх уклад у сусветную культуру вялікі.

1. Складзіце апісанне вывучаных вамі дзяржаў і цывілізацый. Для гэтага трэба выбраць пяць асноўных, ключавых слоў (гэта могуць быць імёны, назвы месцаў або славутасці), якія б поўна і дакладна характарызавалі гэтыя дзяржавы і культуры.
2. Праверце дакладнасць свайго выбару: прапануйце бацькам, сябрам, аднакласнікам, знаёмым угадаць па пяці словах, аб якой краіне або культуры ідзе размова.

| | |
|---|---|
| Старажытны Егіпет | |
| Асірыя і Вавілонія | |
| Хецкае царства | |
| Старажытны Іран | |
| Фінікія і Палесціна | |
| Індыя | |
| Кітай | |
| Старажытная Амерыка | |

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

# ПАМЯТКА

## *Дарагія школьнікі!*

На ўроках і дома па вучэбным дапаможніку вы вучыце новы матэрыял. У ім ёсць думкі галоўныя і другарадныя. Запомніць трэба толькі галоўныя. Іх неабходна выдзяляць у тэксце. Авалодаць гэтымі ўменнямі дапаможа памятка.

### І. Вучыцеся выдзяляць галоўнае

1. Уважліва прачытайце ўвесь тэкст. Падумайце, аб чым (або аб кім) у ім гаворыцца і што менавіта гаворыцца.
2. Раздзяліце тэкст на закончаныя часткі. У кожнай частцы знайдзіце самыя важныя словы (назавём іх ключавымі).
3. З дапамогай ключавых слоў сфармулюйце галоўныя думкі. Складзіце план або прыдумайце загалоўкі.
4. Галоўныя думкі паўтарыце ўслых.

### ІІ. Вучыцеся расказваць

1. Падумайце, аб чым будзеце гаварыць і з якой мэтай, г. зн. дакладна вызначце тэму расказу.
2. Ад першага сказа многае залежыць: ён павінен вызначаць наступныя.
3. Выдзеліце самае галоўнае ў вашым паведамленні і раскажыце аб ім падрабязна, паслядоўна, зразумела. Не захапляйцеся малазначнымі падрабязнасцямі — будзе нецікава.
4. Рабіце па ходзе паведамлення вывады. Дапамагайце слухачам зразумець усе вашы задумы.
5. Уводзьце простую мову герояў расказу, ад гэтага ён стане ярчэйшым, жывейшым, даступнейшым. Нязначныя рэплікі не прыводзьце зусім.
6. Заканчваючы, пастарайцеся дапамагчы слухачам зразумець вашу асноўную думку. Загадзя абдумайце заключны сказ, ён павінен падвесці вынік сказанаму.



Правообладатель Народная асвета

### III. Вучыцеся працаваць з гістарычнай картай

1. Пазнаёмцеся з тэмай і зместам карты, вывучыце яе сімволіку (легенду).

2. Пры «чытанні» карты выкарыстайце ілюстрацыі да тэксту вучэбнага дапаможніка.

3. Часцей звяртайцеся да карты пры падрыхтоўцы дамашняга задання.

4. Паказваючы на карце дзяржавы або іншыя аб'екты, ужывайце словы «на поўначы», «на поўдні», «на ўсходзе», «на захадзе» і г. д.

## СЛОЎНІК ГІСТАРЫЧНЫХ ТЭРМІНАЎ І ПАНЯЦЦЯЎ

**Абшчы́на ро́давая** — аб'яднанне людзей у эпоху першабытнасці. Члены абшчыны былі кроўнымі сваякамі і верылі ў агульнага продка. Жыццём абшчыны кіраваў старэйшына або правадыр. Яго выбіралі самыя вопытныя члены роду. Усе члены родавай абшчыны працавалі супольна і атрымлівалі частку агульнай здабычы.

**Абшчы́на сусе́дская** — аб'ядноўвала не толькі сваякоў, але і людзей, не звязаных кроўнымі сувязямі. Такія абшчыны ўзніклі ў перыяд пераходу людзей да аселага ладу жыцця. Чалавек ужо мог пракарміць сваю сям'ю сам. Яго залежнасць ад абшчыны стала значна меншай. Сем'і жылі асобна, але не ізалявана, станавіліся суседзямі. Многае рабілася супольна, паколькі так было лягчэй выжыць.

**Антрапало́гія** — гістарычная навука, якая вывучае развіццё фізічнага аблічча чалавека з часоў яго ўзнікнення да нашых дзён.

**Араша́емае земляро́бства** — апрацоўка зямлі з дапамогай арашэння ў краінах з гарачым кліматам. Арашэнне з'яўляецца неаб-



Правообладатель Народная асвета

ходнай умовай для вырошчвання бавоўніку, рысу і іншых сельскагаспадарчых раслін.

**Археало́гія** — навука, якая вывучае гістарычнае мінулае чалавецтва па рэчавых помніках. Тэрмін «археалогія» (навука аб старажытнасцях) упершыню ўжыў старажытнагрэчаскі філосаф Платон. Вялікая частка гісторыі чалавецтва вывучаецца па дадзеных археалагічных раскопак.

**Буды́зм** — адна з трох сусветных рэлігій. Узнік у Старажытнай Індыі ў VI—V стагоддзях да н. э. Паводле паданняў, яе заснавальнік — царэвіч Гаўтама (Буда). Адсюль назва рэлігіі — будызм. Царэвіч Гаўтама цяжка перажываў пакуты простых людзей. Ва ўзросце 29 гадоў ён пакінуў свой дом, сям'ю і маёмасць і накіраваўся ў дарогу на пошукі ісціны. Калі яму споўнілася 35 гадоў, ён дасягнуў поўнага ўяўлення аб прычыне чалавечых пакут і аб тым, як ад іх пазбавіцца. Пасля гэтага Гаўтаму сталі называць Будай, або «Разбуджаным». Апошнія гады свайго жыцця Буда падарожнічаў па даліне Ганга і прапаведаваў сваё вучэнне людзям.

**Гарады́-дзяржа́вы** — першыя дзяржаўныя аб'яднанні на Старажытным Усходзе і ў Еўропе. Такія дзяржавы ўключалі горад і прылеглую да яго акругу. На Старажытным Усходзе на чале стаялі спадчынныя манархі. Па-іншаму гарады-дзяржавы былі арганізаваны ў Старажытнай Грэцыі (гл. *Поліс* у 2-й частцы вучэбнага дапаможніка).

**Дзяржа́ва** — сістэма ўлады, якая ажыццяўляе кіраванне грамадствам на пэўнай тэрыторыі, забяспечвае ў ім парадак і стабільнасць. Гэта сістэма ўключае правіцеля, яго саветнікаў, чыноўнікаў, армію, а таксама розныя органы ўлады. Першыя дзяржавы ўзніклі на Старажытным Усходзе.

**Дына́стыя** — правячая сям'я пры манархіі. Улада манарха перадаецца толькі ўнутры сям'і і звычайна ў спадчыну.



Правообладатель Народная асвета

**Жрэц** — у старажытных рэлігіях служыцель бажаства праводзіць богаслужэнні, ахвярапрынашэнні і іншыя абрады. Жрацы паважаліся як пасрэднікі ў зносінах людзей са светам багоў і духаў.

**І́дал** — у перакладзе з грэчаскай мовы гэта слова азначае «выява». Ідалы — гэта, як правіла, невялікія статуэткі, зробленыя з каменю, косці, дрэва, гліны і іншых матэрыялаў. Яны мелі зверападобную або чалавечую форму. Ідалы лічыліся носьбітамі ахоўваючай сілы, таму яны былі прадметам культавага шанавання.

**Іеро́гліфы** — рысуначныя знакі старажытнаегіпецкага пісьма. У перакладзе з грэчаскай мовы гэта слова азначае «свяшчэннае пісьмо». Самі ж егіпцяне называлі іерогліфы «божай мовай». Пісьменства ў егіпцян, як і ў многіх іншых народаў, узнікла з простай выявы знакаў-малюнкаў, або іерогліфаў. Спачатку іерогліфы абазначалі прадметы, затым — асобныя гукі. Кожны іерогліф адпавядаў гучанню адной або некалькіх літар. Іерогліфамі карысталіся таксама кітайскі і некаторыя іншыя народы свету.

**Індуі́зм** — рэлігія ў Індыі. Стваралася паступова на працягу тысячагоддзяў. Паслядоўнікі індуізму пакланяюцца многім багам. Але важнейшыя за ўсіх астатніх тры богі. Іх імёны: Вішну, Брахма і Шыва. Вішну сочыць за парадкам, Брахма — стваральнік усяго існуючага, а Шыва — разбуральнік, кіруе жыццём і смерцю. У індуізме захавалася шмат першабытных вераванняў: пакланенне свяшчэнным жывёлам, з’явам прыроды, культ продкаў і інш.

**Гістары́чныя крыні́цы** — усё, што можа гаварыць нам аб дзейнасці людзей у мінулым, мы называем гістарычнымі крыніцамі. Крыніцы падраздзяляюцца на дзве вялікія групы — пісьмовыя і рэчавыя.

**Гісто́рыя** — гэта слова мае некалькі значэнняў. Адно з іх — расказ аб мінулым, аб тым, што стала вядома. Другое значэнне — гэта самі падзеі, жыццё людзей у блізкім або далёкім мінулым. Нарэшце,



Правообладатель Народная асвета

гісторыя — гэта навука, якая вывучае мінулае чалавецтва на аснове гістарычных крыніц.

**Каме́нны век** — так называецца старажытнейшы перыяд гісторыі чалавецтва. Ён налічвае больш за 2 мільёны гадоў. Прылады працы выраблялiся з каменю, дрэва і косці. Працягласць каменнага веку ў розных частках зямнога шара была неаднолькавай. Некаторыя плямёны да нашых дзён застаюцца на стадыі каменнага веку. На змену каменнаму веку прыйшоў бронзавы, затым жалезны век.

**Клі́напіс** — метад пісьма з дапамогай выдаўлівання на гліне клінавідных рысачак. Упершыню ўзнік у Шумеры ў канцы чацвёртага тысячагоддзя да н. э.

**Культ** — паходзіць ад лацінскага слова «апрацоўваць», «шанаваць». Культ — гэта значыць сукупнасць правіл, абрадаў, шанавання якога-небудзь духа, бога, чалавека або прадмета з мэтай атрымаць ад яго прыхільнасць, благаслаўленне і дапамогу. Да ліку абрадаў адносяцца ахвярапрынашэнні, святкаванні (працэсіі, танцы), малітвы. Культавымі абрадамі кіравалі свяшчэннаслужыцелі — жрацы і іх памочнікі. На Старажытным Усходзе з'явіўся культ правіцеля. Цары і вярхоўныя жрацы прыраўноўваліся да божастваў, багоў або сыноў бога. Іх шанавалі як багоў.

**Мана́рхія** — форма праўлення, пры якой уся вярхоўная ўлада сканцэнтравана ў руках аднаго чалавека — манарха. Манарх — цар, фараон, імператар і інш. — атрымлівае ўладу, як правіла, у спадчыну.

**Міф** — паданні аб стварэнні свету і чалавека, аб дзеяннях старажытных багоў і герояў, якія ўзніклі ў першабытным грамадстве. Міф заўсёды змяшчае спробу растлумачыць невядомыя з'явы навакольнага свету.

**Папі́рус** — шматгадовая балотная расліна тыпу трыснягу. Расла ў старажытнасці па берагах і ў дэльце Ніла, а таксама рэк і азёр Трапічнай Афрыкі. Са сцёблаў трыснягу людзі выраблялі тканіну,



Правообладатель Народная асвета

абутак, плыты, чоўны. Егіпцяне першымі выкарысталі папірус як матэрыял для пісьма. Пісалі чарнілам з дапамогай асобага пэндзліка, выробленага таксама з трыснягу.

**Пада́нне** — вуснае паведамленне аб гістарычных асобах, мясцовасцях і падзеях мінулага. У ім шмат вымыслу, але яно адрозніваецца ад казкі. Паданне блізкае да легенды.

**Піктагра́мы** — рысункавае пісьмо, знакі якога абазначаюць адлюстраваныя імі прадметы.

**Прыла́ды пра́цы** — прыстасаванне або прадмет, пры дапамозе якога чалавек выконвае работу або якое-небудзь дзеянне ў сваіх мэтах.

**Рамястро́** — выраб розных рэчаў ручным спосабам. Для рамяства характэрна прымяненне простых прылад працы. Пры гэтым рашаючае значэнне мае майстэрства рамесніка, яго ўменне і навыкі. Рамеснік працуе сам або з памочнікамі. Нават са з'яўленнем машын, заводаў і фабрык дробная ручная вытворчасць не знікла.

**Рэлі́гія** — у перакладзе з лацінскай мовы гэта слова азначае «набожнасць, святыня, прадмет культу (пакланення)». Вера ў звышнатуральныя сілы і істоты, бога або багоў, духаў, якія з'яўляюцца прадметам пакланення.

**Саве́т стар́эйшын** — сход самых старэйшых і вопытных членаў родавай або суседскай абшчыны. Савет старэйшын быў калектыўным органам кіравання абшчынай. Старэйшыны ведалі звычкі жывёл, уласцівасці раслін, старажытныя паданні і правілы паводзін, кіравалі сельскагаспадарчымі і дамашнімі справамі, ладзілі святы і адпраўлялі культавыя абрады.

**Сатра́п** — правіцель асобнай вобласці (сатрапіі) у Старажытнай Персіі, які назначаўся царом. Сатрап адказваў за збор падаткаў, праводзіў суд, набіраў войска і кантраляваў мясцовых чыноўнікаў сатрапіі, меў права чаканіць манеты.



Правообладатель Народная асвета

**Скульпту́ра** — від выяўленчага мастацтва (ад лацінскага «выразаць», «высякаць»). Скульптурныя мастацкія творы ствараюцца шляхам разьбы, высякання, лепкі або адліўкі з цвёрдых матэрыялаў: металу, каменю, гліны, дрэва, гіпсу і інш.

**Фарао́н** — назва егіпецкіх цароў. Старажытныя егіпцяне лічылі, што царская ўлада ўстаноўлена багамі. Першым валадаром Егіпта быў бог Ра. Ад яго ўзялі пачатак старажытнаегіпецкія цары. Цар лічыўся настолькі свяшчэннай асобай, што звярнуцца да яго прама было немагчыма. Бо па ўяўленнях таго часу вымаўленне свяшчэннага імені магло нанесці яму шкоду. Таму цара называлі іншасказальна «вялікі дом» або проста «палац». Па-егіпецку гэта гучала як «пер-о». У Бібліі — як «фараон». Адсюль і пайшла назва егіпецкіх цароў.

**Храм** — у старажытных народаў «жыллё», «месцазнаходжанне» бога або багоў. У гонар багоў-апекуноў людзі ўзводзілі архітэктурныя збудаванні. Храмы мелі сваю адміністрацыю — жрацоў, а таксама ўчасткі зямлі, якія апрацоўваліся храмавымі рабамі і мясцовымі сялянамі. У храмах захоўваліся культавыя выявы.

**Цывіліза́цыя** — больш высокі ўзровень развіцця ў параўнанні з першабытным перыядам. Цывілізацыя характарызуецца наяўнасцю аселага ладу жыцця, дзяржавы, пісьменнасці, развітай культуры.

**Чыно́ўнік** — асоба, якая служыць, мае чын, службовае званне.

**Э́ра** — слова выкарыстоўваецца ў некалькіх значэннях. Эра — гэта момант, ад якога вядзецца летазлічэнне, а таксама само летазлічэнне. Напрыклад, хрысціянская, або новая эра (наша эра). Лічэнне гадоў тут вядзецца ад агульнапрынятай у хрысціянстве даты нараджэння Ісуса Хрыста. Акрамя таго, эра — вялікі гістарычны перыяд, эпоха.

**Этнагра́фія** — гістарычная навука, якая вывучае побыт, норавы і культуру народаў зямнога шара, іх рассяленне і ўзаемаадносіны.

Правообладатель Народная асвета

# ХРАНАЛАГІЧНАЯ ТАБЛІЦА

## Першабытнае грамадства

| | |
|---|---|
| Больш за 3 млн гадоў назад | З'яўленне чалавекападобнай малпы |
| Больш за 2 млн гадоў назад | Вылучэнне чалавека з жывёльнага свету — «чалавек умелы» і з'яўленне першых каменных прылад працы |
| Каля 1,5 млн гадоў назад | Паходжанне «чалавека прамаходзячага» |
| Каля 300 тыс. гадоў назад | З'яўленне неандэртальца |
| Больш за 40 тыс. гадоў назад | З'яўленне чалавека сучаснага віду — краманьёнца («чалавек разумны») |
| Каля 12 тыс. гадоў назад | Адступленне ледавіка |
| 10 000—8000 гадоў да н. э. | Пераход да земляробства і жывёлагадоўлі |

## Старажытны Егіпет

| | |
|---|---|
| Канец чацвёртага тысячагоддзя да н. э. | Узнікненне дзяржаў у даліне Ніла |
| Каля 3000 года да н. э. | Аб'яднанне Ніжняга і Верхняга Егіпта ў адзіную дзяржаву |
| XV стагоддзе да н. э. | Праўленне Тутмаса III |
| XIV стагоддзе да н. э. | Праўленне Эхнатона |
| 1279—1213 гады да н. э. | Праўленне Рамсеса II |
| Каля 1270 года да н. э. | Заключэнне мірнага дагавору паміж егіпцянамі і хетамі |
| VI стагоддзе да н. э. | Заваяванне Егіпта Персіяй |



Правообладатель Народная асвета

## Старажытная Месапатамія

| | |
|---|---|
| Канец чацвёртага тысячагоддзя да н. э. | Узнікненне першых гарадоў-дзяржаў у даліне Тыгра і Еўфрата |
| Канец чацвёртага тысячагоддзя да н. э. | Узнікненне пісьменнасці ў Міжрэччы |
| XXIV стагоддзе да н. э. | Праўленне акадскага цара Саргона |
| 1792—1750 гады да н. э. | Праўленне вавілонскага цара Хамурапі |
| Пачатак другога тысячагоддзя да н. э. | Узнікненне горада-дзяржавы Ашур |
| VII стагоддзе да н. э. | Росквіт Асірыі |
| 612 год да н. э. | Падзенне Ніневіі |
| Канец VII стагоддзя да н. э. | Праўленне Навуходаносара ў Вавілоне |

## Старажытны Іран

| | |
|---|---|
| Сярэдзіна першага тысячагоддзя да н. э. | Узнікненне племяннога саюза персаў |
| 522—486 гады да н. э. | Праўленне Дарыя Першага |

## Фінікія, Палесціна, Малая Азія

| | |
|---|---|
| Трэцяе тысячагоддзе да н. э. | Узнікненне гарадоў-дзяржаў у Фінікіі |
| XVII стагоддзе да н. э. | Утварэнне Хецкага царства |
| Каля 1200 года да н. э. | Хецкая дзяржава разгромлена плямёнамі, якія жылі на ўзбярэжжы Эгейскага мора |
| Канец XI стагоддзя да н. э. | Утварэнне царства Ізраіль |
| 1005—965 гады да н. э. | Праўленне цара Давіда |
| 965 — 926 гады да н. э. | Праўленне цара Саламона |



Народная асвета
Правообладатель Народная асвета

| | |
|---|---|
| X стагоддзе да н. э. | Раздзяленне Ізраільскага царства на дзве дзяржавы — Іудзейскую і Ізраільскую |
| VI стагоддзе да н. э. | Заваяванне Ізраільскага і Іудзейскага царства вавілонянамі |

## Старажытная Індыя

| | |
|---|---|
| Трэцяе тысячагоддзе — пачатак другога тысячагоддзя да н. э. | Узнікненне на тэрыторыі Індыі адзінай дзяржавы |
| Прыблізна 560—480 гады да н. э. | Традыцыйныя даты жыцця Буды |
| Канец VI стагоддзя да н. э. | З'яўленне будызму |
| 268—232 гады да н. э. | Праўленне Ашокі |

## Старажытны Кітай

| | |
|---|---|
| Другое тысячагоддзе да н. э. | Узнікненне кітайскай дзяржавы |
| 551—479 гады да н. э. | Гады жыцця Канфуцыя |
| 221 год да н. э. | Утварэнне Цынскай імперыі на чале з Цынь Шыхуандзі |
| 221—206 гады да н. э. | Першая старажытная імперыя Кітая — Цынь |
| III стагоддзе да н. э. | Будаўніцтва Вялікай Кітайскай сцяны |
| II стагоддзе да н. э. | Утварэнне дзяржавы дынастыі Хань |

## Старажытная Амерыка

| | |
|---|---|
| Другое тысячагоддзе да н. э. | Узнікненне цывілізацыі альмекаў |

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

# ШТО ЧЫТАЦЬ

*Ад першабытнасці да цывілізацыі*

Дрешер В. Б. Человекообразные обезьяны. М., 1997.

Лондон Дж. До Адама: повесть. Любое издание.

Покровский С. В. Охотники на мамонтов. Поселок на озере. Пермь, 1990.

Рони Старший Ж. Борьба за огонь: повесть. Любое издание.

Рони Старший Ж. Пещерный лев: повесть. Любое издание.

Рони Старший Ж. Вамирэх: повесть. Любое издание.

Уэллс Г. Это было в каменном веке: повесть. Любое издание.

Д'Эрвильи. Приключения доисторического мальчика: повесть. Любое издание.

*Старажытны Усход*

Воронкова Л. След огненной жизни. М., 1969.

Горбовский А. Загадки древнейшей истории. М., 1971.

Гулиа Г. Фараон Эхнатон: роман. Любое издание.

Двуречье. Боги и герои. Тверь, 1996.

Детская Библия. Любое издание.

Ефремов И. Е. На краю Ойкумены. Любое издание.

Керам К. В. Боги, гробницы, ученые. СПб, 2001.

Матье М. День египетского мальчика: историческая повесть. М., 1975.

Пандей Р. Б. Древнеиндийские домашние обряды (обычаи). М., 1990.

Редер Д. Г. Мифы и легенды Древнего Двуречья. Любое издание.

Темкин Э. Н., Эрман В. Г. Мифы древней Индии. М., 1985.

Флобер Г. Саламбо: роман. Любое издание.

Чизхолм Дж., Миллард Э. Ранние цивилизации. М., 1994. (Иллюстрированная мировая история.)



Правообладатель Народная асвета

Народная асвета

# ЗМЕСТ


АД АЎТАРАЎ . . . 3
Уводзіны . . . 4
§ 1. Свет старажытнай гісторыі . . . —
§ 2. Лічэнне гадоў у гісторыі . . . 7

АД ПЕРШАБЫТНАСЦІ ДА ЦЫВІЛІЗАЦЫІ . . . 10

§ 3. Старажытныя людзі . . . —
§ 4. Людзі каменнага веку . . . 13
§ 5. Першыя крокі чалавека сучаснага віду . . . 17
§ 6. Узнікненне мастацтва і рэлігіі . . . 21
§ 7. З'яўленне земляробства і жывёлагадоўлі . . . 24
§ 8. Пераход ад родавай абшчыны да суседскай . . . 27
Абагульненне да раздзела «Ад першабытнасці да цывілізацыі» . . . 30

СТАРАЖЫТНЫ УСХОД І АМЕРЫКА . . . 33

Глава 1. **Старажытны Егіпет** . . . —
§ 9. Прырода і насельніцтва Старажытнага Егіпта . . . —
§ 10. Дзяржава фараонаў . . . 38
§ 11. Ператварэнне Старажытнага Егіпта ў магутную дзяржаву 42
§ 12. Побыт і паўсядзённае жыццё старажытных егіпцян . . . 45
§ 13. Рэлігія старажытных егіпцян . . . 48
§ 14. Культура старажытных егіпцян . . . 52
Абагульненне да главы «Старажытны Егіпет» . . . 58

Глава 2. **Пярэдняя Азія ў старажытнасці** . . . 59
§ 15. Паміж Тыграм і Еўфратам . . . —
§ 16. Станаўленне дзяржавы ў Месапатаміі . . . 63
§ 17. Дзяржава Хамурапі . . . 66
§ 18. Асірыя і Вавілонія . . . 70
§ 19. Культура і рэлігія народаў Міжрэчча . . . 73
§ 20. Хецкая дзяржава . . . 77
§ 21. Старажытны Іран . . . 80
§ 22. Фінікія . . . 83
§ 23. Старажытная Палесціна . . . 86
Абагульненне да главы «Пярэдняя Азія ў старажытнасці» . . . 89




Правообладатель Народная асвета

Глава 3. **Індыя і Кітай у старажытнасці** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 90
§ 24. Старажытная Індыя . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . —
§ 25. Культура Старажытнай Індыі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 94
§ 26. Узнікненне дзяржавы ў Кітаі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 97
§ 27. Грамадства і культура Старажытнага Кітая . . . . . . . . . . . . 102
Глава 4. **Старажытная Амерыка** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 106
§ 28. Найстаражытнае насельніцтва Амерыкі . . . . . . . . . . . . . . —
§ 29. Цывілізацыя альмекаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 109
Абагульненне да раздзела «Старажытны Усход і Амерыка» . . . . . . . 111
Памятка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 114
Слоўнік гістарычных тэрмінаў і паняццяў . . . . . . . . . . . . . . . . . 115
Храналагічная табліца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 121
Што чытаць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 124

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

Вучэбнае выданне

**Кошалеў** Уладзімір Сяргеевіч
**Перзашкевіч** Алег Валер'евіч
**Прохараў** Андрэй Аркадзьевіч
**Байдакова** Наталля Васільеўна

**ГІСТОРЫЯ СТАРАЖЫТНАГА СВЕТУ**

Вучэбны дапаможнік для 5 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

У 2 частках

Частка 1

2-е выданне, перапрацаванае

Заг. рэдакцыі *В. Г. Бехціна*. Рэдактар *А. М. Парахневіч*. Мастацкі рэдактар *А. А. Валатовіч*. Тэхнічнае рэдагаванне і камп'ютарная вёрстка *Л. І. Шаўко*. Карэктары *А. П. Тхір, В. С. Бабеня, Г. В. Алешка*.

Падпісана ў друк 16.05.2014. Фармат $70 \times 90^1/_{16}$. Папера афсетная. Гарнітура літаратурная. Афсетны друк. Умоўн. друк. арк. 9,36. Ул.-выд. арк. 6,0. Тыраж 19 000 экз. Заказ .

Выдавецкае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Народная асвета» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/2 ад 08.07.2013. Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск.

ОАО «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 04.10.2013. Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, Мінск.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

(Назва і нумар установы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча навучэнца | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака навучэнцу за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета